ПРАВАСЛАЎЕ

Ў БЕЛАРУСІ І Ў СЬВЕЦЕ



94·1



ПРАВАСЛАЎЕ

Ў БЕЛАРУСІ І Ў СЬВЕЦЕ

Выданьне:
Беларускага Праваслаўнага Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў
Кірыла-Мяфодзіеўскага Праваслаўнага Брацтва (Польшча)
Прадстаўнікоў Беларускіх Праваслаўных Цэркваў замежжа
Ортдрук Беласток (Польшча)

Галоўны рэдактар: протаіерэй ГЕОРГІЙ ЛАТУШКА

Рэдакцыйная калегія:
Епіскап КАНСТАНЦІН (ГАРАНАЎ)
АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА (Беларусь)
УЛАДЗІМІР ВАСІЛЕВІЧ (Беларусь)
МІКОЛА ГАЙДУК (Польшча)
МІКОЛА ГАНЬКО (Канада)
прот. СЕРГІЙ ГАРДУН (Беларусь)
ВАЛЯНЦІН ГОЛУБЕЎ (Беларусь)
Адказны сакратар: ЛЕАНІД КАЧАНКА (Беларусь)
АНАТОЛЬ КЛЫШКА (Беларусь)
Мастацкі рэдактар: АНТАНІНА ЛАПІЦКАЯ (Беларусь)
Намесьнік галоўнага рэдактара: МІКАЛАЙ МАТРУНЧЫК (Беларусь)
Сакратар рэдакцыі: ТАЦЦЯНА МАТРУНЧЫК (Беларусь)
КАСТУСЬ МЕРЛЯК (ЗША)
АНТОСЬ МІРАНОВІЧ (Польшча)
ВАЛЯНЦІНА ТРЫГУБОВІЧ (Беларусь)
ВАСІЛЬ ШЧЭЦЬКА (ЗША)
ЯЎГЕН ЧЫКВІН (Польшча)
АЛЕНА ЯСКЕВІЧ (Беларусь)

ЗЬМЕСТ

№ 1 (2) · 1994

БАГАСЛОЎЕ

Значэньне Праваслаўя
ў жыцьці сучаснага чалавека. Архіеп. Сава. 5

Лекцыі з дагматычнага багаслоўя. Еп. Канстанцін. 12

ТЫСЯЧАГОДЗЬДЗЕ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ НА БЕЛАРУСІ

Гісторыя Менскай духоўнай семінарыі і сучасны стан праваслаўнай
духоўнай школы на Беларусі. Ігумен Нікан. 17

Царкоўны прыход як носьбіт і захавальнік
праваслаўнай традыцыі. Прот. Георгій Латушка. 28

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Развагі протапрасьвітара Віталія Баравога 30

АРХІВЫ І ДАКУМЕНТЫ

Старонкі жыцьця мітрапаліта Мелхісэдэка. Т.Процька. 34

У ПАМЕСНЫХ ЦЭРКВАХ

Зварот архіерэйскага Сабора Сербскай Праваслаўнай Царквы
да сербскага народа і міжнароднай грамадскасьці.
Пер. І.Чароты. 44

ПЕРАКЛАДЫ

Акафіст сьвятым мучанікам Віленскім Антонію, Іаану і Яўстафію.
Пер. А.Клышкі. 48

Істапомныя сказаньні пра падзьвіжніцтва сьвятых
і блажэнных айцоў. Пер. А.Анціпенкі. 60

ДУХОЎНАЯ ПАЭЗІЯ

Слова пра пакуты.
Слова пра розум. Сьвяты Сава. Пер. І.Чароты. 64
Гарадзенская Каложа. А.Ляскоў. 65

ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА

Богаслужбовыя сьпевы ў Беларусі:
традыцыя і сучаснасьць. Л.Густава. 66

ПРЫХАДСКОЕ ЖЫЦЬЦЁ

35-я ўгодкі прыхода. Прот. Георгій Латушка. 69

Нашы аўтары 76

Мастацкае афармленьне
Антаніны Лапіцкай

З вялікай цікавасьцю прачытаў я першы нумар "Праваслаўя", выдадзенага Беларускім Праваслаўным Брацтвам Трох Віленскіх Мучанікаў і Праваслаўным Брацтвам Сьвв. Кірылы і Мяфодзія ў Польшчы.

Вітаю цудоўны прыклад супрацоўніцтва двух Праваслаўных Брацтваў на глебе праваслаўнай багаслоўска-гістарычнай думкі ў славу Адзінай, Сьвятой, Саборнай, Апостальскай Праваслаўнай Царквы.

Усявышні Госпад няхай благаславіць гэтае добрае пачынаньне ў славу імя Божага і на карысьць нашых народаў.

+ Сава

Архиепископ Тверской и Бежецкий

Фота Я.Пясецкага

МОМІР ЛАЗІЧ

Маўчым,
да Бога рукі працягваем;
у іх Бацькаўшчына
і сэрца,
у плач загорнутае.

БЯГЯСЛОЎЄ

Архіепіскап
Беластоцкі і Гданьскі САВА

ЗНАЧЭНЬНЕ ПРАВАСЛАЎЯ Ў ЖЫЦЬЦІ СУЧАСНАГА ЧАЛАВЕКА.

Франсуа Марыяк, французскі пісьменьнік, на зададзенае яму пытаньне, ці магчыма надзея ў жыцьці сучаснага чалавека, якая стварала б яму неабходныя ўмовы для выйсьця з бязвыхаднага становішча, адказаў: "Адзіная, сьветлая надзея для будучыні сучаснага чалавецтва — гэта прабуджэньне ў сэрцах цяперашняй расейскай інтэлігенцыі". Гэты нечаканы адказ французскага акадэміка гаворыць пра многае. Марыяк, чалавек заходняе культуры, сам рымакатолік, будучыню чалавецтва бачыць не ў заходняй цывілізацыі, але ў веры праваслаўнага народу. Можна меркаваць, што Марыяк перад сваёй сьмерцю адчуў сілу і моц Праваслаўя. Неабходна заўважыць, што на Захадзе не ён адзін адчуваў і адчувае прыцягальную сілу Праваслаўя. На Захадзе Праваслаўе доўгі час заставалася невядомым, пагарджаным, нават забытым. Чалавек еўрапейска-амерыканскай культуры доўгія стагодзьдзі быў самаўпэўненым. Неабходныя былі ўзрушэньні ў яго гісторыі, а таксама ў гісторыі Усходу, каб ён зразумеў скрытую ад яго сілу ўсходняга праваслаўнага хрысьціянства.

Новы Запавет паведамляе нам пра зварот Нафанаіла да апостала Філіпа. Здаецца, што з такім жа пытаньнем, на працягу стагодзьдзяў, чалавек заходняй цывілізацыі, ахінуты рымскім хрысьціянствам, зьвяртаўся да Усходу. Калі апостал Філіп адказаў Нафанаілу, што яны займелі доўгачаканага Месію, той

запытаўся ў яго: ці можа што-небудзь добрае выйсьці з малога й пагарджанага Назарэту? Філіп адказаў на гэтае пытаньне: "Прыйдзі ды паглядзі!" Нафанаіл паслухаўся яго, і пасьля сустрэчы з Хрыстом усклікнуў: "Раві! Ты — Сын Божы! Ты — Цар ізраіляў!" (1. 1, 43-49).

Такі ж самы падыход да праваслаўнага Усходу на працягу стагодзьдзяў быў у разьвіцьці Захаду. Ці ж магчыма, каб што-небудзь добрае прыйшло з паніжанага турэцкім і татарскім нявольніцтвам Усходу? Мабыць такое разуменьне пануе й сёньня ў сьвядомасьці многіх, гэта асабліва адносіцца да нашай краіны. Такое пытаньне задаюць, на жаль, таксама некаторыя людзі ўсходняй культуры, якія выраслі на глебе праваслаўнай культуры, але страцілі сваю гістарычную сьвядомасьць і пакланіліся "залатому цяльцу" заходняй цывілізацыі.

Такім чынам паўтараецца даўнішняя гісторыя, што мела месца на пустыні, на Сінаі, з Майсеем і яго народам. У тым часе, калі Майсей размаўляў з Богам на г. Сінаі і атрымліваў Яго адкрыцьцё, народ ля падножжа гары пакланяўся залатому цяльцу, забыўшы пра Бога й свайго правадыра.

Усход на ўсе гэтыя неўразуменьні й хістаньні ва ўсе часы адказваў: "Прыйдзі ды паглядзі!"

І праўда, кожны, хто падыходзіць да Праваслаўя з чыстым сэрцам Нафанаіла, раней ці пазьней паўтарае яго словы: "Раві, Ты - Сын Божы!..."

У чым заключаецца гэтая прывабнасьць і сіла сьвятога Праваслаўя? У чым сутнасьць таго, што Праваслаўе падтрымлівае, захоўвае і вечна абнаўляе й ўчыняе яго заўсёды маладым? Сутнасьць і зьмест Праваслаўя, яго незьнішчальная магутнасьць і сіла - гэта тое цудоўнае і незаменнае аблічча Хрыста, Сына Божага, з Якім сустрэўся Нафанаіл і шматлікія іншыя людзі пасьля Нафанаіла. Асноўным заданьнем Праваслаўя, праз усю яго гісторыю было й ёсьць - непахісна захаваць аблічча Збавіцеля й правільна Яго ўслаўляць.

Само слова "праваслаўе" сьведчыць, што правільна праслаўляе Хрыста як дасканалага Бога і дасканалага чалавека. Паўстае такое пытаньне: чым ёсьць Праваслаўе? Праваслаўе - гэта праўдзівае праслаўленьне Бога ў чалавеку й чалавекам і праслаўленьне чалавека ў Богу й Богам. Яго праслаўленьне - гэта праслаўленьне вечнай славай, той славай, якую Бог нарыхтаваў ад самага пачатку ўсім тым, хто любіць Яго.

Праваслаўе - гэта праўдзівая вера і сапраўднае жыцьцё паводле яе. Цудоўнае аблічча Хрыста Збавіцеля, і з ім спалучаная вера і жыцьцё, захоўваюцца не абстрактна, але праўдзіва ў Сьвятой Царкве як у богачалавечай і гістарычнай рэальнасьці. Хрыстос - гэта галава Царквы, а Яна - жывы Богачалавечны арганізм. Чым жа ёсьць Царква? Царква - гэта сьвяты квас, пры дапамозе якога расьце й разьвіваецца чалавек і сьвет, Яна - тая сіла, пры дапамозе якой пераўтвараюцца неба й зямля ў новае неба й новую зямлю. Былі й ёсьць шматлікія грамадствы, якія называюць сябе хрысьціянскімі цэрквамі. Між тым праўдзівай царквою ёсьць тая, якая захавала і захоўвае праўдзівую веру ў Хрыста і сапраўднае жыцьцё, паводле гэтай веры. Яна, такая, можа называць сябе праўдзівай, гэта значыць Праваслаўнай Царквою. Кожная іншая грамадскасьць, якая не захоўвае праўдзівай веры і жыцьця, паводле яе, не

Хрэсны ход на сьв. Гары Грабарцы на Праабражэньне Гасподняе

можа называцца Царквою. Так як існуе адзін Хрыстос, так існуе й адна вера, адно хрышчэньне, адзін Дух Сьвяты, Які ўсе напаўняе, ажыўляе і яднае, таксама існуе адна Царква. Як нельга падзяліць Хрыста, таксама немагчыма падзяліць Яго Царкву. Ад Яе можна толькі адзьдзяліцца. Адзьдзяляецца ад Яе толькі той, хто перакручвае Яе вучэньне і адракаецца праўдзівага жыцьця паводле веры.

Праваслаўная Царква праз усю сваю гісторыю клапацілася, каб захаваць непашкоджаным аблічча свае Галавы.

Праваслаўная Царква называецца "Усходняй Царквой". Неабходна заўважыць, што гэтая назва не абазначае геаграфічнага месца, на тэрыторыі якога Яна ажыцьцяўляе сваю місію. Сёньня гэтая назва ўмоўная. Праваслаўная Царква сёньня пашыраецца па ўсіх кантынентах. "Усходняя" - значыць: найважнейшая, гэта ёсьць тая, якая бярэ свой пачатак з "крыніцы", "вытоку", "Усходу". "Усходам" жа названы сам Хрыстос. Усход - крыніца ўсяго, што існуе. Усход - гэта месца, дзе нарадзіўся Хрыстос. "Сонца праўды" - Ён ёсьць пачаткам і канцом, Крыніцай і Засяроджаньнем усяго, што існуе. "Усходняя Царква" абазначае Царкву Хрыстовую, праўдзівую, незьнішчальную й вечную. Гэта царква, якая прапаведуе і сведчыць Хрыста як "Вечны Усход", вечны пачатак і прыстанішча ўсяго быцьця. Як такая Царква ёсьць Адзінай, Сьвятой, Апостальскай і Саборнай. Яе заданьне — гэта працавць, каб усе народы сабраць у адзін народ Божы, каб усе былі ў такой еднасьці, як адзін

Айцец, Сын і дух Сьвяты, а пры тым кожны народ і кожная асоба захоўвалі свае адметныя дары. Якраз ў гэтым заключаецца Яе саборны і сусьветны характар і гістарычнае прызначэньне.

Такі характар і ўласьцівасьці Праваслаўнае Царквы заўсёды актуальныя. А вось і іншыя яе прыкметы, дзякуючы якім яна заўсёды маладая і вечна актуальная. Вядомы рускі філосаф Хамякоў гаварыў, што Царква — гэта ўнутраная праўда чалавечага жыцьця ўсяго сьвету. Яна-унутраная ісьціна таму, што Богачалавек Хрыстос і Яго Царква, поўная жыватворчых дароў, насяляе ўвесь сусьвет, асабліва ж сярод тых, хто прымае Яе верай і дабрачыннасьцю. Праваслаўная Царква мае свой лад, без якога Яна немагчыма. Аднак неабходна падкрэсьліць, што адно значэньне мае лад, а другое - панаваньне. Праваслаўная Царква ніколі не паддалася спакусе ўладаньня й панаваньня над сьветам. Яе асноўнай мэтай было й ёсьць тое, каб праз Яе дзейнасьць сьвет атрымоўваў збавеньне, а Яна была сьветласьцю й здароўем сьвету. інакш кажучы: Яна ёсьць на сьвеце не дзеля таго, каб сьвет служыў ёй, але дзеля таго, каб Яна служыла яму. Кожны чалавек, які жыве жыцьцём Хрыстовым і самаахвярнай любоўю, - гэта сапраўдны член Царквы, ён зьяднаны з Хрыстом і блізкімі непарыўнай любоўю й адзінствам. Адзінства нельга пабудаваць гвалтам якой бы то ні было ўлады, эгаізмам і ганарлівасьцю аднаго чалавека, таму што сваю Царкву на зямлі Бог заснаваў на пакорлівасьці і цярплівасьці. Там, дзе няма самаахвярнай любові, узаемнага шанаваньня, пакорлівасьці й цярплівасьці, там не можа быць і мовы аб праўдзівай Царкве. Таму там, у якой бы то ні было царкоўнай грамадзе, дзе пануе эгаізм і самалюбства над любоўю, цярплівасьцю і пакорлівасьцю, то гэтая грамада ёсьць і будзе асуджана на самазьнішчэньне.

Царква заснавана на самаахвярнай любові, пакорлівасьці й цярплівасьці. Сам Хрыстос, заснавальнік Царквы, паказаў сябе як самаахвярная любоў, невыказная пакорлівасьць і цярплівасьць. З-за любові да чалавецтва Ён прыняў укрыжаваньне й ганебную сьмерць. Таму ў Царкве Хрыстовай вучымся на прыкладзе Хрыста самаахвярнай любові дзеля блізкіх сваіх. У сьведчаньні й прапаведваньні гэтай любові заключаецца вечная рэальнасьць і маладосьць Царквы Хрыстовай. Хрыстос як вечная любоў ёсьць Яе тоесамасьцю й нязьменнай праграмай Царквы. Ён сказаў сваім пасьлядоўнікам: "Калі хто хоча ісьці за Мною, няхай выракаецца сябе і возьме крыж свой і ідзе ўсьлед за Мною". У гэтым закліку Хрыста захавалася ў Праваслаўнай Царкве тое, што сёньня прыцягвае да Праваслаўя, асабліва маладых людзей.

Краса Праваслаўя, фактычна, заключаецца ў бязьмежным ушаноўваньні ў Хрысьце Яго чалавечай асабовасьці й чалавечай свабоды ў Божай паўнаце. Гэтая пашана абавязвае чалавека й яго свабоду й заахвочвае да такой самай ахвярнай дзейнасьці па прыкладу Хрыста й самаахвярнай богачалавечай любові. З самаахвярнай любові, бязьмежнай пакорлівасьці й пашаны да кожнага чалавека Бог стварае сваю Царкву. Апрача названых Праваслаўная Царква валодае яшчэ адной, вельмі важнай уласьцівасьцю, якая мае вялікае значэньне для ўсіх часоў і людзей, асабліва ж моладзі. Праваслаўная Царква па сваёй прыродзе ад самага пачатку свайго існаваньня - гэта ёсьць Царква сьведчаньня

Сьвята-Праабражэнская царква на сьв. Гары Грабарцы (перад пажарам)

й сьведкаў, гэта значыць: Царква мучанікаў і падзьвіжнікаў.

Перш за ўсё сам Збавіцель - гэта сьведка Божы, сьведка ісьціны. Сваё сьведчаньне Ён пацьвердзіў сваімі пакутамі й сьмерцю. Вернымі прадаўжальнікамі гэтага сьведчаньня былі сьвятыя апосталы, мучанікі й усе сьвятыя па сёньняшні дзень. Многія з іх, апрача пакутнай сьмерці, сьведчылі "пакутніцтвам сумленьня" гэта значыць: безупынным духоўным змаганьнем, ачышчэньнем, пакутай і намаганьнем для перамогі над сваімі страсьцямі. Сьведкаў Хрыста гісторыя Царквы ведае з усіх часоў і да сёньняшняга дня. Неабходна адзначыць, што наша эпоха дала аграмадную колькасьць пакутнікаў. Успомнім толькі Расею, Беларусь, Украіну, Харватыю й інш. Праваслаўная Царква й сёньня жыве як сьведка ўкрыжаванага Хрыста. Успомнім сёньняшні стан Царквы: маці ўсіх цэркваў - Іерусалімскую, Антыяхійскую, Царградскую й іншыя. Паўстае пытаньне: адкуль гэтае пакутніцтва Праваслаўнай Царквы? Сьвяты Макарый Вялікі дае нам правільны адказ на гэтае пытаньне. Ён кажа, што там, дзе ёсьць Дух Сьвяты, там ёсьць і ганеньне. Гэта значыць, што там, дзе знаходзіцца ісьціна, дзе жыве праўдзівая Царква як носьбіт Сьвятога Духа, там ёсьць і ганеньне. Зло мае тое ў сабе, што змагаецца за выкараненьне Сьвятога Духа з жыцьця чалавека. І гэты момант, хоць і парадаксальны, сьведчыць пра тое, што Праваслаўная Царква - гэта Праўдзівая Царква, Ёю кіруе Дух Сьвяты. Нядзіўна таму, што цяперашняе Яе становішча нагадвае ўкрыжаванага Хрыста. Гэтая Яе прыкмета - апраўданая гісторыяй - уносіць выратавальны ўклад у жыцьцё сучаснага сьвету. Возьмем прыклад. Пакуты праваслаўнай візантыйскай дзяржавы й іншых балканскіх народаў у XIV і XV стагодзьдзях мелі адкупляльны характар і значэньне не толькі для праваслаўных народаў, але і для народаў Захаду. Тая ж зьява з мінулага паўтараецца і сёньня: кроў многіх праваслаўных пакутнікаў - гэта тая ж самая сіла, пра якую гаворыць апостал Павел, што яна паўстае супраць антыхрыста й яго дэманскай дзейнасьці ў сучасным сьвеце.

Не трэба забываць, што гісторыя чалавецтва апрача зьнешняга выразу мае глыбокія духоўна-метафізічныя рысы. На самай справе Праваслаўе знаходзіцца на гэтым духоўным шляху сёньняшняга дня. Таму сьмела можам сказаць, што ад Яго лёсу залежыць лёс сучаснага сьвету. Праваслаўная вера й жыцьцё паводле яе патрабаваньняў успрымаюцца цяперашнім грамадствам з надзеяй. У мінулым стагодзьдзі гэтую вялікую сілу Праваслаўя прафетычна прадбачыў Дастаеўскі. Паводле гэтага прадказаньня сёньня Праваслаўе ажыцьцяўляе сваю місію на ўсіх кантынентах сьвету. Гэтак жа як Крыж Хрыстовы ёсьць сілай, адзнакай і аховай сусьвету, таксама й сёньня Праваслаўе сьведчыць і раскрывае сьвету моц Сьвятога Крыжа Хрыстовага. Сёньня Праваслаўе паказвае сьвету, у чым заключаецца яго правільны шлях і збавеньне. Яго "ранамі", як калісьці ранамі Хрыста, вылечваюцца раны сьвету. Гэтая сёньняшняя самаахвяра Праваслаўя , галгофская любоў праваслаўнага народу, прадстаўляе магутнасьць "любові, якая не шукае сваіх". Праваслаўе прапануе яе сьвету як адзінае лякарства ў яго хваробе й ранах.

Праваслаўныя людзі пакліканы быць сьведкамі гэтай самаахвярнай галгофскай любові. Кожны праваслаўны хрысьціянін, дзе б ён ні знаходзіўся,

да якога народу ні належаў бы й якое б месца ні займаў, ён прызначаны быць сьведкам і прапаведнікам гэтай любові. Гэта наш праваслаўны абавязак, абавязак перш за ўсё кожнага праваслаўнага маладога чалавека.

У канцы зьвернем увагу на яшчэ адзін момант у жыцьці Праваслаўя, дзякуючы чаму Яно сапраўды ёсьць вечная маладосьць маладых, вечнае ўваскрэсеньне, аснова й падтрымка старых.

Праваслаўная Царква - Царква Сьвятой Еўхарыстыі. Яна ўся жыве, адкрываецца і зьдзяйсьняецца ў Еўхарыстыі. Хрыстос у Сваім целе й крыві Якога мы прычашчаемся ў Сьвятой Літургіі, застаецца паміж намі й у нас сілай і дзеяньнем Сьвятога Духа да канца веку. Таму ў Сьвятой Літургіі больш за ўсё можам навучыцца нашага сьведчаньня сьвету: "самі сябе, адзін аднаго й усё жыцьцё сваё аддаваць Хрысту Богу". Ад Хрыста ўспрымаем самаахвярную любоў, як адзіны спосаб жыцьця, і застаемся вобразам, безупынна накіроўваючы сябе ў шчырую багалюбнасьць і чалавекалюбнасьць. Усё жыцьцё хрысьціяніна вынікае са Сьвятой Літургіі й ўвесь час правяраецца ў Сьвятым Духу.

Праваслаўны хрысьціянін не можа жыць адным жыцьцём у Царкве, а другім па-за Ёю. Усё жыцьцё праваслаўнага хрысьціяніна павінна быць ацаркоўлена й асьвечана Сьвятой Літургіяй.

Трэба моцна падкрэсьліць наступнае: той, хто ведае, што такое Літургія, той ведае, што значыць Царква й што значыць быць Яе праўдзівым членам. Кожны, хто жадае прыладжваць жыцьцё Царквы й сваё асабістае насуперак Сьвятой Літургіі, той не можа спазнаць, чым ёсьць Царква і што такое Сьвятая Літургія ды што значыць быць праўдзівым хрысьціянінам. Літургія па сваёй прыродзе ўключае ў сябе ўсё штодзённае жыцьцё й пераўтварае яго ў супольнасьць любові Хрыстовай. Падчас Літургіі мы пазнаём свайго вечнага брата й сабрата ў Хрысьце. На Сьвятой Літургіі Бог адкрываецца нам, якім ён ёсьць ў сапраўднасьці, а чалавек становіцца такім, якім ён павінен быць. Яна заключае ў сабе ўсе таінствы і ў Ёй дасьпявае паўната жыцьця.

Царква як еўхарыстычная супольнасьць задавальняе голад сучаснага чалавека, а ў гэтым заключаецца сэнс нашых штодзённых намаганьняў. Жыць трэба верай і ўвасабляць яе ў штодзённай дзейнасьці, бо гэта дастойнае прызначэньне чалавечага жыцьця. Яно адкрывае чалавечае быцьцё, уводзіць у жыцьцё вечнае й дапамагае ў атрыманьні харызматычных дараў.

Такі падыход да Сьвятой Літургіі ў Праваслаўнай Царкве быў заўсёды, і сёньня ён ёсьць заклікам, накіраваным да кожнага чалавека, асабліва адкрытага на ўсе праявы жыцьця.

Праваслаўе пабудавана на вечным падмурку, дасканалым і бясконцым. Таму такое вялікае Яго значэньне для ўсіх людзей усіх узростаў і ўсіх часоў. і як такое Яно сапраўды ёсьць адзіная сьветлая зара, якая асьвятляе будучае сьвету й чалавецтва.

Епіскап Навагрудскі і Лідскі
КАНСТАНЦІН /Гаранаў/

ЛЕКЦЫІ З ДАГМАТЫЧНАГА БАГАСЛОЎЯ

Уводзіны.

На духавенства ўскладзена асаблівая адказнасьць за дакладнае разуменьне праваслаўнага веравучэньня. Духавенства паклікана навучаць Божым ісьцінам народ і ахоўваць яго ад чужасных Праваслаўю ўплываў, захоўваць "талент усяленскай веры" ў суцэльнасьці і непарушнасьці. Будучаму пастыру неабходна рыхтавацца да сустрэчы на прыходзе не толькі з "прастакамі", якіх робіцца ўсе менш, але і з "мудрацамі". Нямала праваслаўных вернікаў не ведае тонкасьцяў багаслоўя і не цікавіцца імі. Пастыр, напэўна, памыліўся б, пачаўшы з царкоўнага амвона прапаведваць аб найскладанейшых перапетыях дагматычнай палемікі эпохі Усяленскіх Сабораў. Аднак сьвятар будзе не на вышыні свайго пакліканьня і рызыкуе адштурхнуць ад сябе тых, што шукаюць ісьціну, калі не здолее адказаць на пастаўленае дагматычнае пытаньне. У адпаведнасьці з духоўным і інтэлектуальным узроўнем прыхаджанаў, пастыру належыць у пропаведзі і ў прыватнай размове з вернікамі спалучаць "мяккую ежу" маральных павучаньняў з больш "цьвёрдай" - выкладаньнем і тлумачэньнем догматаў. "Паглыбляйся ў сябе і ў вучэньне; займайся гэтым заўжды: бо такім шляхам і сябе ўратуеш, і тых, хто слухае цябе"/I Цім. 4, 16/, зазначае апостал Павел.

Кожны верник, безумоўна, павінен ведаць у агульных рысах асноўныя палажэньні праваслаўнага веравучэньня. Мітрапаліт Маскоўскі Філарэт (Драздоў) казаў, што "нікому не дазволена ў хрысьціянстве быць зусім неадукаваным і заставацца невукам. Сам Госпад ці не назваў Сябе Настаўнікам і Сваіх пасьлядоўнікаў вучнямі? Перш, чым хрысьціяне пачалі звацца хрысьціянамі, яны ўсе да аднаго званіся вучнямі. Няўжо гэта выпадковыя імёны, якія нічога не значаць? І навошта Госпад паслаў у сьвет Апосталаў? -

найперш вучыць усе народы: "шедше научите вся языки..." Калі ты не хочаш вучыцца і адукоўвацца ў хрысьціянстве, то ты не вучань і не пасьлядоўнік Хрыстоў, - не для цябе былі пасланыя Апосталы, - ты не тое, чым былі ўсе хрысьціяне ад самага пачатку хрысьціянства; - я не ведаю, што ты такое, і што з табою будзе" 1).

Безумоўна, мэтаю хрысьціянскага жыцьця зьяўляецца не назапашваньне пэўных багаслоўскіх ведаў, а "стяжание" благадаці Сьвятога Духа. Аднак гэтая мэта без веданьня асноўных хрысьціянскіх догматаў застаецца недасягальнаю. Заклік Апостала Паўла гучыць па-ранейшаму надзённа: "Таму і мы з таго дня, як пра гэта пачулі, не перастаём маліцца за вас і прасіць, каб вы напоўніліся разуменьнем волі Яго, ва ўсялякай прамудрасьці і пазнаньні духоўным" /Кал. 1, 9/. Канстатуючы памылковую аднабокасьць выключна рацыяналістычнага падыходу да тайнаў веры, Царква разам з тым заклікае хрысьціянаў да веры сьвядомай, а не сьляпой. Сьвятар павінен пазьбягаць начотніцтва і спробаў "засыпаць" свайго суразумоўцу голымі цытатамі, як гэта часьцей за ўсе робяць баптысты. Каб вучыць багаслоўю, сьвятар павінен, у першую чаргу, сам валодаць гэтым дабрадатным дарам, які Апостал далучае да ліку сямі іншых дабрадатных служэньняў у Царкве Хрыстовай: "... па дадзенай нам благадаці маем разнастайныя дараваньні... калі маеш служэньне - будзь у служэньні; калі настаўнік, - у настаўніцтве"/Рым.12, 6-7/. Гэты дар, як і ўсялякі іншы мае неабходнасьць у "возгревании" дбайнай працай. Багаслоўе зьяўляецца асаблівым праўленьнем любові да Бога, якую належыць зьдзяйсьняць не толькі ўсім сэрцам і ўсёю душою, але і "ўсім разуменьнем"/Мф. 22, 38/. Яно зьяўляецца асаблівым дарам духоўным, бо сярод іншых дароў "аднаму даецца Духам слова мудрасьці; другому слова веды"/I Кар. 12, 8/, і, адпаведна, "адных Бог паставіў у Царкве, па-першае, Апосталамі, па-другое, прарокамі, па-трэцяе, настаўнікамі"/I Кар. 12, 28/.

Не ўсе пакліканы да настаўніцтва, але ўсім хрысьціянам даверана вучэньне, якое захоўваецца як паданьне царкоўнае, як сьвятыя догматы веры. Такім чынам, Царква валодае асаблівым дарам і служэньнем багаслоўства, як жыцьцёвага, дзейснага захаваньня Божае ісьціны, як натхнёнага багаслоўя - звыш разуменьня і сузіраньня, боганатхнёнай творчасьці, якая не з нічога альбо ад асабістага мудраваньня, але з агульнацаркоўнага скарбу сыходзіць. Мы назіраем хрысьціянскае жыцьцё - як асабістае, так і ў суцэльнасьці - наўсьцяж прасякнутае догматамі веры. Веравызнаньне апостала Пятра адкрылася яму не ад цела і крыві, але ад Айца Нябеснага: "Ты Хрыстос, Сын Бога жывога" /Мф.16, 16/, таксама і запаведзь Хрыстова хрышчэньня "У імя /а не ў імены/ Айца і Сына і Сьвятога Духа", у разгорнутым выглядзе ўваходзіць у Сімвал Веры, які чытаецца пры выкананьні Таінства Хрышчэньня і на Божае Літургіі перад выкананьнем Таінства Еўхарыстыі. Зьмест Сімвала Веры раскрываецца ў сістэме багаслоўя, хоць і не для кожнага гэтае раскрыццё даступнае ў рознай ступені, як па-рознаму адбываецца яно і ў розныя эпохі.

1. Паняцьце аб багаслоўі

Тэрмін "багаслоўе" /па-грэцку — θεολογια, па-лацінску — theologia/, складанае слова з дзьвюх частак: Θεοσ — Бог і λογοσ — слова, ужываецца ў наш час у вельмі шырокім значэньні. Класічныя пісьменьнікі Старажытнай

Грэцыі вызначалі гэтым словам спачатку міфалагічнае вучэньне пра багоў, а з часоў Арыстоцеля Стагірыта /384-322 да н.э./ - і філасофскае вучэньне аб Бажаствe. Тэолагамі называлі старажытных антычных паэтаў - Гамера, Гесіода, Арфея, якія складалі паэмы пра багоў.

Настаўнікі Царквы багаслоўем называлі напачатку толькі Сьв. Пісаньне, бо яно ёсьць словам пра Бога і ад Бога; Стары Запавет - Багаслоўем "старым", Новы - новым Багаслоўем, а ўсіх аўтараў аднаго і другога Запавету, Прарокаў і Апосталаў - багасловамі.

У хрысьціянскім успрыняцьці тэрмін "багаслоўе" можа быць асэнсаваны дваякім чынам. Па-першае, як слова Бога аб Самім Сабе. Багаслоўе ў дакладным сэнсе, як слова пра Бога, зрабілася магчымым толькі пасьля сашэсьця Сына Божага, Які адкрыў нам праўдзівае вучэньне пра Бога. На думку архіепіскапа Фесаланікійскага Грыгорыя Паламы /+1359/, Бог Слова дзеля нас не толькі ўцелясьніўся, але і зрабіўся багасловам 2). Гэтае слова Бога аб Сабе і аб створаным Ім сьвеце зьяўляецца зьместам Божага Адкрыцьця.

Па-другое, у агульнапрынятым значэньні пад "багаслоўем" разумеюць вучэньне Царквы альбо асобнага Сьвятога Айца пра Бога. У Старажытнай Царкве сьферaю багаслоўя лічылася пытаньне аб Сьвятой Тройцы. Не выпадкова ў богаслужбовых тэкстах Сьвятая Тройца называецца "найсапраўдным прадметам багаслоўя" 3). Так сьвятыя Апостал Іаан /+пач. II ст./, сьвяціцель Грыгорый Назіянзін, архіепіскап Канстанцінопальскі /+каля 390г./ і прападобны Сімяон /+1032/ Царквою называюцца багасловамі /пераважна/: першы выразьней за астатніх евангелістаў выклаў вучэньне аб Бажаствe Сына і аб Сьвятой Тройцы; другі - нястомна абараняў і натхнёна прапаведваў троічны догмат; трэці - услaвіў яднаньне чалавека з Трыадзіным Бажаствoм.

Усе астатнія часткі веравучэньня: аб стварэньні сьвету, аб збавеньні, аб Царкве і яе таінствах, аб Другім Прышэсьці Хрыстовым і г.д. айцы Царквы адносілі да сьферы іканаміі 4). Значна пазьней усталяваўся звычай пад багаслоўем разумець усё вучэньне пра Бога і Яго Дамастрой, Яго адносіны да сусьвету і чалавека. У XII ст. багаслоўем пачалі ў школах называць сістэматычнае і навучальнае выкладаньне ўсіх хрысьціянскіх ісьцінаў пра Бога і богаўшанаваньне. У такім значэньні ўпершыню ўжыў тэрмін "багаслоўе" схаластычны багаслоў і філосаф П'ер Абеляр /1079-1142/.

Цяпер багаслоўе - суцэльная сістэма навукаў, сярод якіх адрозьніваюць: асноўнае, маральнае, параўнальнае, пастырскае і дагматычнае багаслоўе.

2. Азначэньне тэрміна "догмат".

Як і шматлікія іншыя тэрміны з рэлігійнага лексікону слова "догмат" ужываецца ў гутарковай мове, у прэсе часта ў скажоным разуменьні, з адмоўным сэнсавым адценьнем, як штосьці зьмярцьвелае. Таму лічу неабходным спыніцца на этымалогіі гэтага тэрміна больш падрабязна.

Слова "догмат", па-грэцку — δογμα, утвараецца ад грэцкага дзеяслова δοκειν /докін/, які азначае - думаць, меркаваць, верыць. Аднак не азначае толькі меркаваньне альбо яшчэ нявызначанае і неўсталяванае меркаваньне. Δογμα азначае і канчатковы вынік, што выражаецца мінулым часам дзеяслова δεδογμαι і δεδοκημαι /дэдогмэ і дэдокімэ; перфект/, які азначае - вырашана, неабходна, вызначана.

У філосафа Платона /427—347 да н.э./ у дыялогу "Дзяржава" догматамі

называюцца пастановы і рашэньні, якія датычацца паняцьцяў справядлівасьці і хараства. У старажытнагрэцкага стратэга і пісьменьніка Ксенафонта / каля 430—50 гг. IV ст. да н.э./ словам "догма" называецца загад, якому бясспрэчна павінны былі падпарадкоўвацца ўсе военачальнікі, а ўсьлед за імі і ўсе падначаленыя воіны. Выдатны старажытнагрэцкі філосаф Арыстоцель Стагірыт ужывае гэтае слова ў сэньсе вучэньня, палажэньня, якое мае сілу непісанага закона. Рымскі палітык, філосаф і знакаміты сваім красамоўствам прамоўца Цыцэрон /106—43 да н.э./ называе догматамі бясспрэчныя філасофскія палажэньні. Старажытнагрэцкі гісторык Палібій /каля 200 — каля 120 да н.э./ называе догматам сенацкую пастанову /senatus consultum/. У рымскага палітычнага дзеяча, філосафа і пісьменьніка Сенэкі /каля 4 да н.э. — 65 н.э./ догматы - асновы маральнага закона. У Герадыяна /каля 170 — каля 240/, рымскага гісторыка грэцкага паходжаньня, словам "догма" азначалася рашэньне альбо пастанова рымскага сената, абавязковая для ўсяго рымскага народа.

Аднак для нас найбольш важна тое, што слова "догма" сустракаецца з падобным значэньнем і ў Біблii. Так, у кнізе прарока Данiіла догмай называецца царскі ўказ. "Калі выйшаў гэты загад /δογμα/, каб забіваць мудрацоў, шукалі Данiіла і таварышаў яго" /Дан. 2, 13/. "Ты, цару, даў загад /δογμα/, каб кожны чалавек..." /Дан. 3, 10/. "Тады зацьвердзі, цару, гэтае вызначэньне і падпішы ўказ, каб ён быў нязьменным, як закон /догма/ Мідыйскі і Персідскі, і каб ён не быў парушаны. Цар Дарый падпісаў указ /догма/..." /Дан. 6, 8 і 9/. І далей у 16 вершы ідзе размова аб непарушнасьці закона /догма/ мідзянаў і персаў. У кнізе Эсфір /3, 9/ для азначэньня рашэньня выдаць царскі загад, які ўсімі павінен быць беспярэчна выкананы, ужываецца слова δογματισατο /догмацісато/, таксама і ў 2-й Макавейскай кнізе /10, 8; 15, 36/ для азначэньня рашэньня іудзеяў назаўжды ўзаконіць сьвята ў памяць аб вызваленьні іх ад тагачасных бедаў ужываецца той самы дзеяслоў εδογματισαν /эдогмацісан/.

У адпаведным сэньсе слова "догма" некалькі разоў ужываецца і ў Новым Запавеце. Евангеліст Лука называе догмай указ аб перапісе, абавязковасьць якога распаўсюджвалася на ўсё насельніцтва Рымскай імперыі: "У тыя дні выйшаў ад кесара Аўгуста загад /догма/ правесьці перапіс па ўсёй зямлі" /Лк. 2, 1/.

У апостала Паўла словам "догма" азначаецца закон Маісееў. Напрыклад: "Скасаваўшы варожасьць Целам Сваім, а закон запаведзяў /δογμασιν/ вучэньнем" /Эф. 2, 15/. У падобным сэньсе гэтае слова ужываецца Апосталам і ў пасланьні да Каласянаў /2, 14/. Закон Маісееў дзеля свайго Божага аўтарытэту меў статус абавязковасьці і служыў нормай, якая рэгулявала жыцьцё ўсяго іўдзейскага народа.

Але найбольш важнае для нас тое, што ў кнізе Дзеяньняў догматамі называюцца апостальскія азначэньні, якія маюць ужо непасрэдныя адносіны да жыцьця хрысьціянскай царквы: "Калі ж праходзілі праз гарады, навучалі верных захоўваць уставы /δογματα/, пастаноўленыя Апосталамі і прасьвітарамі ў Іерусаліме" /Дзеян. 16, 4/. Гэта былі веранавучальныя и дысцыплінарныя пастановы Апостальскай Царквы, кіраванай Духам Сьвятым /Дзеян. 15, 28/, якія мелі моц абавязковага закона для ўсіх членаў Царквы Хрыстовай.

Пасьлядоўнік справы апостальскай сьв. Ігнацій Баганосец хрысьціянскія догматы называе догматамі Гасподнімі, а Арыген - догматамі Божымі, насуперак

ілжэвучэньням ерэтыкоў, якія сьцьвярджалі чалавечае замест Божага. У старажытнай Царкве паступова адбыўся падзел паняцьця догма: само слова "догма" ўжывалася толькі адносна прадметаў веравучэньня, а маральныя запаведзі і пытаньні царкоўнай дысцыпліны пачалі азначацца тэрмінамі канон або правіла. Сьв. Кірыл Іерусалімскі /315-386/ адносна хрысьціянскіх ісьцінаў Сімвала веры Іерусалімскай Царквы піша: "Вобраз пабожнасьці складаецца з двух рэчаў: з пабожных догматаў і добрых учынкаў. І догматы без добрых учынкаў не ўгодныя Богу, і справы, што выконваюцца без пабожных догматаў, не прымаюцца Богам". Айцы Царквы IV стагодзьдзя сьвятыя Васіль Вялікі, Грыгорый Багаслоў, Іаан Златавусты і Грыгорый Ніскі пад догматамі разумеюць ні што іншае, як хрысьціянскае веравучэньне. Але што асабліва важна, на Ўсяленскіх Саборах слова "догмат" ужывалася толькі для ісьцінаў веравучэньня, якія маюць несумненны, бясспрэчны і непарушны характар. Як піша сьв. Вікенцій Лірынскі, догматам нябеснай філасофіі неўласьціва падлягаць якім-небудзь зьмяненьням, альбо зьнявечаньням, падобна ўстанаўленьням зямным, якія могуць дасканаліцца толькі несупыннымі выпраўленьнямі і крытыкай.

Першае правіла VI Усяленскага Сабора пастанаўляе: "Калі хтосьці з усіх не захоўвае і не прымае догматаў пабожнасьці, не так думае і прапаведуе, але і замахваецца ісьці супраць іх, таму няхай будзе анафема...і ад саслоўя хрысьціянскага, як чужасны, няхай будзе адлучаны". Таму догматы, як ісьціны веры, у старажытных Айцоў і Настаўнікаў называліся таксама догматамі Царквы, або царкоўнымі догматамі.

Такім чынам, мы падышлі да наступнай характарыстыкі догматаў: 1) яны зьяўляюцца ісьцінамі хрысьціянскай веры; 2) яны Божыя, таму бясспрэчныя і непарушныя; 3) гэтыя ісьціны сфармуляваны Царквой; 4) яны маюць моц агульнаабвязковага правіла.

3. Праваслаўнае дагматычнае багаслоўе.

Праваслаўнае дагматычнае багаслоўе - гэта навука, якая ў сістэматычнай пасьлядоўнасьці раскрывае зьмест асноўных хрысьціянскіх ісьцінаў веры /догматаў/, прынятых усёй Праваслаўнай Царквой.

Догматы ў існуючых цяпер разнастайных хрысьціянскіх веравызнаньнях вытлумачваюцца не аднолькава, і кожнае з веравызнаньняў мае свае сістэмы дагматычнага багаслоўя. Істотныя дагматычныя адрозьненьні паміж Праваслаўем і іншымі хрысьціянскімі канфесіямі разглядаюцца ў курсе Параўнальнага багаслоўя. Праваслаўная дагматыка вывучае праваслаўную багаслоўскую традыцыю, часам дзеля апалагетычных мэтаў спыняючыся на іншаслаўным разуменьні асобных догматаў /напрыклад: аб сыходжаньні Сьвятога Духа альбо аб Збавеньні/.

СПАСЫЛКІ:

1) Філарэт, мітр. Маскоўскі. "Слова и речи". Т. IV, 1882, с.151-152.

2) Архімандрыт Амфілохій /Радовіч/. "Филиокве" и нетварная энергия по учению св. Григория Паламы". Машынапіс МДА, с.1.

3) Палуначніца нядзельная, глас 1, песьня 3.

4) Іканамія /грэц./ - літаральна кіраваньне домам, дамастрой, а ў дадзеным кантэксьце дзейнасьць Бога па стварэньні, промысьле і збавеньні сьвету.

ТЫСЯЧАГОДДЗЬДЗЕ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ НА БЕЛАРУСІ

Ігумен Нікан (Лысенка).

ГІСТОРЫЯ МЕНСКАЙ ДУХОЎНАЙ СЕМІНАРЫІ І СУЧАСНЫ СТАН ПРАВАСЛАЎНАЙ ДУХОЎНАЙ ШКОЛЫ НА БЕЛАРУСІ.

(Прамова на Урачыстым Акце 1 верасня 1993 года з нагоды 200-годдзьдзя Менскай Духоўнай Семінарыі).

Споўнілася дзьвесьце год з таго часу, як царкоўная школа, якая па імю малой памеснай царквы Белай Русі — Менскай епархіі — атрымала назву Менская Духоўная Семінарыя, пачала сваё служэньне высокай справе праваслаўнай духоўнай асьветы. Дзьвесьце год. Як і ўсякая чалавечая мера, гэты адрэзак часу ўмоўны. Аднак хрысьціянскае царкоўнае разуменьне падзеяў зямнога жыцьця можа памагчы нам адкрыць уласны сэнс таго ці іншага адрэзка гістарычнага часу, калі мы будзем разглядаць яго не ізалявана, але ў жывой яго сувязі з жыцьцём Царквы Божай, якое адбываецца не толькі ў адносным часе, але і ў вечнасьці. Двухсотгадовая гісторыя Менскай Духоўнай Семінарыі можа быць прадстаўлена як збор сьветлых успамінаў пра слаўнае мінулае нашай школы. Аднак калі мы, ўзіраючыся ў гэтую гісторыю, здолеем ўбачыць і тое, як штодзённыя падзеі жыцьця духоўнай школы адлюстроўвалі і агульны рух гістарычнага жыцця Праваслаўя і лёсы Айчыны, нашаму разуменьню можа адкрыцца штосьці большае.

Гісторыя Менскай Духоўнай Семінарыі дазваляе на канкрэтным фактычным матэрыяле разабраць шэраг важных пытаньняў. Важных не толькі для

кабінетнай навукі, але даволі значных для жыцьця духоўнай школы ў нашыя дні і ў бліжэйшай будучыні. На мой погляд, найбольш актуальнымі з гэтых пытаньняў з'яўляюцца наступныя:

— у чым генеалогія царкоўна-школьнай традыцыі, у рэчышчы якой адбывалася станаўленьне Менскай Семінарыі як духоўнай навучальнай установы са сваёй рэгіянальнай сьпецыфікай і асаблівасьцямі;

— якое ўздзеяньне багаслоўская школа ў асобе Менскай Духоўнай Семінарыі мела і мае ў цяперашні час на беларускае рэлігійна-грамадскае жыцьцё;

— як увасабляліся і ўвасабляюцца ў жыцьці нашай духоўнай школы разнастайныя прынцыпы і метады духоўнай асьветы і выхаваньня, і якімі бачацца перспектывы яе далейшага разьвіцьця ў дыдактыка-педагагічных адносінах.

Афіцыйнае зацьвярджэньне Менскай Духоўнай Семінарыі адбылося 13 красавіка 1793 года ў сувязі са стварэньнем тады ж у беларускіх землях новай, Менска-Ізяслаўска-Брацлаўскай праваслаўнай епархіі. З 1793 года да 1846 года Менская епархіяльная Семінарыя мела сваё знаходжаньне ў г. Слуцку. Непасрэднай папярэдніцай новазацьверджанай Семінарыі была Слуцкая ці, як яна нярэдка звалася ў афіцыйных паперах, "Праасьвяшчэннага Віктара Садкоўскага" Семінарыя. Апошняя была заснавана ў 1785 годзе, адначасова з зацьвярджэньнем епіскапіі Пераяслаўска-Барысапольскай, для акармленя ўсіх, хто "спавядае грэцкі закон у Польшчы".

Семінарыя гэтая ўзьнікла ў Слуцку зусім не на пустым месцы. Праваслаўная Духоўная школа існавала ў гэтым горадзе ўжо больш двух стагодзьдзяў. Заснавальнікам яе быў верагодней за ўсё ігумен Сьв. Троіца-Сергіева манастыра Арцемій. Ён пасяліўся ў Слуцку ў 60-я гады XVI стагодьдзя, пасля таго, як уцёк з салавецкай ссылкі, на якую быў асуджаны Маскоўскім Саборам 1554 г. па ілжывым абвінавачваньні ў ерэтычных поглядах.

Апрача высокіх духоўных дабрадзействаў, вучань прападобнага Карнілія Камельскага ігумен Арцемій вылучаўся і грунтоўнай багаслоўскай адукаванасьцю. У Літве, дзе ў гэты час шырока распаўсюдзіўся пратэстантызм, у тым ліку і ў крайніх формах антытрынітарных ерасяў, ён выступіў у галіне праваслаўнай апалагетыкі і, паводле сьведчаньня сучасьніка, "праз яго Бог зрабіў тое, што ўвесь народ рускі ў Літве не сапсаваўся ад ерасі арыянскай і лютарскай"(1). Уладкоўваючы пры Сьв. Троіцкім манастыры праваслаўную царкоўную школу, былы ігумен Тройца-Сергіева манастыра, як уяўляецца, не мог не прынесьці ў арганізацыю навучаньня ў ёй элементаў маскоўска-рускай духоўнай традыцыі, якая ўзыходзіць да прападобнага Сергія Раданежскага. У той жа час ён, як і яго супрацоўнік у справе развіцця ў Літоўскай Русі духоўнай асьветы, князь Андрэй Міхайлавіч Курбскі, не цураўся сучасных грэцкіх узораў. У выніку ўзаемадзеяньня гэтых элементаў ўзьнікла школа, якая прынцыпова адрозьнівалася ад школ езуіцкага тыпу, дзе насаджалася адарваная ад сапраўднага духоўнага жыцьця схаластычная адукаванасьць.

У праграму Слуцкай Троіцкай манастырскай школы ўваходзіла вывучэньне граматыкі (славянскай і грэцкай), рыторыкі і дыялектыкі паводле сьв. Іаана

Дамаскіна. Бліжэйшай задачай школы зьяўлялася падрыхтоўка прапаведнікаў, бо пропаведзь была галоўным сродкам ў барацьбе за веру, якая разгортвалася ў той час у Літве. Педагагічная традыцыя беларускай школы каранілася на Літургічным жыцьці Царквы. Навучэнцы павінны былі прысутнічаць на манастырскіх набажэнствах штодзённа. Важнае значэньне для разьвіцьця праваслаўнай духоўнай школы мела арганізаваная гуртком ігумена Арцемія і князя Курбскага праца над перакладам сьвятаайчынных і сучасных палемічных твораў не толькі на царкоўнаславянскую, але і на тагачасную беларускую мову.

Гістарычныя зьвесткі, што дайшлі да нас,не дазваляюць прасачыць лініі простай пераемнасьці між Троіцкай манастырскай школай, заснаванай ігуменам Арцеміем, і Слуцкай духоўнай школай, якая была непасрэднай папярэдніцай Семінарыі, заснаванай ў 1785 годзе. Магчыма, прамежкавае зьвяно між імі — школа Слуцкага Праабражэнскага праваслаўнага брацтва, апякункаю якога была сьв. праведная Соф'я, княгіня Слуцкая (1612г.).

У сярэдзіне XVIII ст. гэтая школа пры Слуцкім Праабражэнскім манастыры насіла назву "калегіума для навучаньня дзяцей духоўнага званьня". Пазьней, пераведзеная ў Троіцкі манастыр, яна працягвала сваё існаваньне і пры архімандрыце Слуцкім (1783-1785), у далейшым (1785-1793) епіскапе Пераяслаўска-Барыспальскім, архіепіскапе Мінска-Ізяслаўска-Брацлаўскім Віктары (Садоўскім).

Бясспрэчна, паводле тыпу арганізацыі навучальнага і выхаваўчага працэсу гэта была ўжо іншая школа, дзе пераважала лацінска-польская сістэма на ўзор Кіеўскай Духоўнай Акадэміі, ўсе выкладчыкі якой былі яе выхаванцамі. Аднак няправільна было б забывацца на духоўнае значэньне традыцыі старых манастырскіх і брацкіх школ.

Зьбіральніцкая праца некалькіх пакаленьняў навучэнцаў і выкладчыкаў на працягу стагодзьдзяў стварала і ўзбагачала сам дух праваслаўнай адукаванасьці. Як слушна адзначыў рускі царкоўны гісторык А.Карташоў: "Не выпадкова акрэсьліўся на фоне гісторыі той факт, што ўзровень багаслоўскай творчасьці гнанай, прыгнечанай заходнерускай праваслаўнай школы стаў на шмат вышэйшым і больш плённым, чым уніяцкі. Ініцыятары і правадыры уніі шукалі толькі панскага дабрадзейства, а не подзьвіга навукі. Гэты подзвіг ужо даўно пачаўся нацыянальна настроенымі працаўнікамі брацтваў і брацкіх школаў"(2). Заўважым, што гэта нацыянальная настроенасьць была зусім чужою вузкаму нацыянальнаму правінцыялізму. Ва ўмовах, калі ўлады Рэчы Паспалітай праводзілі на Беларусі мэтанакіраваную палітыку татальнай паланізацыі, жыцьцёва неабходным для выжываньня беларусаў як нацыі было захаваньне культурнай спадчыны, якая ўзыходзіць да традыцыяў Кіеўскай Русі.

Такая нацыянальная настроенасьць азначала, што, пазітыўна засвойваючы заходнееўрапейскі культурны вопыт, яе носьбіты захоўвалі выразнае ўсьведамленне сваёй прыналежнасьці да гістарычнай супольнасьці праваслаўных усходне- і паўднёва-славянскіх народаў, да цывілізацыі візантыйскага тыпу. Воблік беларускай духоўнай школы фармаваўся, такім чынам, у складаным сінтэзе разнастайных узьдзеяньняў і традыцыяў. Каб уявіць яго больш выразна

і акрэсьлена, зьвернемся цяпер да пытаньня пра формы арганізацыі духоўнай адукацыі і метады маральнага выхаваньня, якія выкарыстоўваліся ў Менскай Духоўнай Семінарыі ў розныя перыяды яе гісторыі.

Ужо з часу свайго зацьвярджэньня ў Слуцку ў 1785 г. "Дабрачынная Семінарыя Праасьвяшчэньнейшага Віктара" ўсталёўвалася паводле агульнага тыпу духоўных семінарыяў Рускай Праваслаўнай Царквы і павінна была сумяшчаць у сабе курсы ніжэйшай і сярэдняй духоўнай школы, пачынаючы простай пісьменнасьцю і заканчваючы вышэйшымі багаслоўскімі навукамі. Канчатковае фармаванне Семінарыі бало завершана толькі з адкрыцьцём вышэйшых класаў — у 1803 годзе — філасофскага, а ў 1806 годзе — багаслоўскага. Такім чынам, яна набыла выгляд "поўнай" Семінарыі з усімі васьмю класамі, якія ішлі ў такім парадку: "расійскі" клас быў адчынены ў Семінарыі згодна з распараджэньнем Праасвяшчэннага Іова (Пацёмкін, 1797 г.) і прызначаўся для навучаньня казённакоштных выхаванцаў з ліку духоўнага званьня рускаму і польскаму чытаньню і пісьму. З наступнага класа пачыналася навучаньне пачаткам лацінскай мовы, што ўласна звалася інфарматорыяй. Гэтыя два ніжэйшыя класы лічыліся "запраўнымі", г. зн. падрыхтоўчымі. Выкладаньне ў іх вялі вучні сярэдніх і вышэйшых класаў: у расійскім класе — вучні рыторыкі, у класе інфарматорыі — студэнты філасофіі і багаслоўя. У 1803 годзе згодна асобым сінадальным праектам "расійскі" клас быў ператвораны ў так званую рускую школу з пяцігадовым тэрмінам навучаньня. Класічныя мовы ў ёй не вывучаліся, а выкладаньне вялося на адной "прыроднай" мове. Выпускнікі "рускай школы" вызначаліся на студэнцкія месцы і на пасады настаўнікаў прыходскіх школаў, якія паўсюдна тады засноўваліся. Пры рэктары архімандрыце Лазары (1796-1819 г.) такая "руская школа", укамплектаваная вучнямі граматычнага класа, "не здольнымі да працягу вышэйшых навукаў на лацінскай мове", была ўтворана і пры Менскай Духоўнай Семінарыі.

У 1817 г. унутранае ўладкаваньне Семінарыі падлягала істотнаму пераўтварэньню ў сувязі з правядзеньнем ў жыцьцё рэформы духоўнай школы, распрацаванай Камісіяй Духоўных вучэльняў у 1803 г. Мэтаю рэформы было пазбаўленьне недахопаў духоўнай школы, якія ішлі з папярэдняга стагодзьдзя: адсутнасць дакладнага кіраўнічага пачатку жыцьця школы ў форме пэўнага статута, панаваньне латыні, пераважаньне фармалізму і схаластычных метадаў навучаньня, нарэшце — матэрыяльная незабясьпечанасьць школы. Семінарыя была падзелена на тры навучальныя ўстановы: прыходскае вучылішча, якое ўключала два пачатковыя класы, павятовае вучылішча з вышэйшага і ніжэйшага граматычнага класаў і ўласна Семінарыю, дзеленую на ніжэйшае, сярэдняе і вышэйшае адзьдзяленьне.

Семінарыя атрымала тып выключна сярэдняй навучальнай установы. Ад яе настаўнікаў патрабавалася акадэмічная адукацыя. Гэта былі галоўным чынам выпускнікі Кіеўскай Духоўнай Акадэміі, да якой у парадку кіраваньня была прыпісана Менская Духоўная Семінарыя, якая ўваходзіла ў Кіеўскую навучальную акругу. Традыцыя беларускай школы, такім чынам, захавала сваю бесперапынную пераемнасьць. Гэта, аднак, не перашкаджала ўвядзеньню новых прынцыпаў навучаньня, якія натхняльнікі рэформы — архіепіскап

Феафілат (Русанаў) і М.М.Спяранскі супрацьпастаўлялі старой схаластычнай сістэме. Галоўная ўвага адводзілася не механічнаму запамінаньню навучальнага матэрыялу, а яго свабоднаму творчаму засваеньню, раскрыцьцю ўласных разумовых сіл.

На працягу першых 47 гадоў пасьля свайго афіцыйнага заснаваньня ў якасьці Менскай епархіяльнай Семінарыі наша духоўная школа заставалася ў Слуцку ў некалькіх старых драўляных будынках, якія знаходзіліся ў трох розных пунктах, значна аддаленых адзін ад аднаго. Між тым, ужо ў 1826 г. колькасьць семінарыстаў узрасла да 198 чалавек, а ў 1830 годзе дасягнула 225 навучэнцаў (3). Пры такой колькасьці навучэнцаў семінарскія будынкі не маглі зьмясьціць і паловы агульнай колькасьці. Акрамя цеснаты выхаванцы мелі яшчэ надзвычай беднае харчаваньне, сьціплую вопратку з-за недастатковага фінансавага забесьпячэньня, якое выдзялялася на іх утрыманьне.

Матэрыяльны побыт семінарыі значна палепшыўся пасьля перамяшчэньня ў Менск, дзе яна ўрачыста пачала 1840-41 навучальны год у новым спецыяльна пабудаваным для яе будынку. Гэтая падзея супала з пачаткам новай рэформы навучальнай часткі духоўных семінарыяў, задачай якой было надаць ёй накірунак адпаведны патрэбам сельскіх прыходжанаў. З гэтай мэтаю выкладаньне ўсіх прадметаў курса было загадана весці на рускай мове. Філасофія з праграмы выключалася, затое асаблівае значэньне надавалася пастырскаму і субяседнаму багаслоўю. Было ўведзена выкладаньне новых прадметаў — натуральнай гісторыі, медыцыны і сельскай гаспадаркі. Усё гэта паводле афіцыйнага тлумачэньня Духоўна-навучальннага Упраўленьня, было прызначана для таго, "каб выхаванцы пры грунтоўным вывучэньні багаслоўскіх навукаў, былі здольныя спускацца да паняцьцяў простага народа... гутарыць з ім пра выратавальныя ісьціны веры мовай простай і даступнай... і атрымлівалі такія веды, якія маглі б з карысьцю ўжываць у сельскім побыце, садзейнічаць дабрабыту сваіх прыходжанаў і набывалі б тым больш сродкаў для маральнага ўзьдзеяньня на гэты важнейшы па шматлікасьці клас народанасельніцтва".(4).

Рэформа 1840 г. была паводле свайго духу кансерватыўнай. Што да вышэйшага звяна сістэмы духоўнай адукацыі, то зьдзейсьненыя захады нават садзейнічалі некатораму паніжэньню культурна-адукацыйнага ўзроўню. Аднак для Семінарыі, як школы практычнага пастырства, вынікі гэтай рэформы былі пераважна станоўчымі. У поўнай меры гэта датычыцца і Менскай Духоўнай Семінарыі. Пасьля 1840 года ў сьценах яе падрыхтавана было некалькі пакаленьняў пастыраў, на долю якіх выпала ажыцьцявіць у літаральным сэньсе подзьвіг сьцьвярджэньня беларускага народа ў Праваслаўі.

За 240 гадоў уніяцтва давяло шырокую масу беларускага сельскага насельніцтва да стану поўнай рэлігійнай непісьменнасьці, да страты асэнсаванага веданьня малітвы Гасподняй. Ад пастыраў Праваслаўнай Царквы, якія выходзілі са сьцен духоўнай школы, патрабавалася настойлівая праца, цярпеньне і высокая самаахвярнасьць. "Гэта былі сьціплыя, але карысныя сьвяцільнікі веры, якія гарэлі і сьвяцілі на ўсім абшары Менскай епархіі... Імёны іх невядомыя, але плён іх дзейнасьці застаецца... Наш цёмны народ усім, што ў сабе мае хрысьціянскага і маральнага, галоўным чынам абавязаны сваім царкоўным

настаўнікам, добрым пастырам", — пісаў прафесар Менскай Духоўнай Семінарыі царкоўны гісторык М.Вержбаловіч (5).

Перыяд пасьля 1840 года адзначаны таксама ўзвышэньнем навуковага ўзроўню Семінарыі. У 1848 годзе была завершана сур'ёзная праца па выданьні "Збору старажытных грамат і актаў гарадоў, манастыроў і цэркваў Менскай губерніі", пад рэдакцыяй рэктара Семінарыі архімандрыта Геласія. У 1864 годзе было выдадзена складзенае іншым рэктарам Семінарыі, архімандрытам Мікалаем "Гісторыка-статыстычнае апісаньне Менскай епархіі". Юстын Здановіч, які на працягу 30-ці гадоў нязьменна выкладаў у Семінарыі прыродную гісторыю і сельскую гаспадарку, быў аматарам шматлікіх вучоных прац з агранаміі і стваральнікам бліскучага збору навучальных дапаможнікаў і калекцый па сваім прадмеце.

Новае пераўтварэньне арганізацыі навучальнага і выхаваўчага працэсу звязана з эпохай рэформаў імператара Аляксандра II. Статут Духоўных Семінарый 1867 года прадугледжваў новы парадак арганізацыі ўнутранага ўпраўленьня Семінарыяй. Ён стварыў умовы для ператварэньня штату настаўнікаў ў карпарацыю духоўнай школы, што павінна было садзейнічаць пазбаўленню казёншчыны і выхаваньню ў семінарскім педагагічным асяродзьдзі духу праваслаўнай саборнасьці. Згодна са статутам надзвычай важная роля ў кіраўніцтве семінарыі належала яе Праўленьню і Педагагічнаму сходу. Кандыдаты на пасаду рэктара, інсьпектара, членаў праўленьня і выкладчыкаў выбіраліся галасаваньнем на педагагічным сходзе, у якім ўдзельнічалі ўсе выкладчыкі, акрамя тых, што служылі па найму. Праўленьне Семінарыі, якое складалася з рэктара, інсьпектара і дзесяці членаў, абраных ад карпарацыі і ад сходу епархіяльнага духавенства, мела прадметам сваіх заняткаў распрацоўку навучальнага раскладу, разгляд пытаньняў пра ўнясеньне зьмен у праграму, складаньне правілаў пра дысцыплінарныя пакараньні, вынаходжаньне агульных мер да аховы і зацьвярджэньня добрай маральнасьці, разгляд гадавой справаздачы рэктара па навучальнай і маральна-выхаваўчай частцы.

Статут надаваў асаблівае значэньне выхаваньню жывога духа сапраўднай шчырай царкоўнасьці і свядомай маральнай дысцыпліны. "Выхавальнікі і выкладчыкі, — гаварылася ў ім, — не выходзячы з кола сваіх абавязкаў, клапоцяцца пра тое, каб разьвіваць і ўмацоўваць у навучэнцах любоў і павагу да Праваслаўнай Царквы, яе статута, свяшчэннадзеяньняў і абрадаў, сьцьвердзіць іх у добрых хрысьціянскіх навыках і прывесьці да жывога ўсьведамленьня важнасьці свяшчэнства" (6).

Правілы паводзін для выхаванцаў прадугледжвалі прысутнасьць на богаслужэньнях, сталы ўдзел у дабрачынных практыкаваньнях. Пры гэтым статут прадпісваў выхавальнікам усямерна клапаціцца пра тое, каб гэта далучэньне да малітоўна-літургічнага жыцьця Царквы адбывалася нязмушана і сьвядома. Меры выпраўляльнага характару ў адносінах да выхаванцаў павінны былі выбірацца Праўленьнем Семінарыі са строгай "разборлівасьцю, заўсёды суадносячыся з узростам, першапачатковым выхаваньнем і характарам вінаватых і не павінны быць грубымі і прыніжальнымі"(7).

Паводле звестак Вучэбнага Камітэту ў 6-ці класах Менскай Духоўнай

Семінарыі на 1867 г. навучалася 158 выхаванцаў.

У лік навучальных прадметаў у гэты час былі ўведзены ў чацьвёртым класе псіхалогія і агляд філасофскіх вучэньняў, у пятым і шостым — педагогіка. Факультатыўна выкладаліся старажытнаяўрэйская мова і іконамаляваньне.

Перыяд дзеяньня статута (1867-1884 г.) быў часам росквіту рускай праваслаўнай рэлігійнай адукацыі. Якраз ў гэтыя гады са сьценаў Менскай Духоўнай Семінарыі выйшлі выхаванцы, якія сталі выдатнымі царкоўнымі вучонымі, пастарамі і адміністратарамі.

Ужо з пачатку 50-х гадоў карпарацыя Семінарыі стала пастаянна папаўняцца новымі членамі з ліку былых выхаванцаў. Сярод іх мы бачым нямала бліскучых выкладчыкаў і вядомых царкоўных вучоных. Сярод іх інспектар Семінарыі, выкладчык філасофіі і царкоўнай гісторыі сапраўдны стацкі саветнік Ф.Стаўровіч, сакратар Праўлення Семінарыі, выкладчык логікі і псіхалогіі, калежскі прафесар П.Малевіч, выкладчык філасофскіх навук, протаіерэй Павел Сулкоўскі, выкладчык па класу Сьв. Пісаньня і бібліятэкар Заусцінскі, які быў выдатным беларускім краязнаўцам, аўтар аднаго з першых падручнікаў логікі на рускай мове протаіерэй Іаан Гашкевіч, выкладчыкі М.Еліноўскі і А.Гарбацэвіч, І.Пегулевіч і шэраг іншых. Славаю і гонарам Менскай Духоўнай Семінарыі быў выпускнік 1849 года прафесар Кіеўскай Духоўнай Акадэміі, які на працягу 43 гадоў узначальваў кафедру рускай царкоўнай гісторыі, доктар багаслоўя Іван Ігнатавіч Малышэўскі. Яму належаць капітальныя даследаваньні па гісторыі Старажытнай Царквы, па Кірыла-Міфодзьеўскай тэматыцы, па гісторыі Рускай Царквы Кіеўскага перыяду і па царкоўнай і грамадзянскай гісторыі Беларусі. Ва ўсіх сваіх працах вучоны паўстае паслядоўным прыхільнікам агульнаславянскага культурнага адзінства.

Семінарыя з поўным правам можа ганарыцца і цэлай плеядаю сваіх выхаванцаў, якія сталі вядомымі дзеячамі сьвецкай навукі — інсьпектарам Варшаўскага універсітэта А.Саланевічам, прафесарам С.-Пецярбургскай Ваенна-медыцынскай Акадэміі Ф.Пастарнацкім, вучоным-кітаязнаўцам Іпалітам Гашкевічам, які скончыў сваю службовую кар'еру ў званьні дырэктара Азіяцкага дэпартамента МЗС Расіі.

У 1884 годзе быў уведзены новы статут Праваслаўных Духоўных Семінарыяў, распрацоўка якога ўваходзіла ў сістэму ахоўных мераў.

У духоўных школах была ўзмоцнена ўлада епархіяльных архірэяў, зусім адмяняўся выбарны пачатак. Дысцыплінарна-выпраўляльныя меры сталі больш жорсткімі.

Аднак рэлігійна-ахоўныя меры Г.К.Пабеданосцава атрымаліся не надта пасьпяховымі. Адміністратары, што праводзілі іх ў жыцьцё, часта звярталі асноўную ўвагу на фармальны бок рэлігійнага выхаваньня, забываючы пра дух і пагарджаючы сапраўднымі яго прынцыпамі - сьвядомасьцю і нязмушанасьцю. Прытрыманьне сьвятых статутаў Праваслаўнай Царквы пад надакучлівым дробязным кантролем адміністрацыі стала ўспрымацца як сумная і цяжкая павіннасьць.

Паводле апісаньняў сучасьнікаў, "выпадкі, калі семінарысты ратуюцца" ад набажэнстваў і малітваў на падстрэшшах, у шафах і іншых цёмных, брудных,

але патаемных куточках, набываюць у семінарскім побыце звычайную зьяву і ані не зьдзіўляюць семінарскіх выхавальнікаў, якія час ад часу ладзяць паляваньні і аблавы на такіх аматараў "адасабленьня і келейнай малітвы", атрымліваючы часта ва ўзнагароду за рэўнасць вядро памыяў на галаву ці ўдар швабрай па фізіяноміі" (8).

Мацней за ўсё адбіваўся на стане духоўнай адукацыі не саслоўны характар, які даўно не адпавядаў надзённым патрэбам царкоўнага жыцця. Не было строгай адпаведнасьці рыхтаваных да пастырства маладых людзей тым патрабаваньням, якія прад'яўляла жыцьцё царкоўнае. Як пісаў архіепіскап Дзьмітрый (Муратаў): "Нецаркоўныя і часта прама нігілістычныя настроі ўносілі ў Семінарыі тыя выхадцы з духоўных сем'яў, хто вучыўся ў іх не таму, што хацеў прысьвяціць сябе пастырскаму служэнню, а таму, што ў Семінарыях, у адрозненьне ад гімназій, адукацыя для іх была бясплатнаю" (9).

У пачатку XX ст., асабліва ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг., гэтыя нецаркоўныя настроі выліліся ў адкрытыя беспарадкі і бунты.

Выхаванцы трыццаці з пяцідзесяці Семінарый Рускай Царквы прынялі ўдзел у стварэнні Усерасійскага Саюза Семінарыстаў, на з'ездзе якога ў Маскве 1906 г. падтрымалі рэвалюцыйную праграму крайняга крыла сацыял-дэмакратыі, якое ўзначальваў Парвус і Троіцкі.

Усё гэта прымусіла Сьвяцейшы Сінод прыступіць да распрацоўкі новай рэформы духоўнай школы, галоўнай мэтай якой было зрабіць яе агульна-саслоўнай, пераадольваць адарванасьць яе, у сілу саслоўнай замкнёнасці ад жыцця і зрабіць здольнай аказваць дзейны хрысціянскі ўплыў на грамадства. На старонках царкоўнага друку абмяркоўваліся разнастайныя праекты такой рэформы. Адзін з іх быў прадстаўлены выкладчыкам Менскай Духоўнай Семінарыі Дз. Скрынчанкам (10).

У ім меркавалася духоўныя вучылішчы і першыя класы Семінарый пераўтварыць у духоўныя гімназіі паводле тыпу "рэальных і класічных" навучальных установаў, але з большым акцэнтам на філасофскія і багаслоўскія прадметы. Духоўныя Семінарыі ператварыць у сьпецыяльныя царкоўна-багаслоўскія вучылішчы з трохгадовым курсам. Адбор навучэнцаў у гэтыя школя павінен рабіцца на падставе ацэнкі адукацыйнай падрыхтоўкі і наяўнасьці прызваньня да царкоўнага служэньня.

Пытаньне пра рэформу духоўнай адукацыі зрабілася прадметам, на якім сканцэнтравалася асаблівая ўвага перадсаборнага руху 1905-1917 гг., а пасля Памеснага Сабора 1917-1918 гг.

Аднак праектам пераўтварэньня духоўнай школы не суджана было ажыцьцявіцца. Перашкодзіла гэтаму грандыёзная катастрофа, якая спасьцігла нашу Айчыну ў 1917 г.

Менш чым праз год пасля Кастрычніцкага пераваротy ўсе духоўныя школы, якія знаходзіліся на кантраляванай камуністамі тэрыторыі, былі зачынены. Гэты лёс напаткаў і Менскую Духоўную Семінарыю. Аднак традыцыя беларускай праваслаўнай духоўнай школы не была канчаткова зьнішчана. Яе працягвала Літоўская Духоўная семінарыя, разьмешчаная ў Віленскім Сьвята-Троіцкім манастыры.

Складаныя ўмовы, у якія была пастаўлена Праваслаўная Царква на тэрыторыі Польскай дзяржавы, прымусілі сьвяшчэннаначальле вярнуцца да прынцыпу зьяднаньня ў семінарскай праграме ніжэйшай і сярэдняй ступеняў школьнага навучаньня і сумяшчэньня агульнаадукацыйных і царкоўна-багаслоўскіх дысцыплін. Нягледзячы на гэтае вымушанае вяртаньне да састарэлых формаў арганізацыі, Віленская Семінарыя была моцнай пастарскай школаю, якая падрыхтавала ў 30-я гады цудоўныя кадры беларускіх праваслаўных сьвятароў.

У 1945 годзе ў сценах Сьв. Успенскага Жыровіцкага манастыра ўзнікла новая беларуская праваслаўная духоўная школа, якая стала праваераемніцай Менскай Духоўнай Семінарыі.

Праграма новай Менскай Духоўнай Семінарыі ў першы перыяд гісторыі яе знаходжання ў Жыровіцкім манастыры, які працягваўся да 1963 года, як, зрэшты і ў другі, які пачаўся ў 1989 годзе і доўжыцца па сённяшні дзень, пабудавана на прынцыпах, распрацаваных Вучэбным Камітэтам пры Сьвяшчэнным Сінодзе і Рускай Праваслаўнай Царквой у 40-я гады. У той час асабліва важна было знайсьці аптымальную форму для сістэмы багаслоўскай адукацыі, якая, з аднаго боку, адпавядала б патрэбам Царквы ў значнай колькасьці падрыхтаваных пастараў, а з другога — улічвала б асаблівасьці кантынгенту навучэнцаў, характэрная для быцьця Праваслаўнай Царквы ў атэістычнай дзяржаве. Найбольшую цяжкасьць уяўляла амаль поўная багаслоўская непадрыхтаванасьць тых, хто імкнуўся паступіць у лік навучэнцаў Семінарыі. Акрамя агульнай адукацыі, цалкам адасобленай ад рэлігійнасьці і да таго ж даволі нізкай якасьці, якая давалася ў савецкай школе, жадаючыя паступіць часам не маюць нічога, акрамя жаданьня служыць Богу ў сьвяшчэнным сане.

Між тым, багаслоўская навука патрабуе грунтоўнай пачатковай падрыхтоўкі, магчымай толькі пры наяўнасьці рэлігійнага выхаваньня ў дзяцінстве.

Каб неяк кампенсаваць гэты недахоп, першы год чатырохгадовай праграмы навучаньня прызначаўся для прапедэўтыкі.

У гэты час навучэнцы павінны засвоіць змест Сьв. Пісання, аснову веравучэньня і багаслоўскага статута Праваслаўнай Царквы, авалодаць багаслоўскай мовай. Пры гэтым вытрыманая ў духу строгай царкоўнасьці сістэма духоўнага выхаваньня павінна была садзейнічаць уцаркаўленьню выхаванцаў. Наступныя тры "багаслоўскія" класы даюць семінарыстам падрыхтоўку, неабходную для пастарскай дзейнасці.

Менская Духоўная Семінарыя перыяду 1945-1963 гг. была моцнай духоўнай школай, якая выхавала не толькі цудоўна падрыхтаваных пастараў для Менска-Беларускай епархіі і ўсёй Рускай Царквы, але і выгадавала значных праваслаўных царкоўных вучоных нашага часу.

У час антырэлігійнай кампаніі 1959-1964 гг. Менская Духоўная Семінарыя была ў 1963 годзе зачынена з нібыта "адсутнасьці жадаючых вучыцца" і толькі ў 1989 г. узніклі зьнешнія ўмовы для адкрыцьця Беларускай Духоўнай школы зноў. Амаль з першых дзён існаваньня Менскай Духоўнай Семінарыі пасьля яе адраджэньня паўстала пытаньне пра неабходнасьць унясеньня ў

Першы дзень новага навучальнага года ў Менскай Духоўнай Семінарыі
Фота Я.Пясецкага

арганізацыю і навучальную праграму школы зьмен, якія б памаглі прывесьці яе ў адпаведнасьць з новымі патрабаваньнямі царкоўнага і рэлігійна-грамадскага жыцьця. Адным з найважнейшых сярод іх зьяўляецца павышэньне ўзроўню багаслоўска-пастарскай адукацыі, якога неадкладна патрабуюць задачы унутранай місіі і інтарэсы абароны Праваслаўя ва ўмовах іншаслаўнай празелітычнай экспансіі.

Вельмі значным крокам на гэтым шляху была распрацоўка новых удасканаленых навучальных праграм. Гэтую працу ўвянчала рашэньне Сьвяцейшага Патрыярха Алексія II і Сьвяшчэннага Сінода Рускай Праваслаўнай Царквы аб наданьні Менскай Духоўнай Семінарыі статуса вышэйшай духоўнай навучальнай установы з пяцігадовай праграмай навучаньня, прынятай вясной 1991 года. Захоўваючы прапедэўтычны характар навучаньня на пачатковым курсе, Семінарыя ў той жа час здолела істотна пашырыць сьпіс багаслоўскіх, царкоўна-гістарычных і царкоўна-практычных дысцыплін, якія вывучаюцца на старэйшых курсах, і павялічыць колькасць адведзеных на іх навучальных гадзін.

Вынікам самастойнай даследчай працы выхаванцаў Семінарыі павінна зьявіцца дыпломная праца.

Цяперашні навучальны год будзе годам першага выпуску адроджанай Менскай Духоўнай Семінарыі. Упершыню ў гісторыі нашай духоўнай адукацыі выпускнікі Семінарыі пасля абароны дыпломных прац атрымаюць дыпломы, раўнацэнныя дыпломам сьвецкіх вышэйшых навучальных устаноў.

Усьведамленьне таго, што адроджаная з небыцьця духоўная школа ў кароткі тэрмін дасягнула посьпехаў, не можа не выклікаць радасьці. Аднак гэтае пачуцьцё не павінна прыводзіць нас да забыцьця таго, што агульны сёньняшні стан нашай духоўнай адукацыі далёка не ідэальны, і ў жыцьці нашай школы гэта праяўляецца самым непасрэдным чынам.

Строй духоўнай адукацыі, у тым выглядзе, у якім ён склаўся ў канцы 40-х гадоў і праіснаваў без асаблівых зьмен дагэтуль, далёка не адпавядае патрабаваньням царкоўнага і грамадскага жыцьця сёньняшняга дня. Перш за ўсё да цяперашняга часу не існуе ўнутранага статута і правілаў, якія вызначалі б абавязкі і правы службовых асобаў і характар іх узаемаадносін з карпарацыяй школы, паўнамоцтвы Праўленьня і педагагічнага Савета, агульнай асновай арганізацыі навучальнага і выканаўчага працэсу.

Між тым, вопыт гісторыі праваслаўнай адукацыі, вопыт разгледжанай намі гісторыі нашай духоўнай школы выразна паказвае, якое важнае значэньне мае структура яго арганізацыі ва ўсім царкоўным жыцьці. Духоўная школа непасрэдна адказвае за фармаваньне маральнай і царкоўнай сьвядомасьці сваіх выхаванцаў, за правільнае разуменьне імі духоўнага жыцця на шляху выратаваньня. Без разумнай арганізацыі, якая ўвасабляе прынцыпы сапраўды праваслаўнай царкоўнасьці, школа не можа быць на ўзроўні гэтай адказнасьці.

Будзем спадзявацца, што з Міласьці Божай наша Семінарыя напярэдадні трэцяга стагодзьдзя сваёй гісторыі здолее пайсьці па шляху далейшага ўдасканаленьня сродкаў адукацыі і ўмоў школьнага жыцьця, працягваючы

сьвятую справу падрыхтоўкі сапраўдных і верных Пастыраў статку Хрыстова.

(1). Карташев А.В. Очерки по истории Русской Церкви.Т.1.Париж, 1959, с.597.

(2). Карташев А.В. Очерки по истории Русской Церкви. Т.П, Париж, 1959, с.287-288.

(3). Вержболович М. Речь, сказанная на торжественном акте, 14 апреля 1893 г.по случаю 100-летия существования Минской Духовной Семинарии. Минские епархиальные ведомости. 1893, Н 12, с.317.

(4). Пахомов Е.М. Речь на торжественном акте 14 апреля 1895 г. Минские епархиальные ведомости. 1893, Н 13, с.345.

(5). Вержболович М.О. Указ соч. с.320.

(6). Устав Православных Духовных Семинарий "Странник", 1867, Н 8, с.537

(7). Тамсама.

(8). Труды Киевской Духовной Академии.1906, кн.89, с.725.

(9). "Богословский вестник", 1906, кн. Ш, с.173.

(10). "Минские епархиальные ведомости" 1905, Н 21, с.452-453.

Протаіерэй Георгій Латушка

ЦАРКОЎНЫ ПРЫХОД ЯК НОСЬБІТ І ЗАХАВАЛЬНІК ПРАВАСЛАЎНАЙ ТРАДЫЦЫІ

(Прывітальнае слова на ўрачыстым Акце, прысвечаным 200-годзьдзю Менскай Епархіі)

Пахвалы і добразычлівыя пажаданьні вельмі адпавядаюць урачыстасьці моманту. Але жыцьцё ўздымае і праблемы, для вырашэньня якіх патрабуецца неадкладнае асэнсаваньне іх і дзейнасьць.

З усяго мноства прыходскіх праблемаў — адна бачыцца асабліва істотнай. З аднаго боку, колькасьць прыходаў і саміх прыхаджанаў хутка ўзрастае, дзякуючы легалізацыі рэлігійнага жыцьця і закладзеных у душы чалавечай духоўных патрэбаў, якія, як мы бачым, аказаліся невынішчальнымі. З другога боку ўзьнікае небясьпека спаду, зьніжэньня духоўнага ўзроўню ў прыходскім жыцьці. На жаль, гэтая зьява ўжо не тэарэтычная, яна мае месца ў шэрагу прыходаў. Міжволі згадваюцца словы Евангельля: "калі ж соль страціць сілу, дык чым асоліш яе? Яна ўжо ні на што не прыгодная". /Мф. 5,13/ А людзі, як і ўсё стварэньне Божае чакае вызваленьня "з няволі тленьня на волю славы дзяцей Божых" /Рым. 8,21/. Наш народ з вялікай надзеяй скіроўвае погляд да Царквы і чакае дапамогі ў вырашэньні духоўных, культурных і грамадскіх праблемаў. Аб гэтым сьведчаць сацыялагічныя досьледы.

Але тут узьнікае памылковае ўяўленьне, вельмі пашыранае неразуменьне. Царкву ўспрымаюць адасоблена ад прыходаў і прыхаджанаў, якія яднаюцца вакол пэўнага храма з паўнатой літургічнага і кананічнага жыцьця. Адны памылкова ўяўляюць Царкву чымсьці абстрактным, не канкрэтным, не

акрэсьленым, іншыя мяркуюць, што Царкву ўяўляе сабой Епархіяльнае Упраўленьне ці пэўная група духавенства. У Вызнаньні Усходніх Патрыярхаў гаворыцца: "Народ — захавальнік веры"! Таксама справядліва і другое сьцьвярджэньне: "Без епіскапа няма Царквы".

Дазвольце мне для лепшай нагляднасьці прывесьці наступны вобраз. Праваслаўная Царква мысьліцца як адзіны і едны арганізм, а арганізм складаецца з клетак, якія маюць сваю пэўную структуру і функцыі. Але кожная клетачка ў сваіх генах мае поўную інфармацыю пра ўвесь арганізм, а праз гэта мае і паўнату жыцьця ў гэтым арганізьме. Падобна і прыходы, як клетачкі, складаюць арганізм епархіі /епіскапіі/, якая, згодна з праваслаўным вучэньнем, зьяўляецца памеснай царквою і мае паўнату ўсяленскага Праваслаўя. У сваю чаргу, якраз у злучнасьці епархіяў зьдзяйсьняецца кафалічнасьць, саборнасьць Праваслаўя. Гэта мы сьцвярджаем, паводле вучэньня сьвятога апостала Паўла аб Царкве.

Мноства органаў і клетачак маюць розныя прызначэньні, але ўсе яны зьвязаны агульным і зладжаным жыцьцём арганізма. Здараецца так, што генетычны механізм парушаецца, клетка пачынае жыць, дзяліцца не суладна, не ў адпаведнасьці са сваім прызначэньнем, па-свойму, — у выніку ўзьнікае ракавая пухліна, рак...

Таму так важна цяпер, каб прыходскія абшчыны асабліва рупіліся пра захаваньне ў непарушнасьці праваслаўнай традыцыі - гэтай генетычнай памяці, спадчыны — у новых умовах, пры вялікай колькасьці новых прыходаў з новымі людзьмі. Неабходна старанна вывучаць і захоўваць праваслаўнае веравызнаньне, прыгажосьць і дасканаласьць літургічнага жыцьця, таінствы, якія асьвячаюць і ўмацоўваюць нас, кіруючыся пры гэтым канонамі і правіламі Царквы.

Праз пасьлядоўнае зьдзяйсьненьне Веры і Царкоўнага Паданьня — бачыцца вырашэньне азначанай праблемы. Ад прыходаў-клетачак залежыць як хвароба арганізма, так і ягонае здароўе. Да сур'ёзных, адказных адносінаў у арганізацыі прыходскага жыцьця абавязвае нас і цяперашні час, і сьвяточныя юбілеі: пачатак другога тысячагодзьдзя сьвятога Праваслаўя на Беларусі і надыход трэцяга стагодзьдзя існаваньня Мінскай Епархіі.

ПОВЯЗЬ ЧЯСОЎ



З настаяцелем Богаяўленскага Патрыяршага сабора ў Маскве намесьнікам старшыні Адзьдзела Зьнешніх Царкоўных Зносінаў Рускай Праваслаўнай Царквы протапрасьвітарам Віталіем Баравым мы сустракаліся на працягу мінулага года некалькі разоў. Айцец Віталій, беларус па паходжаньні з-пад Оршы, які, нягледзячы на тое, што большая частка яго жыцьця і дзейнасьці прайшла за межамі Беларусі, сэрцам застаецца шчырым беларусам, захоўвае неаслабную цікавасьць да гістарычна-культурнай мінуўшчыны Беларусі і, разам з тым, чуйна назірае за сучасным працэсам аднаўленьня праваслаўнай, моўнай, культурнай традыцыяў у іх лучнасьці і ўзаемаўплыве ў агульным рэчышчы станаўленьня беларускай традыцыі. Размовы і выступленьні а.Віталія, якія і паслужылі асноваю гэтага публіцыстычнага матэрыялу, прасякнутыя роздумам і клопатам пра будучыню Беларусі ў кантэксьце яе тысячагадовай праваслаўнай традыцыі. У свой час а.Віталій скончыў Віленскую Духоўную Семінарыю, потым багаслоўскі факультэт Варшаўскага ўніверсітэта, выкладаў у Маскоўскай Духоўнай Акадэміі, доўгі час быў прадстаўніком Рускай Праваслаўнай Царквы ў Сусьветным Савеце Цэркваў у Жэневе. Таму яго багаты жыцьцёвы, сьвятарскі і духоўны вопыт вельмі карысны нам, можа папярэдзіць нас ад шматлікіх памылак, скіраваць нашую дзейнасьць у стваральнае рэчышча на карысьць Сьвятога Праваслаўя.

Безумоўна, Царква на Беларусі павінна быць беларускаю. Прычым пад "беларускасьцю" Царквы я разумею якраз яе "рускасьць". Але "рускасьць" гэта не "маскоўскасьць", "рускасьць" не "велікарускасьць", не "сёняшняя рускасьць". А тое, што Царква не павінна адарвацца ад сваіх каранёў, якія ідуць з часоў Полацкага княства. Прабачце, але гэта рускія карані. Слова "рускі" - наогул няшчаснае слова. Яно адразу выклікае асацыяцыю з маскоўскім, расійскім. Але сапраўдныя рускія гэта мы з вамі. Калі вы беларусы, то вы і ёсьць сапраўдныя рускія. А сёняшняя Расія - гэта этнічны розьвітак той беларуска-украінскай Русі на маскоўскіх землях. Гэта вынік таго, што рускае насельніцтва Украіны і Беларусі гістарычна перасунулася на новую тэрыторыю,

зьмяшалася з угра-цюрка-мангольскім элементам, стварыла вялікую этнічную групу, вялікую краіну, якая стала звацца Расіяй. А вось Вялікае Княства Літоўскае— гэта этнічна-руская дзяржава, і афіцыйная мова ў ім была руская. Таму калі я кажу: трэба, каб Царква стала рускай, — я маю на ўвазе тое, што Царква павінна застацца вернай царкоўнай традыцыі той беларускай Русі, а зусім не люстэркам маскоўскай Русі. Народ маскоўскай Русі, гэта братні народ, братняя мова. Украіна, Беларусь, Расія выйшлі з аднаго кораня, але разьвіліся ў тры зусім самастойныя народы, са сваёй адметнай этнічнай сьвядомасьцю, культурай, мовай. І беларуская Царква павінна гэта адлюстроўваць.

Разам з тым, існуе страшная небясьпека адарваць беларушчыну ад мінулага і ствараць новую беларушчыну на падставе цяперашняга, дзе праваслаўе разглядаецца як занесеная з Масквы вера, а не вера нашага народа, якая была адвеку. Якраз таму Праваслаўе на Беларусі павінна зрабіцца беларускім Праваслаўем, Праваслаўная Царква на Беларусі быць беларускай, каб моцна трымацца за свае карані. І змагацца з тэндэнцыяй адрыву і стварэньня новай Беларусі на падставе ідэі нацдэмаўскай (гэта не ў гістарычным, а ў дрэнным сэнсе гэтага слова), дзе не ўлічваецца мінулае, а пераважвае ўсё, што далей ад рускага. Такая тэндэнцыя прасочваецца, напрыклад, калі пры стварэньні і распрацоўцы беларускай культурнай тэрміналогіі імкнуцца любымі сродкамі, часам абсалютна штучна, знаходзіць словы, якія б былі як мага далей ад рускіх. Гэта хваравітая зьява. Трэба вяртацца да сваіх каранёў — Полацкага княства, Вялікага княства Літоўскага. Тады і вяртаньне да беларускасьці будзе натуральным, бо нашая беларуская мова і ёсьць мова таго народа, які называў сябе калісьці рускім.

Апрача таго, існуе і іншая тэндэнцыя абгрунтаваць адарванасьць Праваслаўя ад гістарычных і нацыянальных каранёў. Робіцца гэта на падставе таго факту, што беларускае адраджэньне, якое пачалося ў другой палове XIX ст. сярод шляхціцаў, было па сутнасьці польска-каталіцкім. Прычым заўважаюць тут толькі сам факт таго, што католікі пачалі ўсьведамляць сябе беларусамі, і ставяць гэта ва ўпіку праваслаўным. Так, беларускае адраджэньне пачалося якраз у асяродзьдзі шляхціцаў, польскіх па сваёй сьвядомасьці, але этнічна настолькі беларусаў, што на падставе фальклору яны пачалі паступова атаясамляць сябе са сваім беларускім народам. Праваслаўныя ж былі больш русіфікаванай часткай і так балюча, як католікі, яшчэ не адчувалі адрыву ад саёй этніі. І таму, што розьніца паміж беларускай мовай народа і рускай мовай інтэлігенцыі была не такая карэнная, і мова апошняй успрымалася, як літаратурная, у параўнаньні з размоўнай народнай мовай, то пераход ад народнай беларускай да літаратурнай рускай мовы як бы быў больш-менш натуральным. А вось на польскім грунце гэта ішло значна цяжэй. Бо той, хто пераходзіў ад беларускай мовы народа да польскай інтэлігенцкай, з часам адрываўся ад

каранёў, рабіўся палякам па сьвядомасьці. Натуральна, тое, што беларускае адраджэньне XIX ст.пачалося ў атмасьферы польскай каталіцкай культуры, наклала адбітак на беларускае культурнае адраджэньне, але не зьяўляецца падставай для атаясмленьня беларускай сьвядомасьці з заходняй.

* * *

Справа брацтваў, справа праваслаўнай моладзі — гэта нашая самая кроўная справа, бо гэта нашая будучыня. Я б хацеў спыніцца на двух істотных момантах у дзейнасьці брацтваў.

Першае. Брацтвы калісьці стварыліся і ўзьніклі сапраўды для абароны Царквы, у цяжкія для Царквы часы, часы ганеньняў, калі на яе націскалі сілы, што вялі наш народ да страты сваёй веры, сваёй нацыянальнасьці. І тады ў брацтва аб'ядноўваліся міране, каб супрацьстаяць гэтаму наступу і дапамагчы духавенству, дапамагчы іерархіі. Але для зьдзяйсьненьня сваёй мэты брацтва асабістым удзелам ангажавалася ў царкоўнае жыцьцё. Не было такога, каб існавалі епархіі, існавалі прыходы, а паралельна стваралася група людзей, якая заяўляла, што яна будзе абараняць Царкву і нават наглядаць, каб духавенства і іерархія дзейнічалі правільна. Не, брацтва было часткай царкоўнага жыцьця. Братчыкі ўносілі частку сваёй маёмасьці, частку сваёй дзейнасьці і свайго часу. Яны арганізоўвалі і школы, і друкарні, і выдавецтвы. Яны дзейнічалі, працавалі, але не існавалі за кошт царкоўных даходаў. Духавенства, іерархія і брацтвы павінны ўтвараць адну агульную сям'ю. І ўсе павінны ангажавацца сваім асабістым даходам, працай і часам.

І другое. Ёсьць пэўная небясьпека ў разьвіцьці брацтваў. Калі любая арганізацыя ўзьнікае самастойна, з ініцыятывы народнай, то яна часам пачынае лічыць сябе суверэнна- аўтакефальна-незалежнай. І калі яна ўзьнікае для дапамогі Царкве, а потым сутыкаецца са структурамі царкоўнымі, то жывучы ўжо ў псіхалогіі сваёй незалежнасьці і самакаштоўнасьці, яна часам мае жаданьнне нават павучыць іерархію і духавенства, як трэба дзейнічаць. Гэта можа прывесьці да канфлікту паміж іерархіяй і новаўтворанай арганізацыяй.

Пра каталіцкую царкву можна казаць што хочаце, але вопыт паказаў, што гэтая царква ўмее арганізаваць сваё царкоўнае жыцьцё. У каталіцкай царкве немагчыма нават на хвіліну ўзьнікненьне якой-небудзь царкоўнай арганізацыі, каб адразу ж іерархія, духавенства не ўвайшло ў супрацоўніцтва з гэтай арганізацыяй, каб не ўзяло гэтую арганізацыю пад сваю духоўную апеку. Тады толькі пачынаецца правільнае ўзаемадзеяньне паміж новай арганізацыяй, народнай ініцыятывай, якую можна толькі вітаць, і іерархіяй. Вельмі важна для брацтва, каб такое супрацоўніцтва наладзілася.

У Расіі гэты першы момант упушчаны. Брацтвы разьвіваліся, а іерархія толькі потым даведалася, што брацтвы існуюць. Гэта прывяло да сумных вынікаў, якія цяпер назіраюцца, якія могуць прывесьці да канфрантацыі ўнутры Царквы і паслужыць таму, што цалкам супярэчыць мэце, з якой утвараліся

брацтвы.

Яшчэ больш горкі вопыт прынесла унія. Брацтвы абаранялі Царкву ў тыя часы. Але была тады з боку іерархіі і брацтваў зроблена памылка. Трэба зазначыць, што іерархія ў той час была не з лепшых. Права патранату прывяло да таго, што да царкоўнай улады прыходзілі людзі недастойныя, якія сапраўды маглі быць інструментам у руках каралёў і дзяржавы. Тады брацтвы аб'ядналіся з народам у абароне Царквы. Але калі брацтвы пачалі актыўна дзейнічаць, то адчулі вялікую самастойнасьць. Больш таго. Пад час знаходжаньня ў Вялікім Княстве Літоўскім Канстанцінопальскага Патрыярха Іерэмея брацтвы зьвярнуліся да яго са скаргай на асобных іерархаў. Тады ж былі заменены многія недастойныя іерархі. Але такі кантроль і актыўнасьць з боку брацтваў шмат у чым падштурхнулі частку іерархіі скарыстаць з прапановы польскага ўрада, касьцёла і караля і пайсьці на унію з Рымам. Атрымалася найгорш і для брацтваў, і для іерархіі, і для Царквы. Атрымалася унія. Толькі пасьля таго, як грымнула бяда - унія, - пачалі складацца іншыя адносіны паміж брацтвамі і іерархіяй. Па-першае, сфармвалася новая іерархія. Па-другое, усталявалася сапраўднае супрацоўніцтва паміж брацтвамі і іерархіяй: брацтвы сталі сапраўднымі абаронцамі іерархіі, а іерархі пачалі кіраваць дзейнасьцю брацтваў, прыслухоўвацца да брацтваў. Гэтае супрацоўніцтва і дапамагло Царкве выстаяць.

Цяпер, у сучасных умовах неабходна імкнуцца да таго, каб наладзіць якраз такое ўзаемаразуменьне і супрацоўніцтва паміж духавенствам, іерархіяй і брацтвамі.

* * *

Што ж да нацыянальнага пытаньня, то яно будзе вырашана паступова: і загаворым мы на сваёй роднай мове, адродзім сваю нацыянальную культуру. Толькі гэта трэба рабіць без канфрантацыі, без уціску, без настройваньня адной групы супраць другой. Бо ад гэтага карысьць будзе толькі ворагам Беларусі і Праваслаўя. А разам мы абавязкова знойдзем шлях да сапраўднай нацыянальнай суверэннай Беларусі з нашай беларускай Праваслаўнай Царквою. Толькі трэба сумесна ісьці да гэтага.

Няхай дапаможа нам у гэтым Бог!

АРХІВЫ І ДАКУМЕНТЫ

СТАРОНКІ ЖЫЦЬЦЯ МІТРАПАЛІТА МЕЛХІСЭДЭКА.

Народ найвышэйшых іерархаў Беларускай праваслаўнай царквы, відаць, няма асобы з больш таямнічым і трагічным лёсам, чым Мітрапаліт Менскі і Беларускі Мелхісэдэк. Пакутнік за Веру і Бацькаўшчыну - такім ён захаваўся ў памяці нашчадкаў. Але аб канкрэтных падзеях з жыцьця Мітрапаліта маюцца розныя, часам процілеглыя, меркаваньні, якія ў большасьці грунтуюцца на ўспамінах сучасьнікаў. Дакументаў, якія б падцьвердзілі тое ці іншае, захавалася няшмат. Матэр'ялы, што зьберагаюцца ў архівах Беларусі, а таксама зьвесткі з літаратурных крыніцаў сьведчаць аб наступным.

Міхаіл Львовіч Паеўскі, будучы Мітрапаліт Менскі і Беларускі Мелхісэдэк, нарадзіўся ў 1878 годзе ў вёсцы Вітуліна Бельскага павета Холмскай губерні (цяпер у Польшчы). Бацька яго — Леў Сямёнавіч — у той час быў сьвятаром Міхайла - Архангельскай царквы Мельніцкай благачыннай акругі Берасьцейскай епархіі. У былыя часы царква належыла грэка-каталікам і ў другой палове XIX стагодзьдзя выглядала не надта багата са сваёй саламянаю страхой. Ды і бацькаў прыход не быў такім ужо вялікім і заможным, ахоплівaў 83 двары, у якіх жылі 410 душ.

Сям'я Паеўскіх была хоць і небагатая, але са значнымі духоўнымі здабыткамі. У першую чаргу, дзякуючы бацьку: Леў Сямёнавіч быў гарачым прыхільнікам праваслаўнай веры, любіў зямлю, на якой жыў, але ўсьведамляў сябе рускім, вернападданным імператара Расійскай імперыі. І ўсё ж-такі любоў да Бацькаўшчыны — Заходне-рускага краю — перамагла. "Паклон зямны кладзем табе, наша мілая радзіма! Калі заўсёды змрочная поўнач дарагая сібіраку толькі таму, што яна - радзіма яго, то тым даражэйшы нам наш родны шматпакутны захад! У ім, як у фокусе нашай душы, пераплятаюцца -

Мітрапаліт Менскі і Беларускі Мелхісэдэк

адыходзяць і хутка зьнікаюць - зьявы дыяметральна процілеглыя адна адной. Тут наша сіла, сіла стагодзьдзяў, моцная і непарушная сіла, хоць і схаваная ў могілках продкаў нашых, сіла трыманьня за родную веру і родную Русь! Усьведамленьнем гэтай адной сілы мы ніколі не загінем! Не загінем у жыцьці і зямным, не загінем і ў жыцьці вечным", - пісаў ён у адным з сваіх шматлікіх артыкулаў.

Дзе б ні служыў а. Леў Паеўскі — у вёсцы Шутнікі Берасьцейскага павета Гродзенскай губерні ці ў Камянцы-Літоўскім — усюды стараўся ён высьветліць гістарычнае мінулае мясьцінаў, рабіў апісаньне цэркваў, прыходаў, вывучаў і знаходзіў новыя гістарычныя дакументы. У 1903 годзе нават стаў

правамоцным сябрам Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта.

Калі маленькаму Міхасю споўніўся год, у сям'і адбылася значная падзея: "Холмско-Варшавский епархиальный вестник" зьмясьціў першы артыкул бацькі аб цэрквах Мельніцкага благачыньня. Пры канцы XIX ст. а. Леў Паеўскі быў ужо вядомым краязнаўцам. Вынікі сваёй працы ён надрукаваў у невялікіх па памеры, але зьмястоўных брашурах: "Город Брест-Литовск и его древние храмы" (1894), "О церквах Брестской капитулы в начале второй половины XVIII в. " (1887г.), "О церквах древней Брестской епархии" (1892г.), "Наши провинциальные архивы и их значение для Западно-русского края" (1894г.) і інш.

Літаратурная спадчына сьвятара Паеўскага мела таксама і выразна акрэсьлены накірунак барацьбы з распаўсюджваньнем на Беларусі ўплыву каталіцтва і ўніяцтва. Калі ўлічыць, што служыў ён у мясьцінах, дзе яшчэ параўнальна не так даўно значная колькасьць вернікаў належыла да ўніяцкай царквы, дзейнасьць, накіраваную на ўзмацненьне праваслаўя, лёгкай назваць нельга. Відаць, падчас службы а. Леў Паеўскі не аднойчы выступаў абаронцам сваёй веры: водгукі такой палемікі адчуваюцца і ў яго брашуры "Лжемученик Иосафат Кунцевич (Униатский Полоцкий архиепископ)" (1895г.).

Шматлікія публікацыі - у "Виленском вестнике", "Гродненских губернских ведомостях", "Русском паломнике" - зрабілі а. Льва Паеўскага досыць вядомым чалавекам. Ягоны кароткі жыцьцяпіс быў зьмешчаны нават у знакамітым энцыклапедычным слоўніку Бракгаўза і Эфрона.

Калі Міхасю споўнілася 12 год, бацька ад'ехаў у Маскву як правамоцны ўдзельнік VII археалагічнага зьезду. У Расійскай імперыі другой паловы XIX стагодзьдзя існавала своеасаблівая форма арганізацыі навуковай дзейнасьці - перыядычныя зьезды навукоўцаў тых ці іншых сьпецыяльнасьцяў. Браць удзел у навуковых зьездах было цікава і пачэсна: тут абмяркоўваліся вынікі дасьледваньняў, можна было азнаёміцца з тым, чым займаюцца калегі, наведаць шматлікія выставы. Відаць, досьледы Паеўскага атрымалі высокую адзнаку сяброў Аргкамітэта археалагічных зьездаў, бо ён далей браў удзел у рабоце зьездаў, якія адбываліся ў Маскве, Вільні, Рызе.

У жыцьці вясковага сьвятара Паеўскага здарылася яшчэ адна значная падзея. 5 верасьня 1897 года ён быў прадстаўлены асобе цара Мікалая II падчас адпачынку апошняга ў Белавежскай пушчы. Настойлівы сьвятар амаль тры чвэрткі гадзіны расказваў аб цяжкім лёсе Праваслаўнай Царквы на Беларусі, папрасіў царскай дапамогі для рэстаўрацыі царквы ў Камянцы. Цар таксама выказаў зацікаўленасьць станам сям'і Паеўскага, асабліва яму спадабаўся аповед пра дзесяцігадовую сястру Міхаіла Агаф'ю.

Якраз бацька, які быў у захапленьні ад прыгажосьці краявідаў Беларусі, яе храмаў, выхаваў у хлопчыка любоў да тых мясьцінаў, дзе прайшло ягонае дзяцінства. Запаветам сыну гучаць надрукаваныя ў 1894 г. словы а. Льва Паеўскага: "Хай жа напісаныя мною радкі не згінуць дарма: пісаўшы іх, я не шукаў і не шукаю літаратурнай славы. Слава, якою мы, па справядлівасьці, можам ганарыцца, гэта — мінулае шматвекавое жыцьцё нашых продкаў, якія завяшчалі нам сьвята захоўваць іх неўміручыя запаветы ў ладзе з Богам і сьв. Царквою нашай, што не аднойчы - падобна Хрысту - праліла (у асобе пастыраў

і народа) сьлёзы і кроў за свае родавыя, спаконвечныя пачаткі веры, мовы і нацыянальнасьці, перад якімі блякнуць і паволі ўтаймоўваюцца ненасытная чалавечая гордасьць і ілжывае, ніколі і нічым неспатольнае самалюбства".

Міхась адчуваў сябе сынам беларускай зямлі, ніколі яе не цураўся, не быў на ёй чужынцам. У савецкі час, калі ў афіцыйных дакументах была ўведзена графа аб нацыянальнай прыналежнасьці, Мітрапаліт Мелхісэдэк заўсёды зазначаў, што ён - беларус. Бацька навучаў хлопчыка любіць Бога, выхаваў яго перакананым абаронцам Праваслаўя. Любоў да Бога і да Бацькаўшчыны рабіла пазьней богаслужэньні Мітрапаліта Мелхісэдэка надзвычай узьнёслымі, на іх зауседы прыходзіла шмат вернікаў.

Міхаіл Паеўскі скончыў Казанскую духоўную акадэмію. У 1904 годзе ігумен Мелхісэдэк пачаў службу ў якасьці выкладчыка асноўнага, дагматычнага і маральнага багаслоўя Духоўнай семінарыі ў Магілёве. Але працаваў выкладчыкам нядоўга - з год. У 1906 годзе ігумен Мелхісэдэк зьяўляўся сябрам Савета Магілёўскага царкоўна-праваслаўнага Богаяўленскага Брацтва. А ў 1907 годзе наогул ад'ехаў з Магілёва, хутчэй за ўсё ў Тыфліс. Зьвесткі пра тое, што Мелхісэдэк да 1910 года быў настаяцелем Бялыніцкага манастыра, не знайшлі дакументальнага пацьвярджэньня. У гэты час настаяцелем быў архімандрыт Арсеній. На Беларусь епіскап Мелхісэдэк вярнуўся ў 1918-1919 годзе з Петраграда, дзе служыў вікарным епіскапам. Спачатку епіскап Мелхісэдэк атрымаў пасаду вікарнага епіскапа Сегуцкага, потым, пасьля ад'езду епіскапа Мінскага і Тураўскага Георгія ў Варшаву, заняў ягонае месца. Епіскап Мелхісэдэк стаў адным з найвышэйшых іерархаў Праваслаўнай Царквы на Беларусі, адказным за яе лёс. З гэтага часу клопаты аб захаваньні і разьвіцьці Праваслаўя, духоўным росквіце Бацькаўшчыны робяцца галоўным сэнсам і мэтай яго жыцьця. Як найвышэйшы іерарх Царквы, ён дбае аб дабрабыце і вернікаў, і кліра.

У пачатку 20-х гадоў па ўсёй Беларусі былі распаўсюджаны добра вядомыя кніжкі епіскапа Мелхісэдэка "Слово о входе в Иерусалим" і "Божьей милостью", у якіх епіскап заклікаў вернікаў да грамадзянскага міру, вяртаньня да мірнай працы. Відаць, уплыў гэтых кніжак на вернікаў быў значны, бо кнігі былі зьнішчаны так дасканальна, што нават у спецсховішчах бібліятэк на Беларусі не зьбераглося ніводнага асобніка. З болем епіскап Мелхісэдэк перажываў стан унутрыцаркоўнага жыцьця, які склаўся ў Расійскай імперыі на пачатку XX стагодзьдзя. Пазьней, у 1925 годзе, ён скажа: "Царквы пры царскай уладзе не было. Была групка сьвецкіх і вышэйшых духоўных чыноўнікаў, якія падпарадкавалі сабе ўсё і ўся. Мы хадзілі ў золаце, атрымлівалі тысячы, але не маглі жыць па запаветах Хрыста".

Епіскап быў у добрых адносінах з вядомым партыйным і дзяржаўным дзеячам Беларусі Ус. Ігнатоўскім, падтрымліваў ідэю аб беларусізацыі царквы. Калі ў 1929 годзе Ігнатоўскі быў абвінавачаны ў "нацдэмаўшчыне" і прыцягнуты да партыйнай адказнасьці, сьледчыя партыйнай камісіі ЦК КП(б)Б шукалі крыміналу і ў яго "сувязях" з Мелхісэдэкам, які, на іх думку, хацеў распаўсюдзіць рэлігію, пераклаўшы богаслужэньні на беларускую мову.

1922 год стаў для епіскапа Мелхісэдэка годам цяжкіх выпрабаваньняў. 16 лютага Прэзідыум УЦВК прыняў пастанову, у якой прапанавалася ў месячны

тэрмін "забраць з царкоўнай маёмасьці, перададзенай у карыстаньне групам вернікаў усіх рэлігіяў па вопісах і дамовах, усе каштоўныя прадметы з золата, срэбра і камянёў". 1 сакавіка ў Менску адбылося пасяджэньне Прэзідыума ЦВК Беларусі, на якім прынята рашэньне аб правядзеньні на Беларусі экспрапрыяцыі царкоўных каштоўнасьцяў. Афіцыйна канфіскацыя разглядалася як дабрачынная акцыя: было абвешчана аб дапамозе ахвярам голаду ў Паволжы. На самой справе царкоўныя каштоўнасьці павінны былі скласьці значную частку залатога запасу савецкай дзяржавы, каб забясьпечыць посьпех перамоваў у Генуі.

Найвышэйшыя іерархі Праваслаўнай Царквы ведалі пра тое, што Патрыярх Ціхан у сваім пасланьні ад 22 лютага 1922 года забараніў здаваць богаслужбовыя каштоўнасьці. Епіскап Мелхісэдэк, які лічыўся фактычным кіраўніком Праваслаўнай Царквы на Беларусі ў гэты час, апынуўся у цяжкім становішчы. Супроць сьвятароў, якія падтрымалі Патрыярха, адразу былі ўзбуджаны крымінальныя справы, самі яны арыштаваныя і пазьней расстраляныя.

Епіскап Мелхісэдэк прыняў цяжкае рашэньне: ён выказаўся за дабрачынную здачу ўсіх царкоўных каштоўнасьцяў, апрача сакраментальных. "Царква цяпер адзьдзеленая ад дзяржавы і прызнаецца свабоднай у сваім унутраным жыцьці і ладзе, але тая ж Царква, як установа народная, як адвечны носьбіт духа Хрыстовага, духа любові і міласэрнасьці, не можа застацца абыякавай і безуважнай да тых неймаверных намаганьняў, якія прыкладае народ дзеля паслабленьня і перапыненьня спасьціглага зямлю нашу няшчасця", - з такімі словамі зьвярнуўся епіскап да вернікаў у архіпастырскім пасланьні. Дзякуючы епіскапу Мелхісэдэку, Беларуская Праваслаўная Царква, страціўшы маёмасьць, захавала жыцьці сваіх сьвятароў.

Савецкая дзяржава, фармальна абвясьціўшы аб нейтральнасьці ў дачыненьні да Царквы, на самой справе ніколі нейтральнай не была, рабіла ўсялякія перашкоды Царкве і вернікам.

9 мая 1922 года быў арыштаваны Патрыярх Ціхан. Рускую Праваслаўную Царкву часова ўзначаліў яго намеснік, Яраслаўскі Мітрапаліт Агафангел, якому савецкія кіраўнікі забаранілі жыць у Маскве. 5(18) чэрвеня 1922 года Мітрапаліт Агафангел зьвярнуўся да епіскапаў: "Страціўшы на час найвышэйшае кіраўніцтва вы ўпраўляеце цяпер сваімі епархіямі самастойна, згодна з Пісаньнем, сьвяшчэннымі канонамі".

Царкоўнае жыцьцё яшчэ больш ускладнілася з актывізацыяй абнаўленцаў і жывацаркоўнікаў.

На пачатку 20-х гадоў спецслужбы, спачатку ВУК, а потым АДПУ, пачынаюць аперацыю па паглыбленьні расколу ў асяродзьдзі праваслаўных. Неафіцыйную дзяржаўную падтрымку маюць абнаўленцы. 8 чэрвеня 1922 года сакратар Цэнтральнага Бюро Кампартыі Беларусі У. Багуцкі паслаў у Палітбюро ЦК РКП(б) Сталіну і ў АДПУ Уншліхту "абсалютна сакрэтны" ліст. Багуцкі пісаў: "У сувязі з выклікам у ДПУ Епіскапа Мінскага і Тураўскага Мелхісэдэка для перамоваў аб магчымым выкарыстаньні ў барацьбе з Ціханам і рэакцыйным духавенствам ЦК КПБ даручае тав. Карэйва (начальніку Сакрэтнага адзьдзяленьня ДПУ Беларусі) атрымаць ад Вас далейшыя ўказаньні, якую лінію ў далейшым праводзіць тут нам. Мы лічым, што

Мелхісэдэка пры ўмелым падыходзе можна выкарыстаць у барацьбе з рэакцыйным духавенствам. Патрэбна толькі падысьці да яго асьцярожна, бо Мелхісэдэк вялікі дыпламат, які пражыў усе акупацыі і ладзіў з усімі ўрадамі.

Цяпер Мелхісэдэк імкнецца ўсюды падкрэсліць сваю лаяльнасць у адносінах да Савецкай улады. У пытанні аб канфіскацыі каштоўнасьцяў Мелхісэдэк заняў адразу цьвёрдую пазіцыю за здачу каштоўнасьцяў, выдаў з гэтай нагоды зварот да вернікаў. Астатняе менскае духавенства больш рэакцыйнае і кансерватыўнае, чым Мелхісэдэк. У менскія папы, сярод якіх да вайны вялася вялікая барацьба з каталіцкай царквой, падбіраліся больш разьвітыя і чарнасоценныя людзі. Цяпер, знаходзячыся на правах Рэспублікі, яны ўсе яшчэ дапушчаюць магчымасьць канфлікту і нашага ўходу з Беларусі, і таму адразу цяжка прыцягнуць іх да барацьбы.

Групай (нязначнай) беларускіх папоў, а таксама некаторымі беларускімі грамадскімі работнікамі ўзьнята пытаньне аб аўтаноміі (не аўтакефаліі) Беларускай царквы. З перамоваў, якія вяліся з Мелхісэдэкам па гэтым пытаньні, высьветлілася, што Мелхісэдэк асаблівага значэньня гэтаму пытаньню не надае.

Мы са свайго боку канстатуем, што тут для нас асаблівага значэньня гэтае пытаньне не мае. Папоў - беларусаў параўнальна мала. Асабліва р'янае правядзеньне беларусізацыі царквы можа мець адмоўныя вынікі, канкрэтна: згуртаваньне вакол царквы грамадскіх інтэлігенцкіх сілаў і скарыстаньне яе ў мэтах нацыяналістычнай агітацыі. Паколькі Маскоўскае ўпраўленьне царквы будзе знаходзіцца пад нашым уплывам, з гэтай нагоды можна пагадзіцца на аўтаномію, калі гэта выклікаецца якой-небудзь палітычнай мэтанакіраванасьцю і калі аўтаномная царква будзе ў залежнасьці ад Маскоўскага Упраўленьня.

Мы лічым, што са сьвятарамі-вялікарусамі і наогул з уплывам вялікарускім нам лягчэй будзе змагацца і хутчэй можна будзе іх трымаць на повадзе, чым беларускіх нацыянальных папоў. Паколькі Мелхісэдэк застаецца на Беларусі і паколькі не будзе праводзіцца контрэвалюцыйная апазіцыя царкоўных вярхоў, тут у нас няма ніякага сэнсу складаць іншую групу праваслаўнага духавенства. Галоўную ўвагу ў антырэлігійнай прапагандзе давядзецца перанесьці на барацьбу з польскім клерыкалізмам і разьвітым ў апошні час сектанствам. Праваслаўе ў нашых умовах усяляе параўнальна меншую небясьпеку ў гэтых адносінах".

Намер савецкай дзяржавы ў гэтым лісьце вельмі празрысты: выкарыстаць аўтарытэт епіскапа Мелхісэдэка, каб правесьці раскол Праваслаўнай Царквы на Беларусі, падпарадкаваць яе "паслухмяным" маскоўскім іерархам, паслабіць уплыў на вернікаў.

Каб пазьбегнуць абнаўленства, якое ішло ад маскоўскіх іерархаў, частка беларускага духавенства вырашыла стварыць незалежную царкву. Спачатку, да скліканьня Другога Паместнага Сабора, меркавалася, гэта будзе аўтаномная Праваслаўная Царква, якая падпарадкоўваецца Вышэйшаму Царкоўнаму Упраўленьню па справах Праваслаўнай Расійскай Царквы (ВЦУ). Паколькі ВЦУ было абнаўленцкім, савецкія улады ніякага занепакою не праявілі. 10(23) ліпеня 1922 года ў Менскім Кафедральным Саборы, пры ўдзеле ўсяго гарадскога духавенства і 60 прадстаўнікоў ад сялянскіх прыходаў, у прысутнасьці вялікай колькасьці вернікаў была абвешчана аўтаномія Беларускай Царквы на тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі, якая на той час уся ўмяшчалася ў межах

Менскай епархіі. Епіскап Менскі і Тураўскі Мелхісэдэк стаў Мітрапалітам Менскім і Беларускім. Для кіраваньня аўтаномнай Царквой было створана Царкоўнае Упраўленьне Беларусі (ЦУБ) у складзе 4-х прасьвітараў, аднаго клірыка і аднаго міраніна пад старшынством Мітрапаліта. У склад першага ЦУБ увайшлі протаіерэі Іаан Язьвіцкі, Аляксей Касьцючэнка, Сьцяфан Кульчыцкі, Уладзімір Біруля, псаломшчык Х. Загорскі і міранін Уладзімір Сакалоў. Сакратаром ЦУБ стаў протаіерэй Антоній Кіркевіч. У Адозьве да пастыраў і міран Беларускай Праваслаўнай Царквы, падпісанай ўсімі членамі ЦУБ, былі акрэсьлены задачы Беларускай Царквы "згодна з патрабаваньнем часу і народна-бытавымі асаблівасьцямі беларускага краю". Галоўная з іх — унутранае царкоўнае аднаўленьне па евангельскіх запаветах, каб ідэі роўнасьці і братэрства ўвайшлі "ў жыцьцё веруючых мас, як асноўныя ідэі хрысьціянства", каб жыцьцё людзей было адухоўлена Найвышэйшай Праўдай. "Прадстаўляючы сабою орган упраўленьня Беларускай Царквы і зьяўляючыся носьбітам агульна-царкоўнае сьвядомасьці, ЦУБ строга абмяжоўвае кола сваёй дзейнасьці вобласьцю царкоўных справаў Беларусі. Таму ЦУБ не знаходзіцца і не можа знаходзіцца ні ў якай залежнасьці ці сувязі з якімі-небудзь царкоўнымі ці палітычнымі арганізацыямі, як у Расіі, так і за яе межамі, накіраванымі да ўзнаўленьня класавага ўладарства ці падпарадкаваньня капіталістычнаму ладу, лічачы распаўсюджваньне гэтакіх ідэяў справай не царкоўнай і годнай асуджэньня", -так дэкляравала свае адносіны да тагачасных падзеяў кіраўніцтва Беларускай аўтаномнай Праваслаўнай Царквы.

Стварэньне аўтаномнай Беларускай Праваслаўнай Царквы спачатку было прыхільна ўспрынята партыйна-дзяржаўнымі кіраўнікамі Беларусі: абнаўленцы карысталіся іх падтрымкай. Але Мітрапаліт Мелхісэдэк сапраўдным абнаўленцам ніколі не быў. Гэта хутка зразумелі і на Беларусі і ў ВЦУ — у Маскве. Упаўнаважаны ў ВЦУ па Менскай епархіі 5 лістапада 1922 года пісаў: "З нагоды абмеркаваньня на пленуме ВЦУ пытаньняў , якія тычацца Менскай епархіі, наступным лічу сваім абавязкам унесьці ў ВЦУ праект рэзалюцыі: "... 4. Аб Мітрапаліце Мелхісэдэку. Тытул "мітрапаліта" нададзены пры абвяшчэньні аўтаноміі Беларускай Царквы, захоўваецца за ім і на будучыню пры выказваньні ім спрыяльных адносінаў да ВЦУ і абнаўленцкага руху".

ДПУ Беларусі пільна сачыла амаль за кожным крокам Мітрапаліта. Раз на тыдзень у Маскву ішлі "дзяржінфармзводкі", у якіх адлюстроўваліся падзеі ў Менску: "Мясцовым рэакцыйным духавенствам на чале з Мелхісэдэкам прымаюцца ўсе меры да ўзмацненьня свайго ўплыву на масы вернікаў шляхам арганізацыі звышштатных богаслужэньняў, дзе распяваюцца перакладзеныя на беларускую мову царкоўныя песьні і ўсялякімі абяцанкамі стараюцца заахвоціць правінцыйных папоў. Надыходзячыя сьвяты мяркуюць абставіць асабліва ўрачыста ўсё з той жа мэтай".

На жаль, патрыярх Ціхан і ягоныя намесьнікі не зразумелі адразу пазіцыю кіраўніцтва Беларускай Праваслаўнай Царквы. Яны не прызналі аўтаноміі Беларускай Праваслаўнай Царквы і Мітрапаліта Мелхісэдэка.

Канфлікт сярод найвышэйшых іерархаў Рускай Праваслаўнай Царквы пашыраўся. У маі 1923 г. з дазволу Савецкай улады адбыўся II Памесны Сабор, на якім большасьць склалі абнаўленцы. Яны абралі сваё найвышэйшае

царкоўнае кіраўніцтва на чале з протаіерэем Аляксандрам Введзенскім, якому быў нададзены сан мітрапаліта. Патрыярха Ціхана пазбавілі сьвяшчэннага сана і нават манашаства. Мітрапаліт Мелхісэдэк рашэньняў Сабора не падтрымаў, застаўся прыхільнікам Патрыярха Ціхана.

У лютым 1924 года з нагоды ўзбуйненьня тэрыторыі Беларусі Мітрапаліт зьвярнуўся да служыцеляў Праваслаўнай Царквы і вернікаў з архіпастырскім пасланьнем. "Перад усім мы не можам не вітаць ад імя Царквы з пачуцьцём асаблівай радасьці аб'яднаньне роднай Беларусі ў адну грамадзянскую адзінку. Беларускі народ цяпер атрымлівае шырокую магчымасьць агульнымі намаганьнямі ісьці па шляху разьвіцьця сваей нацыянальнай культуры, стварыць духоўны і матэрыяльны дабрабыт свой. Царква Праваслаўная, уласьцівымі ёй магчымасьцямі, шчыра гатова садзейнічаць гэтаму разьвіцьцю і працьвітаньню роднай нам Беларусі. Няхай благаславіць Гасподзь далейшыя крокі Беларусі на слаўным шляху яе да дабрабыту і шчасьця народнага", - гэтыя словы любові да Бацькаўшчыны мелі вялікі ўплыў на вернікаў.

Протаіерэй Барыс Васільеў ўспамінаў: "У тыя гады на Менскай кафедры быў архіепіскап Мелхісэдэк (Паеўскі), які карыстаўся вялікай павагай сярод праваслаўных нашага горада. Штодзённа ён служыў урачыстыя набажэнствы ў Сьвята-Петра-Паўлаўскім кафедральным саборы. Штогод у Вялікі Чацьвер сам праводзіў сьлёзныя споведзі ў саборы, выконваў чын амавеньня ног".

Рост папулярнасьці "ціханаўца", яго ўсенароднае шанаваньне былі не да спадобы ні абнаўленцам, ні кіраўнікам Савецкай дзяржавы. Захаваліся ўспаміны сьведкаў аб дыскусіі паміж Мітрапалітам Мелхісэдэкам, кіраўніком абнаўленцаў Аляксандрам Введзенскім і наркомам Луначарскім. Грунтуючыся на тэкстах Сьвятога Пісаньня, Мітрапаліт бліскуча разьбіў усе довады наркома-атэіста.

Дзяржава і абнаўленцы пачынаюць рабіць захады, каб пазбавіць Мітрапаліта царкоўнай улады.

17 - 19 мая ў Магілёве адбыўся I Беларускі Царкоўны Сабор, скліканы з ініцыятывы абнаўленцаў. На Саборы было прынята "Палажэньне аб кіраўніцтве Беларускай Праваслаўнай Царквой". Паводле Палажэньня Беларуская Царква рабілася аўтаномнай - ствараўся Беларускі Праваслаўны Сьвяшчэнны Сінод, які ўзначальваў Беларускі Мітрапаліт. Падпарадкоўваўся Беларускі Сінод Сьвяшчэннаму Сіноду Рускай Праваслаўнай Царквы. На Саборы быў абраны новы Мітрапаліт - епіскап Серафім, абнаўленец. Але ўмовы на Беларусі яму не спадабаліся і ён ад'ехаў у Ніжні Ноўгарад. Тады ў жніўні рашэньнем Пленума Сінода Мітрапалітам быў абраны Архіепіскап Таганрогскі Уладзімір, але ён таксама быў на Беларусі нядоўга.

Калі новы мітрапаліт прыехаў у Менск, узьнікла недарэчная сітуацыя: на Беларусі апынулася два Мітрапаліты Беларускія. "Беларускі Праваслаўны Сьвяшчэнны Сінод просіць Ваша Праасьвяшчэнства спыніць тытулаваньне сябе "Беларускім" Мітрапалітам і для вызначэньня далейшага свайго становішча і служэньня ў Беларускай Царкве не адмовіць прыйсьці ў Беларускі Сінод для асабістых перамоваў", - з такой просьбай зьвярнуўся да Мелхісэдэка Мітрапаліт Уладзімір. Супрацоўнічаць з абнаўленцамі Мелхісэдэк не хацеў. Не аднойчы запрашалі яго прыняць удзел у працы I Сабора, у выбарах мітрапаліта, у пасяджэньнях Беларускага Сінода, але беспасьпяхова.

І тады ў жніўні 1924 года супроць Мітрапаліта Мелхісэдэка была ўзбуджана крымінальная справа: ён абвінавачваўся ў захаваньні ад канфіскацыі царкоўных каштоўнасьцяў і ў агітацыі і прапаганьдзе супраць Савецкай улады. Мітрапаліт знаходзіўся пад дамовым арыштам. З Масквы быў накіраваны епіскап Менскай епархіі Сяргей Іванцоў. Але вернікі не прынялі новага пастыра. Яны не пусьцілі яго ў Петра-Паўлаўскі кафедральны сабор, дзе павінна была адбывацца ўсяночная перад сьвятам Узьдзьвіжаньня Крыжа Гасподняга. Найбольш абураныя на абнаўленцаў вернікі разарвалі епіскапскую расу, скінулі з яго клабук. Епіскап Іванцоў вымушаны быў хутка зьехаць з Менска. У тыя часы ў Менску дзейнічалі сем праваслаўных храмаў. І толькі ў адным - Спаса-Праабражэнскім сінадальным саборы - служылі абнаўленцы.

Духавенства астатніх храмаў належыла да "ярых мелхісэдэкаўцаў". Меркавалася, што да Мітрапаліта Мелхісэдэка будзе скарыстана "найвышэйшая мера сацыяльнай абароны" - пакараньне сьмерцю. У ліпені 1925 года справа Паеўскага М. Л. з падрыхтаваным праектам прыгавора была адаслана ў Маскву ў Наркамюст на зацьвярджэньне. "Адпаведныя органы" 15 ліпеня яе разгледзелі і выказаліся "за слуханьне гэтай справы ў адносінах да ўсіх абвінавачваных у агульна-крымінальным парадку, без ужываньня да іх найвышэйшай меры сацыяльнай абароны". Згодна з рашэньнем Наркамюста на пасяджэньні камісіі Бюро ЦК КПБ(б) была прынята пастанова аб правядзеньні 10 жніўня адкрытага судовага працэсу над Мітрапалітам Мелхісэдэкам. "Галоўнай задачай працэсу лічыць маральную дыскрэдытацыю ціханаўскага духавенства", -падкрэсьлівалася ў ёй.

Сем дзён працягвалася судовае сьледства. Тысячы людзей кожны дзень прыходзілі ў залу пасяджэньняў, стаялі каля вокнаў, на вуліцы. Сёньня меркаваць аб усіх асаблівасьцях працэсу можна толькі па дакументах, якія захаваліся ў былым архіве ЦК КПБ ды па газетных справаздачах: сама крымінальная справа зьнішчана. Але і гэтых матэрыялаў дастаткова, каб высьветліць палітычны характар працэса, уявіць мужныя паводзіны Мітрапаліта Мелхісэдэка. "Савецкая ўлада змагаецца ідэйна з рэлігіяй. Гэта яе права, як і наша права ідэйна змагацца з бязбожжам", - гаварыў ён на судзе.

Высьветлілася на працэсе і мера маральнасьці паплечнікаў Мітрапаліта. Разам з ім абвінавачвалася яшчэ шэсьць сьвятароў і вернікаў. Сьледчыя мелі надзею, што тыя пацьвердзяць галоўную ролю Мітрапаліта ва ўхіленьні ад канфіскацыі царкоўных каштоўнасьцяў. Але надзея гэтая не спраўдзілася: усе сьведчылі аб невіноўнасьці Мітрапаліта. І толькі келейнік Мелхісэдэка Чаплін, які жыў з ім ў адным доме, даў паказаньні супроць Мітрапаліта. Але гэтая здрада мала дапамагла. На судзе відавочна стала, што Мітрапаліт невінаваты. Паколькі Масква дазваляла "спыніць справу зусім", суд вынес саламонава рашэньне: Міхаіл Паеўскі, Мітрапаліт Мелхісэдэк, быў прыгавораны да трох гадоў пазбаўленьня волі ўмоўна. Ён зноў узначаліў Менскую епархію.

Колькасьць прыхільнікаў Мітрапаліта Мелхісэдэка штодня павялічвалася. У сьпісе цэркваў Менскай епархіі, які падрыхтавалі абнаўленцы ў 1926 годзе, да "мелхісэдэкаўцаў" належылі сьвятары з Астрашыцкага гарадка, Сеньніцы, Беларучча, Заслаў'я, Койданава, Ігумена, Слуцка, Лядаў, Сьмілавічаў, Узды, Блоні, Смалявічаў, Жодзіна, Лагойска, Мар'інай-Горкі, Барысава,

Плешчаніцаў, Халопенічаў і інш.

Калі Мітрапаліт Мелхісэдэк зьехаў з Беларусі, дакладна невядома. 12 кастрычніка 1925 года ён, як і належала ўсім сьвятарам, падаў у фінансавы адзьдзел дэкларацыю аб сваіх прыбытках за другое паўгодзьдзе 1925 года. Заўважым, што жыў Мітрапаліт вельмі сьціпла: выдаткоўваў у месяц 3-4 чырвонцы, а калі і менш, займаў пакой ў 2, 5 сажані. Прыбытак яго быў ніжэй абкладанага мінімума, ад падаткаў Мітрапаліт Мелхісэдэк быў вызвалены. Але ўчастковая камісія, што выносіла гэтае рашэньне, пазначыла ў пратаколе: "Сам пад вартай у Бутырцы ў Маскве". Вядома, што 11 лістапада 1925 года Мітрапаліт Мелхісэдэк рукапалажыў Бараноўскага Я. С. у дыякана Кафедральнага Сабора ў Менску. Гэткім чынам, у канцы лістапада ці ў сьнежні 1925 года Мітрапаліт Мелхісэдэк быў выкліканы ў Маскву, адкуль, пасьля знаходжаньня ў Бутырцы, быў накіраваны, верагодна, у Краснаярск у Марыінскія лагеры, але дакументальных звестак аб гэтым не захаваліся. З таго часу на Беларусь Мітрапаліт больш не вярнуўся.

23 мая 1927 года Мітрапаліт Мелхісэдэк быў зноў затрыманы, а 4 чэрвеня арыштаваны ў Маскве і абвінавачаны "ў выкарыстоўваньні рэлігійных настрояў мас у антысавецкіх мэтах". Але суда над ім не было. 17 верасьня 1927 года памочнік упаўнаважанага 6 Адзьдзяленьня СА АДПУ Якімава разгледзела гэтае абвінавачваньне "на падстве сабранага матэрыялу па справе 46313 супроць гр. Паеўскага Міхаіла Львовіча, епіскапа, "і прыняла да ўвагі", што прыпісанае названаму грамадзяніну злачынства не пагражае суровым пакараньнем, што абвінавачваны мае пастаяннае месца жыхарства і канкрэтныя заняткі, з чаго няма падставаў для яго ўхіленьня ад следства і суда", вынесла рашэньне: "меру прысячэньня(утрыманьне пад вартай) замяніць падпіскай аб нявыезьдзе з г. Масквы. Справу сьледствам працягваць". Але ў сьледчай справе, што захавалася ў Цэнтральным Архіве Міністэрства Бясьпекі Расіі, ніякіх іншых дакументаў няма.

Паводле ўспамінаў протаіерэя Барыса Васільева, Мітрапаліт Мелхісэдэк раптоўна памёр у Маскве ў 1931 годзе падчас урачыстай службы перад хіратоніяй аднаго з архіерэяў у Дарагамілаўскім саборы. Пахаваны быў спачатку ў Кузьмінках, а потым труна яго была перавезена на Праабражэнскія могілкі. Ёсьць іншыя зьвесткі:што ў канцы 1930 года Мітрапаліт Мелхісэдэк быў выкліканы ў Маскву з Краснаярска і прызначаны членам Сінода, які узначальваў Мітрапаліт Сергій. 17 мая 1931 года ў адным з маскоўскіх храмаў раптоўна памёр пры аблачэньні ў алтары.

Мітрапаліт Мелхісэдэк любіў Бога і Бацькаўшчыну, але застаўся навечна ўдалечыні ад роднай зямлі. Не ходзяць нашчадкі да яго сьвятой магілы, нават невядома, ці захавалася яна. Няўжо на Беларусі так зашмат сьвятыняў?. . .

Т. Процька,
старэйшы навуковы супрацоўнік
Інстытута гісторыі АНБ.

У ПАМЄСНЫХ ЦЭРКВЯХ

ЗВАРОТ АРХІЕРЭЙСКАГА САБОРА СЕРБСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ ДА СЕРБСКАГА НАРОДА І МІЖНАРОДНАЙ ГРАМАДСКАСЬЦІ.

Сьвяты архіерэйскі Сабор Сербскай Праваслаўнай Царквы правёў сваё нечарговае пасяджэньне ў Цэціньскім манастыры і ў манастыры Остраг 31 кастрычніка — 3 лістапада 1993 года. Гэтае пасяджэньне было прысьвечана ўшанаваньню 500-годзьдзя Цэціньскага "Октаіха" і 130-годдзя Цэціньскай духоўнай семінарыі.

Пасьля ўрачыстай Саборнай Літургіі, адслужанай у Цэціньскім манастыры, адкрыцьця Сабора, дабраславеньня (асьвячэньня) каменя-падмурка на новы будынак Семінарыі, услаўленьня заступніка Семінарыі Сьв. Пятра Цэціньскага, члены Сабора прысутнічалі на ўрачыстай Акадэміі ў Доме моладзі ў Падгорыцы, прысьвечанай "Октаіху" і ўгодкам Семінарыі.

Сабор прысьвяціў асаблівую ўвагу пытаньню трагічнага становішча сербскага народа, ягонай міжнароднай ізаляцыі і несправядлівага ўціску, усё большай гаротнасьці, ягонага духоўнага і маральнага крызісу, які немінуча адбіваецца на ўсім эканамічным і грамадскім жыцьці. У сувязі з гэтым Сабор накіраваў Савету бясьпекі "Заклік да чалавечнасьці", а грамадскасьці айчыны і сьвету "Зварот", у якім выказаў сваё разуменьне тых падзеяў, што адбываюцца ў краіне, прычынаў крызісу, магчымасьцяў яго пераадоленьня і шляхоў выйсьця з цяперашняга хаосу.

Для нас і нашага народа гэта біблейскія часы і пара галгофскага ўкрыжаваньня. Мы сьведкі і ўдзельнікі пакутніцтва цэлага хрысьціянскага

народа, які асуджаны айчыннымі і замежнымі ўладарамі гэтага сьвету. Змагаючыся за захаваньне сваіх котлішчаў і царкоўна-нацыянальных сьвятыняў, гінуць нашыя браты і сыны: у бежанстве і часовых прытулках — а дзесьці і ў лагерах — жанчыны, дзеці, старыя: ва ўбожніцах і лазарэтах, ад недахопу ежы і лекаў, паміраюць нямоглыя, хворыя, параненыя. Ваенныя разбурэньні, людскія ахвяры, а таксама санкцыі сусьветных уладароў пры згубных пазіцыях рэшткаў неакамунізму, давялі сербскі праваслаўны народ да цяперашняга жахлівага становішча, якое ўсё больш пагражае катастрофаю як на тэрыторыях, ахопленых вайною, так і ў Сербіі і Чарнагорыі.

Сабор праваслаўных сербскіх епіскапаў шле малітоўны зварот да Бога і да людзей, просячы абароны элементарных чалавечых і нацыянальных правоў пакутніцкага сербскага народа ва ўсіх краях, дзе ён пражывае вякамі, па-хрысьціянску сьцьвярджаючы свае духоўнасьць, праўдалюбства, прагу вольнасьці і гуманізм. Просім, каб у такой самай меры шанаваліся асабовыя і нацыянальныя правы ўсіх нашых суседзяў, шчыра спачуваючы іхнім пакутам і ўсім іхнім ахвярам. Пры гэтым наша просьба да айчынных і замежных судзьдзяў зямных, да ўладароў гэтага сьвету, каб ва ўсіх сваіх прапановах, нам неабходных і каштоўных, наконт спыненьня вайны, усталяваньня міру і чалавечнасьці, мелі на ўвазе, побач з астатнімі народамі, і народ сербскі. Ён ўжо на працягу дзесяцігодзьдзяў па-рознаму караўся камуністамі, а цяпер вось ізаляваны і замкнёны ў гета звонку і з сярэдзіны.

Сербскаму праваслаўнаму народу не першы ўжо раз у гісторыі давялося апынуцца на галгофскім укрыжаваньні за тое, што дамагаецца Божай і людской праўды, змагаецца за сваю волю. Хіба гэта народ без ніякіх духоўных і гістарычных каранёў, без людскіх вартасьцяў і без апрабаваных хрысьціянскіх прынцыпаў маралі? Вядома, сербскі народ не без сваіх заганаў і грахоў, якія і ў гэты бядотны час выявіліся, часьцей за ўсё пры абароне, але таксама і ў прыпадках шаленства асобных прадстаўнікоў і групаў. Іхнія ўчынкі і злачынствы мы асуджаем і на гэты раз, як рабілі заўжды раней. Заклікаем усіх такіх да пакаяньня, нагадваючы евангельскае выслоўе з нашага духоўнага вопыту, паводле якога "пакаяньне— найлепшы квет людскога сумленьня". Аднак у той самы час, як біблейскі шматпакутны Іоў, не можам не заявіць пра спомірсную няпраўду (несправядлівасьць) у дачыненьні да нашага народа, што абумовіла яму такое становішча, якога не ведае сусьветная гісторыя.

Сербскае пытаньне, што існуе не ад учорашняга дня, не вырашана — і вырашыцца не можа — ні так, як яго вырашалі бязбожныя камуністы, ні так, як паводле камуністычных ("аўноеўскіх") межаў хоча вырашыць Еўрапейская супольнасьць, альбо, пад уціскам уладароў, Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў. Сербы ў Босьніі і Герцагавіне, у Харваціі, у Славеніі і Далмацыі не ад учорашняга дня і не ад Другой сусьветнай вайны, калі, дарэчы, якраз там харвацкія і мусульманскія нацысты спрабавалі іх вынішчыць прадуманым генацыдам, які на свой

манер прадоўжыў камуністычны рэжым у наступныя паўстагодзьдзя. Гэты народ, між іншым, як і сербы з Сербіі ды Чарнагорыі, змагаўся на баку заходніх хрысьціянскіх саюзьнікаў супраць ісламскай экспансіі, а потым і супраць фашысцкай нацысцкай і камуністычнай тыраніі. Сербскі народ ніколі не быў камуністычны, цяпер не ёсьць шавіністычны, затое ў сваёй вольналюбнай і праўдалюбнай гісторыі заўжды быў перашкодаю чужым планам.

Як сербы, праваслаўны хрысьціянскі і еўрапейскі народ, а тым болей іхняя Царква, могуць пагадзіцца з прыніжэньнем і шантажом сусьветных уладнікаў, з аднабаковай прапагандаю, каб адмовіліся ад сваёй сьвятой зямлі Косава і Метохіі, дзе ў дыяметры ста кіламетраў наш народ мае тысячу трыста цэркваў і манастыроў, з якіх дзесяць адносяцца да вяршыняў сусьветнай духоўнай і культурнай спадчыны? Як можа сербскі народ адрачыся ад манастыроў Жытаміслiч і Прэбілавац у Герцагавіне, манастыроў Таўна, Озран і сараеўскай Старой царквы ў Босьніі, манастыроў Пакра і Орахавіца ў Славоніі, Ясенавец і Гліна ў Краіне, манастыроў Крка, Крупа і Драгавіч у Далмацыі? Як, пад уціскам уладароў, зрачэцца ён калысак і магілаў, сьвяцілішчаў нараджэньня, памірaньня і нацыянальнага ўваскрэшаньня? Хіба стаць сьметнікам сьвету, адкрытым балканскім манежам для несумленных палітыкаў, а потым канаць у рэзервацыі, у якую нас пазганяюць? Ды мы верым у вечную Божую праўду: яе слова — апошняе слова і ў гісторыі, і ў эсхатоне.

Таму мы зьвяртаемся да сербскага народа і просім яго, каб у гэтыя дні гефсіманскіх спакушэньняў не падаў духам, а спадзяваўся на Бога Жывога і Ісьціннага і на малітоўную дапамогу Сьвятога Савы, Сьвятога Васіля Острашскага, Сьвятога Пятра Цэціньскага, сьвятых косаўскіх мучанікаў і ўсіх сьвятых новамучанікаў і спаведнікаў веры Хрыстовай. Просім яго трываць у цярпеньні і хрысталікім дараваньні, у велікадушнасьці да ўсіх людзей, але і быць крытычным — найперш да сябе, а потым і да сваіх правадыроў і да сусветных уладароў, шукаць сваіх грамадзянскіх і нацыянальных правоў, але і абараняць сваю свабоду, унутраную і вонкавую, заўжды паводле меры хрысьціянскай чалавечнасьці і мужнасьці: "Лепш . . . галаву скласьці, чым душу сваю грахом абцяжарыць".

Свой пастырскі зварот мы накіроўваем сусьветнай грамадскасьці, асабліва Аб'яднаным нацыям і ўсяму гуманнаму люду, каб нашым сіротам, нашым хворым і параненым, нашаму зьбяднеламу прыгнечанаму народу, гэтаксама як і іншым народам, якія з намі жывуць, аказалі медыцынскую і іншую дапамогу, неабходную дзеля жыцьця.

Мы накіроўваем таксама зварот палітычным правадырам і партыям нашага народа, асабліва Сербіі і Чарнагорыі, каб ніколі не выпускалі з-пад увагі цэласнасьць і адзінства сербскага народа, ягонага міжнароднага становішча, аўтарытэту і будучыні. Сербская Праваслаўная Царква панад любой палітычнай партыяй: яна ніколі не была партыйнай, а заўсёды патрыятычнай і агульналюдской. Наш сьвятасаўскі патрыятызм -гэта

вызначэньне найперш за Царства Божае і праўду Ягоную. Толькі ў гэтым сьвятле і наша айчына атрымлівае сваю вартасьць, прымальную па-людску і апраўданую па-Божаску.

Сабор з жалем канстатуе, што ў гэты трагічны момант у нас мала ўвагі надаецца духоўнаму і маральнаму адраджэньню народа, як галоўнай перадумове сапраўднага прагрэсу. Таму ўсім адказным за гэта зноў нагадваем пра надзённую патрэбу ў хрысьціянскай духоўнай асьвеце і маральным выхаваньні, што немагчыма зьдзейсьніць без веранавукі ў нашай школьнай сістэме і без ачышчэньня ўсёй адукацыйнай сістэмы ад атэістычна-матэрыялістычных забабонаў і заблудзьдзяў.

Яскравым, хоць і негатыўным, доказам такой патрэбы зьяўляецца крызіс маралі і нечуваны рост крыміналу, карупцыі і няправеднага ўзбагачэньня за кошт усё бяднейшых слаёў грамадства, прыватызацыя, прысваеньне і нават адкрытае рабаваньне дзяржаўнай, грамадскай і раней нацыяналізаванай маёмасьці, у тым ліку і царкоўнай. Прычым, многія з тых, хто калісьці, у імя калектывізму, нацыяналізоўваў прыватную і царкоўную маёмасьць, скарыстоўваюць сваё становішча, каб зараз яе адабраць сабе. Царква ў гэтым была і застаецца найбольш пакрыўджанай. Але нас, пастыраў Царквы, у цяперашні момант найбольш заклапочвае, што пад пагрозаю духоўнасьць і мараль нашага народа, асабліва маладога пакаленьня, што адбываецца вялікі адплыў здольных маладых людзей з усіх нашых краёў. Тут мы павінны адзначыць і агромністую духоўную небясьпеку, якую мае нашэсьце прымхаў і шматлікіх сектаў.

Мы адчуваем абавязак паўтарыць тое, што ўжо неаднойчы казалі: "Сербская, народная і саборная Царква цалкам усьведамляе трагічнасьць моманту і гістарычнага раздарожжа, на якім апынуўся народ, зноў заклікае да стварэньня ўлады народнага даверу, нацыянальнага адзінства і ўсенароднага ўратаваньня. Нагадваем, што нічыё крэсла не даражэйшае за лёс і вольнасьць цэлага народа і што нікому не дадзена манаполія на яго лёс і на будучыню нашых дзяцей".

Нашым суседзям і ўсім людзям добрай волі, усяму роду чалавечаму, асабліва ўсім, хто апынуўся на вайною ахопленых тэрыторыях, жадаем міру Божага і чалавечага, спыненьня ўсіх канфліктаў, справядлівага і гуманнага вырашэньня ўсіх праблемаў збавеньня ад усіх пакутаў і няшчасьцяў. Асуджаем любое зло і любое злачынства. Асабліва просім і заклікаем, каб спыніць усе ваенныя дзеяньні і пакуты нявіннага цывільнага насельніцтва. Яшчэ просім, каб была забясьпечана магчымасьць дастаўкі гуманітарнай дапамогі ў леках, ежы і адзеньні ўсім, хто не абаронены ва ўмовах гэтай шматстайнай зімы. Молімся Госпаду, Тварцу і Збавіцелю ўсіх людзей і народаў за што хутчэйшую духоўную вясну, за мір і добрую волю між людзьмі, у славу Божую і на дабро ўсім.

Амінь, Божа дай!

(Пераклад з сербскай Івана Чароты)

ПЕРЯКЛЯДЫ

АКАФІСТ
СЬВЯТЫМ МУЧАНІКАМ ВІЛЕНСКІМ АНТОНІЮ, ІААНУ І ЯЎСТАФІЮ.

Кандак 1.

Абраныя Богам дзеля сьведчаньня Праваслаўнае веры мужна перамаглі сьвятыя мучанікі язычніцкае беззаконьне і за вашы пакуты неўвядальнымі вянцамі ад Хрыста Бога ўвянчаліся, і гэтым жа праслаўляючы вашу памяць, ласкава зьвяртаемся да вас: Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе.

Ікас 1.

Ангелам зямным і чалавекам нябесным упадобіліся вы, сьвятыя мучанікі, калі азораныя сьвятлом сапраўднага Богапазнаньня радасна пайшлі на пакутніцкі подзьвіг. Прыміце ж ад нас хвалебныя сьпевы гэтыя:

Радуйцеся, Богаабраныя спаведнікі праваслаўныя ў зямлі Беларуска-Літоўскай!

Радуйцеся нямоўчныя спавесьнікі праўдзівай пабожнасьці.

Радуйцеся, вялікія падзьвіжнікі, ні ў што паставіўшы славу сьвету гэтага, а Хрыста Бога прыняўшы ўсім вашым сэрцам і ўсёю душою.

Радуйцеся, крывёю вашаю засьведчыўшы любоў вашу да Госпада Ісуса.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 2.

Бачыўшы, як нятленныя вашыя мошчы даруюць усім, хто з вераю прыходзіць, выздараўленьне ад хваробаў душы і цела, дзякуем міласэрнаму Богу, што праславіў вас, сьвятыя мучанікі, такою ласкаю і молімся Хрысту, Збавіцелю нашаму: Алілуя!

Ікас 2.

Разумны погляд свой скіраваўшы ў пазнаньне праўдзівай веры, вы, сьвятыя браты, Антоніе і Іаане, мужна-мудра адкінулі язычніцкую спакусу і за вызнаньне адзінага праўдзівага Бога радасна прынялі кайданы, турэмнае зьняволеньне, раны і лютую сьмерць. Да гэтага подзьвігу далучыўся і малады Яўстафій, бязбоязна вызнаў сябе хрысьціянінам і зьведаў гэтакія ж лютыя за Хрыста катаваньні і сьмерць. За гэтую вашу, бо за Хрыста, сьвятую адвагу, зьвяртаемся да вас зараз:

Радуйцеся, шчаслівая тройца праўдзівых пакутнікаў, бо праславілі праўдзівага Бога, у Сьвятой Тройцы ўхваленага, Айца, Сына і Сьвятога Духа.

Радуйцеся, доблесныя воіны Хрыстовы, што захавалі адданасьць Уладару да сьмерці.

Радуйцеся, бо не збаяліся выцерпець за Хрыста аніякія мукі.

Радуйцеся, бо ні прыгнёт, ні кайданы, ні мучэньне, ні самая сьмерць не змаглі адлучыць вас ад любові Хрыстовай.

Радуйцеся, выгнаныя, прыніжаныя і забітыя дзеля праўды, бо ўзнагарода ваша вялікая ў нябёсах.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 3.

Сілаю Усявышняга ўмацаваныя, вы пагарджалі, сьвятыя мучанікі, цяжкімі мукамі вашых целаў, аддадзеныя на мучэньні і катаваньні, нібы на вясельле, радасна пайшлі, мы ж з удзячнасьцю молім умацаваламу вас Хрысту Богу: Алілуя!

Ікас 3.

Маючы моцную надзею на Нябеснага Цара і Бога і памятаючы

апостальскае слова, што лепш належыць слухацца Бога, чым людзей, вы, сьвятыя мучанікі, не паслухаліся загадаў вашага ката, каб вярнуцца да ранейшага язычніцкага беззаконьня.

Радуйцеся, бо вызналі Хрыста перад людзьмі, а ад Яго вызнаны прад Айцом Нябесным.

Радуйцеся, адданыя слугі Хрыстовы, за вернасьць сваю ўнасьледвалі Царства Нябеснае.

Радуйцеся, жывучы разам з Анёламі і ўсімі сьвятымі.

Радуйцеся, ўведзеныя ў безьвячэрні дзень Царства Божага.

Радуйцеся, гледзячы зь нябёсаў на зямное брацтва вашае і молячыся за ўсіх, хто кліча вас на дапамогу.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 4.

Бура разьюшанасьці вашых мучыцеляў не пахіснула моцнай вашай веры, надзеі і любові да Збаўцы Бога, і вы, сьвятыя мучанікі, горача перад мукамі сьпявалі Богу ў сэрцах вашых: Алілуя!

Ікас 4.

Чулася па ўсёй праваслаўнай зямлі радасная вестка, што вы, сьвятыя мучанікі, на подзьвіг добры пайшоўшы, служэньне ваша добра закончылі і веру да канца захавалі. Дзеля гэтага і мы з ўсёю Праваслаўнаю Царквою ўслаўляем вас:

Радуйцеся, бо выканалі слова Хрыстова: хто вытрымае да канца, той збавёны будзе.

Радуйцеся, вашай цярплівасьцю вы зьдзівілі мучыцеляў вашых.

Радуйцеся, прыкладам вашага жыцьця і сьмерці вы многіх прывялі да Госпада.

Радуйцеся, бо і цяпер цудамі, што зыходзяць ад сьвятых мошчаў вашых, вы ўмацоўваеце праваслаўную веру ў людзях.

Радуйцеся, бо за цярпеньне вашае належыць вам вянец праўды ў нябёсах.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 5.

Богапраменнымі зоркамі праваслаўнай веры былі вы, сьвятыя мучанікі, для вашых зямных суайчыньнікаў, паказваючы ім у праваслаўнай царкве адзіную надзейную дарогу да збавеньня, няхай жа ўсе адзіным сэрцам і

адзінымі вуснамі моляцца да Збаўцы Бога: Алілуя!

Ікас 5.

Бачны быў цудоўны знак Божае ласкі, калі пачэснае месца вашых мучэньняў азарыў з вышыні воблачны слуп, паказваючы вам дарогу ў нябёсы, як у старажытнасьці ізраільцянам з Егіпта ў зямлю абяцаную. Дзеля гэтага мы сьпяваем да вас:

Радуйцеся, дзеці новага Ізраіля, дасягнуўшы горняга нябеснага Іерусаліма.

Радуйцеся, добра прайшоўшы шматцяжкае вандроўніцтва ваша ў пустэльні гэтага жыцьця, і пасяліўшыся ў краіне абяцанай вечнай.

Радуйцеся, бо не Майсей, але сам Хрыстос Бог быў для вас правадыром да нябеснай бацькаўшчыны.

Радуйцеся, перамогшы ўсіх вашых праціўнікаў і ворагаў па шляху да Царства Нябеснага.

Радуйцеся, шчасьлівыя жыхары неба, спажываючы вечнае дабро, якога вока не бачыла і вуха не чула, якое на сэрца чалавеку не прыходзіла.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 6.

Прапаведваюць сьвятыя мошчы вашы лепей за ўсялякае красамоўства бясспрэчную надзею ўсеагульнага ўваскрэсеньня, калі Бог, не даючы і цяпер адданым сваім убачыць тленьне, выкліча яшчэ ў гэтым веку ўвесь род чалавечы, і ўсе вартыя стаць праваруч пасада Гасподняга, засьпяваюць Яму: Алілуя!

Ікас 6.

Зазьзяла новае сьвятло для ўсяе Рускай зямлі, калі міласэрны Бог паказаў веліч сваіх цудаў над нятленнымі вашымі мошчамі, якія з-за страху іншаверцаў другі раз схаваныя былі ў нетрах зямлі, пад спудам храма, і адтуль пасылалі шчодрыя выздараўленьні ўсім, хто з гарачаю малітваю зьвяртаўся да вашай праслаўленай іконы. Прыміце ж ад нас, сьвятыя мучанікі, гэтае стараннае ўсхваленьне:

Радуйцеся, яснапраменныя сьвяцілы Хрыстовай Царквы, якіх нельга было схаваць пад спудам.

Радуйцеся хуткія лекары душ і целаў нашых.

Радуйцеся, абаронцы нашыя ад шкодных іншаверных мудраваньняў.

Радуйцеся, сьветлыя правадыры нашыя да праўдзівага Богапазнаньня

і Богаўшанаваньня.

Радуйцеся, шчырыя малельнікі нашыя прад Госпадам.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 7.

Жадаючы праславіць Госпада Бога, дзіўнага ў сьвятых Сваіх, не знаходзім патрэбных словаў, каб годна ўхваліць Яго, але вас, сьвятыя мучанікі, клічам на дапамогу, маліцеся за нас старанна, каб нам неасуджана адважыцца прасьпяваць Госпаду: Алілуя!

Ікас 7.

Новаяўленымі мучанікамі назвала вас Праваслаўная Царква, як маці, што цешыцца дзецьмі сваімі, і як першыя мучанікі па ўсім сьвеце сваімі пакутамі ўмацавалі Божую веру, падобна і вы, новаяўленыя мучанікі, гэтак жа ўмацавалі сьвятую веру на месцы зямной бацькаўшчыны вашай, бо ніякія подступы іншаверцаў не могуць пахіснуць яе, і мы ўдзячна молімся да вас:

Радуйцеся, моцныя стаўпы Праваслаўя, імі ж красуецца і ўмацоўваецца сьвятая Царква.

Радуйцеся, умелыя стырнавыя, бо добранадзейна вядзеце нас між часовых хваляваньняў да прыстанішча вечнага жыцьця.

Радуйцеся, памагатыя нашага апраўданьня.

Радуйцеся, бо малітвамі вашымі мы збаўляемся ад усялякай дэманскай спакусы, што шукае злавіць нашы душы.

Радуйцеся, дабрадзеі нашыя, бо паказваеце нам шлях да збавеньня.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 8.

Дзівосна і чалавечаму розуму недасяжна, як адкрыта яўлены нам цуд усемагутнасьці Божай паўстае ў нятленьні вашых сьвятых мошчаў, якія звыш паўтысячы гадоў існуюць непашкоджанымі ад разбуральных стыхіяў і ад ўсёпаглынальнага часу, заахвочваючы нас расчулена сьпяваць Госпаду: Алілуя!

Ікас 8.

Усе радасьці веку гэтага, увесь гонар вашай пасады і ўсю моц вашых сіл вы аддалі, сьвятыя мучанікі, у ахвяру Збаўцу Богу і ўзнагароджаны ад Яго домам ў нябёсах, дзе ні чарвяк, ні тля не зьнішчае, ні злодзей не

падкопвае і не могуць украсьці дараванай вам спадчыны.

Радуйцеся, бо вы мудрыя шукальнікі Царства Божага, падобныя да евангельскага мужа, які, знайшоўны на полі скарб схаваны, усё прадае, што мае, і купляе тое поле каштоўнае.

Радуйцеся, вы знайшлі адзін шматкаштоўны бісер, які ёсьць Царства Божае, і за яго аддалі ўсе даброты сьвету гэтага.

Радуйцеся, лепш за мудрых веку гэтага зразумелі моц быцьця зямнога.

Радуйцеся, сьвятыя прапаведнікі, абвяшчаючы з вашае ракі, што нічога не варты хваляваньні цяперашняга часу перад будучай славай Царства Нябеснага.

Радуйцеся, грамадзяне нябесныя і саўдзельнікі ўсім сьвятым.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 9.

Усялякія няшчасьці, хваробы і ўціскі нашыя вы сунімаеце, сьвятыя мучанікі, і змрочныя сурокі падступных дэманаў далёка ад нас адганяеце, каб мы такою вашаю дапамогаю і ласкаю Божаю ўратаваныя, удзячным і радасным голасам сьпявалі Богу: Алілуя!

Ікас 9.

Красамоўства чалавечае слабне, жадаючы праславіць вас, сьвятыя мучанікі, за вашыя пакуты, якія вы перанесьлі за Хрыста, і за вашу пакутную сьмерць. Цяпер жа, вашаю любоўю пераможаныя, старанна намагаемся ўславіць вас:

Радуйцеся, усьцешаныя анёльскім абліччам за ваша цярпеньне за Хрыста і пакуты.

Радуйцеся, бо паўстаўшы прад пасадам Гасподнім, вы мелі гонар пакланіцца Яму і атрымаць ад Яго вечную ўзнагароду.

Радуйцеся, жыхары сьветласьцяў сьвятых, дзе няма ні хваробы, ні тугі, ні смутку.

Радуйцеся, суцяшальнікі ўсіх гнаных і пакутнікаў за Хрыстову веру.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 10.

Збавеньня і вечнага супакою дасягнуўшы пасьля шматпакутнага зямнога жыцьця , вы і нас, сьвятыя мучанікі, навучаеце той адзінай дарозе да збавеньня ў гэтым сьвеце ліхім і падступным, каб усё цярпліва пераносілі дзеля Хрыста, сьпяваючы старанна: Алілуя!

Ікас 10.

Сьцены пячорнага храма, дзе нятленна спачываюць вашы гаючаносныя целы, асьвятляюцца нібы нябесны палац, і ўсе, хто шукае збавеньня, прыходзяць да вас, сьвятыя мучанікі, з мольбамі, з удзячнасьцю і пахвалой:

Радуйцеся, хадатаі нашыя перад пасадам Нябеснага Судзьдзі жывых і мёртвых.

Радуйцеся, бо ніводзін, хто шукаў у вас дапамогі, не адыходзіць ад вас ні з чым.

Радуйцеся, шчодрыя падавальнікі нам Божае ласкі.

Радуйцеся, узрадаваныя ў нябёсах, бо і нас на зямлі ўмацоўваеце у радаснай надзеі вечнага збавеньня.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 11.

Да сьпеваў анёльскіх на нябёсах далучылі вашыя прападобныя галасы вы, сьвятыя мучанікі, разам зь нябеснымі чынамі несупынна славіце Госпада Бога, і мы, нявартыя, спадзеючыся на міласэрнасьць Божую, адважваемся на зямлі нягоднымі вуснамі і ўдзячным сэрцам сьпяваць Яму: Алілуя!

Ікас 11.

Ясназорнага дня ўсеагульнага ўваскрэсеньня і страшнага суда Божага чакаючы, мы жахаемся ліхіх нашых учынкаў і цяжкіх грахоў, імі ж увесь час гнявілі Творцу і Збаўцу нашага: але, маючы вас, сьвятыя мучанікі, заступнікамі за нас перад Госпадам з удзячнасьцю молімся да вас:

Радуйцеся, бо мы па Богу і па Прачыстай Вечна Дзеве Багародзіцы усю нашу надзею на вас ускладаем.

Радуйцеся, бо вы не пасароміце нас у спадзяваньні нашым.

Радуйцеся, бо малітвамі вашымі мы спадзяёмся атрымаць дараваньне грахоў і жыцьцё вечнае.

Радуйцеся, дабраславёныя Айцом Нябесным, вы атрымалі падрыхтаванае вам Царства ад стварэньня сьвету.

Радуйцеся, бо і мы вашым заступніцтвам спадзяёмся пазьбегнуць долі тых, хто стане зьлеваруч прастола Судзьдзі.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 12.

Вы, ласку цудоўных выздараўленьняў і хуткага хадайніцтва за нас перад Госпадам маючы, не пераставайце, сьвятыя мучанікі, заўсёды дапамагаць нам, а мы дзякуем за вас Хрысту Богу і молімся Яму: Алілуя!

Ікас 12.

Сыпяваючы ваша сьветлае праслаўленьне на небе і на зямлі, дзякуем усеміласьціваму Збавіцелю і Богу нашаму, Які , трымаючы ў Сваёй руцэ часіны і леты, меў ласку паспрыяць праславіць і адкрыць нам вас, сьвятыя мучанікі, у патрэбны для нашага збавеньня час, каб мы не ўтапіліся ў багне пагібельных страсьцяў і неразумных імкненьняў, дзеля гэтага узносім да вас нашае шчырае добрахваленьне:

Радуйцеся, неадступныя вартавыя нашага збавеньня, бо засьцерагаеце нас ад усялякага няпрыязнага нагавору.

Радуйцеся, ахоўнікі нашы, бо адганяеце ад нас усякую шкодную спакусу.

Радуйцеся, умудраныя настаўнікі нашыя непахіснага і цьвёрдага вызнаньня праваслаўнай веры.

Радуйцеся, магутнагалосыя арганы ласкі Божае, якая напаўняе Праваслаўную Царкву.

Радуйцеся, вялікія суайчыньнікі нашыя, бо ўсім нам жадаеце і дапамаеце ўратавацца.

Радуйцеся, сьвятыя мучанікі Антоніе, Іаане і Яўстафіе!

Кандак 13.

О, праслаўленыя і сьвятыя мучанікі: Антоніе, Іаане і Яўстафіе, прыміце гэтае малое, але шчырае наша маленьне, і вашым хадайніцтвам у Хрыста Бога пазбаўце нас ад усіх хваробаў душы і цела і ад ўсялякае бяды і напасьці, каб мы заўсёды, дзякуючы за вас Госпаду Богу, радасна сьпявалі: Алілуя!

Гэты кандак гаворым тройчы, пасьля Ікас 1, пасьля кандак 1.

(Пераклад Анатоля Клышкі).

ПЕРАНЯСЕНЬНЕ ЧАСЬЦІЦАЎ МОШЧАЎ СЬВЯТЫХ ВІЛЕНСКІХ МУЧАНІКАЎ АНТОНІЯ, ІААНА І ЯЎСТАФІЯ 24-26 ЛІПЕНЯ 1993Г. З ВІЛЕНСКАГА СЬВ.ДУХАВА МАНАСТЫРА Ў МЕНСКІ СЬВ.ПЕТРА-ПАЎЛАЎСКІ САБОР.



Асьвячэньне іконы каля мошчаў сьвятых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія ў крыпце Віленскага Сьв.Духава сабора (злева).

Хрэсны ход у Ракаве.

Сустрэча іконы з мошчамі у Менску 25.07.93г.



Малебен перад іконаю 26.07.93г. у Менскім Сьв.Петра-Паўлаўскім саборы, дзе ікона з мошчамі мае пастаяннае месцазнаходжаньне.

Фотарэпартаж
Уладзіміра Літоміна.

ІСТАПОМНЫЯ СКАЗАНЬНІ ПРА ПАДЗЬВІЖНІЦТВА СЬВЯТЫХ І БЛАЖЭННЫХ АЙЦОЎ

(Старажытны пацярык)

Нехта спытаўся ў авы Антонія: чым належыць кіравацца, каб дагадзіць Богу? Старац адказаў: пільнуйся таго, што запавядаю табе. Куды б ты ні пайшоў, май Бога перад вачыма, што б ні рабіў, май на тое падставы ў Сьвятым Пісаньні, у якім бы мейсцы ні знаходзіўся, не прысьпешвай сябе пайсьці адтуль. Пільнуйся гэтых трох запаветаў і ўратуешся.

Ава Памва спытаўся ў авы Антонія, што належыць яму рабіць, каб збавіцца? Старац адказаў яму: не спадзявайся на сваю праведнасьць, не шкадуй таго, што мінула, і ўгамані свой язык і чэрава.

Блажэнны Рыгор казаў, што ад кожнага чалавека, які атрымаў хрост, Бог патрабуе тры наступныя рэчы: шчырай веры ягонае душы, праўдзівасьці словаў і цнатлівасьць цела.

Ава Евагры расказваў: аднаму інаку паведамілі пра сьмерць ягонага бацькі; той сказаў вестуну: не зьневажай — мой бацька бесьсмяротны.

Адзін брат прасіў аву Ісаю прамовіць слова. Старац кажа яму: калі хочаш пасьлядоўнічаць Госпаду нашаму Ісусу Хрысту, то захоўвай слова Ягонае і пазбаўляйся старазапаветнага чалавека, калі хочаш прыляпіцца да Госпада, то мусіш да канца дзён адсякаць тых, хто аддаляе цябе ад крыжа, і падрыхтоўвацца да цярпеньняў зьнявагі, мусіш са спакоем ставіцца да тых, хто творыць зло ў дачыненьні да цябе, хто жадае панаваць над табой, мусіш захоўваць цішу ўнутры сябе і нікога не асуджай ў сэрцы тваім.

Ава Іаан Колаў казаў: хачу, каб з ціхмянамудрасьцю шукаў чалавек усіх цнотаў. Так, штодня, устаючы рана, падступайся да кожнае цноты і запаведзі Божай з найвялікшым страхам, цьвёрдасьцю і цярпеньнем, з сэрцам поўным любові да Бога, усяляк падрыхтоўвай душу і цела. Рабі гэта са скрухаю ў сэрцы, захоўваючы яго ў чысьціні. Будзь у працяглай малітве, у чысьціні словаў тваіх і яснасьці зроку. Калі ганьбяць цябе, не ўпадай у гнеў, будзь міралюбівы, не адплочвай злом на зло, не звяртай увагі на зьнявагі, не ўвазнось сябе ў думках, але пачувайся ніжэйшым за ўсякае стварэньне; пагарджай цялесным і тленным, захоўвайся пад крыжом, жыві ў барацьбе, у жарбацтве духоўным, у справах і духу аскета, жыві ў посьце, у пакаяньні, у плачы, у подзьвігу змагарскім, у разважаньнях, у чысьціні і дабразычлівым стане душы; працуй, натхняючыся бязмоўнасьцю, будзь у начным няспаньні, у голадзе, смазе, галізне і працах. Зачыні труну сваю, быццам ты ўжо нябожчык, і кожнае гадзіны май сьмерць перад вачыма тваімі.

Ава Касьян расказваў пра аднаго айца па імені Іаан, што той быў вялікі ў гэтым жыцьці. Калі надышла сьмерць, і ён з радасьцю і спакойна адыходзіў да Госпада, абкружылі яго браты і прасілі, каб ён пакінуў ім у спадчыну якое-небудзь кароткае і збаўленчае павучаньне, паводле якога можна было б дасягнуць дасканаласьці у Хрысьце. Ава ўздыхнуў і сказаў: я ніколі не тварыў свае уласнае волі, нікога не павучаў у тым, чаго сам папярэдне не дасягнуў.

Брат спытаўся ў старца: якую б мне добрую справу рабіць праз усё маё

жыцьцё? Старац адказаў: Бог ведае пра тое, што ёсьць добрае. - Я чуў, як нехта са старцаў пытаўся ў вялікага авы Нісьцяроя, сябры авы Антонія: якую б добрую справу мне рабіць? Ава адказаў яму: ці ж не ўсе справы роўныя? Пісаньне кажа: Аўрам быў дзіўналюбны, - і Бог быў разам з ім; Ільля любіў бязмоўнасьць, - І Бог быў разам з ім; Давід быў ціхмяны, - і Бог быў разам з ім. Такім чынам, вырашай: чаго прагне твая душа, тое і рабі і сэрца сваё захоўвай ў чысьціні.

Ава Фама, набліжаючыся да сьмерці, сказаў дзецям сваім: не жывіце герэтыкамі; не знаёмцеся з людзьмі знакамітымі; не працягвайце рук вашых, каб зьбіраць, але працягвайце іх, каб раздаваць.

Старац сказаў: хто не прымае кожнага як брата свайго, але перабірае, той недасканалы.

Яшчэ казаў: пакліканьне хрысьціяніна - пасьлядоўнічаць Хрысту.

Пра тое, што мусім стараннa шукаць бязмоўнасьці

Ава Антоні казаў: як рыба, што доўга знаходзіцца на сушы, памірае, гэтак жа і манахі, пакідаючы на доўгі час кельлю і жывучы сярод тлуму людскога, страчваюць здольнасьць да подзьвігу бязмоўнасьці. А таму, як рыба мусіць захоўвацца ў вадзе, гэтак і мы - у кельлі, каб па-за ёй не пазбавіцца чуйнасьці і не страціць пільнасьці.

Яшчэ казаў: хто жыве ў пустэльні і ў бязмоўнасьці, той вольны ад трох спакусаў: ад спакусы слыху, слова і зроку; адну толькі спакусу мае - у сэрцы сваім.

Ава Дыядох казаў: як у лазьні, дзе праз дзьверы, што часта адчыняюцца, пара выходзіць вонкі і гарачыня хутка спадае, гэтак і душа, калі яна жадае часта гаварыць, губляе свою цеплыню праз дзьверы славесныя, хай сабе і прамаўляла яна добрае. Ва ўсякія часы маўчаньне прыдатнае для душы; яно спараджае мудрасьць думак затоеных.

Ава Дула казаў: калі вораг прымушае вас пакінуць бязмоўнасьць, адпрэчвайцеся слухаць яго, таму што нічога немагчыма прыраўнаць да поста і бязмоўнасьці. Яны дапамагаюць у змаганьні з ворагам, бо праз унутраное бачаньне абвастраюць зрок.

Яшчэ казаў: пазьбягай сварак і адсякай хаценьні, каб не замуціўся розум твой і не парушыўся стан бязмоўнасьці.

Ава Ніл казаў: хто любіць бязмоўнасьць, таго не джаляць стрэлы ворага, хто ж увесь час з людзьмі, атрымлівае ад іх раны. У адзіноце дух набывае спакой; суцішаная пажаднасьць прызвычайваецца слухацца слова, страсьць, наогул, калі не ўзбуджаць яе, глыбока маўчыць, мінае і зусім заціхае. Нарэшце з цягам часу чалавек забываецца на сваю былую дзейнасьць і застаюцца толькі адны слабыя ўспаміны пра справы ягоныя, калі надыходзіць стан бязмоўнасьці.

Расказвалі пра аву Агафона, што на працягу трох год ён укладваў сабе ў вусны камень, пакуль не навучыўся маўчаньню.

Ава Ісая казаў: любі болей маўчаць чымсьці гаварыць, таму што праз маўчаньне чалавек зьбірае скарбы, а праз языкатасьць раскідвае іх. Брат спытаўся ў авы Памвы: ці добра хваліць бліжняга? Добра, - адказаў ава Памва, - але лепш змаўчаць.

Старац сказаў: будзем жывіцца словамі Божымі, цешыцца аповедамі сьвятых айцоў, - не дагаджаючы чэраву, але падтрымліваючы весялосьць духоўную.

Пра тое, што нічога не трэба рабіць напаказ

Ава Ісая казаў: хто любіць, каб яго хвалілі, не можа не мець зайздрасьці ў сэрцы сваім, а маючы зайздрасьць, не можа асягнуць ціхмянамудрасьці; такі чалавек здрадзіў сваёй душы і аддаў яе ворагам, якія ўцягваюць яе ў зло і даводзяць да пагібелі.

Яшчэ казаў: забі ў сабе славалюбства і ўдастоішся славы Божай ў будучым веку.

Аднаго разу да авы Хведара Фермейскага прыйшоў брат і пражыў каля яго тры дні, просячы, каб той зьвярнуўся да яго са словам. Але ава не вымавіў ані слова, і брат, засмучаны, пайшоў ад яго. Вучань авы кажа яму: ава, чаму ты не сказаў брату слова? Ён пайшоў ад цябе засмучаны. Старац адказаў яму: я не сказаў яму слова, таму што ён гандляр і хоча ўславіцца праз словы іншых.

Ава Нісьцярой вялікі неяк прагульваўся з братам у пустэльні. Убачыўшы цмока, яны кінуліся ўцякаць. Брат кажа яму: і ты, ойча, маеш страх? - Старац адказаў: не, сыне, я не спалохаўся; але мусіў уцякаць, - бо не ўдалося б мне ўцячы ад духа славалюбства.

Ава Пімен казаў: хто прагне здабыць любоў людскую, той пазбаўляе сябе любові Божай. Не добра будзе ўсім падабацца, - бо сказана: "Гора вам, калі ўсе людзі будуць гаварыць пра вас добра" /Лук. 6, 26/.

Сьвятая Сінкліцыкія сказала: немагчыма ў адзін і той жа час быць і травой, і насеньнем; гэтак жа немагчыма, маючы славу мірскую, узрасьціць плод нябесны.

Адзін старац казаў: хто адкрывае свае добрыя ўчынкі і ўсім расказвае пра іх, падобны да таго, хто кідае насеньне на неўзараную глебу: прылятаюць птушкі нябесныя і зьядаюць насеньне. Той жа, хто хавае сваё добрае жыцьцё, падобны да сейбіта, які кідае насеньне ў ральлю - ён зьбярэ добры ўраджай.

Пра тое, што мы не павінны нікога асуджаць

Адзін брат, які зграшыў, быў выдалены прэсьвітэрам з царквы. Ава Вісарыён падняўся і выйшаў разам з ім , кажучы: і я ж таксама грэшны.

Ава Ісая сказаў: калі наведае цябе думка асудзіць бліжняга за нейкі грэх, то спачатку падумай пра сябе: ці не грэшны ты больш за брата свайго?

Ава Ісак Фівейскі прыйшоў ў кіновію, убачыў брата, які ўпаў ў грэх і асудзіў яго. Вярнуўшыся ў пустэльню, ён убачыў Анёла Гасподняга, які стаў перад дзьвярыма ў кельлю, кажучы: не дам табе ўвайсьці. Ава ўпрошваў яго, кажучы: якая прычына гэтага? Анёл адказаў яму: Бог паслаў мяне да цябе, кажучы: спытайся ў яго, куды загадвае ён Мне кінуць брата, што зграшыў? - Ава Ісак адразу ж упаў ніцма, кажучы: зграшыў я перад Табою, Госпадзе, даруй мне. Анёл кажа яму: падыміся, Бог дараваў табе, але надалей сьцеражыся асуджаць брата, якога Бог яшчэ не пасьпеў асудзіць.

Брат спытаўся ў авы Пімена: калі стануся сьведкам грэхападзеньня брата майго, ці добра будзе, калі ўтою грэх ягоны? - Старац кажа яму: калі мы пакрываем правіны брата свайго, Бог пакрые і нашыя правіны, а калі будзем выкрываць грахі брата, Бог абвесьціць пра нашыя грахі.

Адзін з айцоў, убачыўшы чалавека, што зграшыў, кажа са скрухай: вось гэты сёньня аступіўся, а я - заўтра.

Старац сказаў: калі хто зграшыў прад табой, не асуджай яго, але лічы сябе большым грэшнікам за яго.

Некаторыя з айцоў пыталіся ў авы Пімена: калі убачым брата, што грашыць, - ці дазволіш выкрыць яго? - Старац адказаў ім: калі выпадае мне праходзіць праз тое месца, дзе магу ўбачыць брата, што грашыць, праходжу міма і не выкрываю яго.

Пра разважлівасьць

Брат сказаў аву Антонію: памаліся за мяне. Але старац сказаў яму: ні я, ні Бог не зьлітуюцца над табою, калі сам не зьлітуешся над сабою і не дагодзіш Богу.

Ава Агафон сказаў: гняўлівы чалавек, хай сабе ён і ўваскрасіў памерлага, не будзе ўгодны Богу.

Брат прыйшоў да аднаго старца і кажа яму: ава, скажы мне, як уратавацца? Старац кажа яму: калі ты хочаш уратавацца, дык калі да каго прыйдзеш, не пачынай гаворкі, пакуль не запытаюцца ў цябе. Брат, уражаны гэтымі словамі, пакланіўся старцу і сказаў: сапраўды, шмат кніжак я прачытаў, але такой навукі яшчэ не чуў. І пайшоў, маючы ад гэтага вялікую карысьць.

Ава Ісая казаў: хто карыстаецца хітрасьцю ў дачыненьнях з братам сваім, той не пазьбегне смутку у сэрцы сваім.

Ава Ісідор казаў: калі абраў шлях Божы, не ганарыся тым, што посьціш. А калі будзеш выхваляць, дык якая карысьць з посту? Лепш есьці чалавеку мяса, чымсьці самога сябе ўзьвялічваць ды фанабэрыцца.

Брат спытаўся ў авы Макарыя: як уратавацца? - Старац адказаў яму: будзь як памерлы, не думай ні пра крыўды людскія, ні пра славу, - і ўратуешся.

Ава Макары сказаў: калі будзем памятаць пра злое, што прычыняюць нам людзі, то наша памяць пра Бога будзе паступова занепадаць, калі ж будзем памятаць пра зло, што прычыняюць нам бесы, то пазьбегнем іхніх ужыгнаньняў.

Ава Матой казаў: д'ябал не ведае, праз якое цялеснае хаценьне душа будзе пераможана. Ён сее і не ведае, ці будзе ўмалот. Сее хаценьні блудадзейства, зласлоўя ды іншых, і, гледзячы на тое, да якога хаценьня душа выяўляе схільнасьць, тое хаценьне і ўкладвае.

Ава Пімен казаў: па мне лепш той чалавек, што грашыць, усьведамляе свае правіны і каецца, чымсьці той, які не грашыць і не мае пакоры. Першы ўважае сябе за грэшніка і набывае пакорлівасьць у думках сваіх, а другі ўяўляе сябе праведнікам, быццам ён праведны, і ўзносіць сябе.

Яшчэ ава Пімен сказаў: не жыві у тым месцы, дзе ты бачыш, што табе зайздросьцяць, бо не будзеш мець посьпеху.

Старац сказаў: калі душа мае толькі слова, а не мае ўчынкаў, яна падобная на дрэва, якое мае кветкі, а плоду не дае.

Адзін з айцоў сказаў: жорсткае слова і добрых робіць дрэннымі, а лагоднае слова прыносіць карысьць кожнаму.

Малітвамі сьвятых і блажэнных айцоў памілуй і ўратуй нас, Госпадзе.

(Пераклад А. Анціпенкі)

ДУХОЎНАЯ ПАЭЗІЯ

Съвяты Сава
(Растка Нэманіч, 1175-1235)

СЛОВА ПРА ПАКУТЫ

З неразумным статкам яднаюся
і да яго ўпадабляюся,
калі бяднею на добрыя дзеі,
а багацею на пажады,
трапляючы пад іх уладу,
адхіляюся ад боскае волі,
асуджаны Богам,
аплаканы анёламі,
калі жыву бесам на кпіны,
у дакор свайму сумленьню,
з ганьбаю ліха ўчыненага.

І яшчэ да сьмерці паміраю,
і яшчэ да Суда прысуд маю,
і яшчэ да пакутаў бясконцых
у роспачы сам сабе пакуты ўчыняю.

СЛОВА ПРА РОЗУМ

Каб розуму нашаму быць
дачынным да неба вышыняў,
да хараства райскага,
да прытулку вечнага,

да хору анёльскага
у тым жыцьці. . .

Што ж назапасіць павінны
людзі ўсе
ад Адама да калена астатняга!. .

Дзеля гэтага мы,
браты мае дарагія,
мусім старацца і ў тузе
адчуваць сябе
на сьвеце гэтым,
як па-за ім,
такімі ўяўляць сябе,
якім жыцьцё даруецца на нябёсах.

Пераклад з сербскай Івана Чароты

А.Ляскоў

ГАРАДЗЕНСКАЯ КАЛОЖА.

На беразе нястомнае ракі,
Бы цень стагодзьдзяў ў камені застылых,
Адбітак сноў анёлаў белакрылых
Ляціш, Каложа, лёгка праз вякі.
Краса усмешкі юнай крывічанкі
І цеплыня вачэй сівых дзядоў
Мацуюць тканы пас тваіх муроў
Ды разам з сонцам асьвятляюць ранкі.
Жаўронкаў сьпеў і пах чароўны хлеба,
І ваяроў ахвярную крывю
Ўсмактала ў цэглу ты сваю,
Сабой зямлю злучыўшы з небам.
Бывае, калі сілы на мяжы,
І сэрца захлынаецца ў цемры,
Разгоняць думак цёмных-цёмных хеўры
Праменьнямі любві твае крыжы.
О міласэрны ўсемагутны Божа!
Хвала Табе за ўсё, што даў Ты нам,
Нямоглым, грэшным дочкам і сынам,
Хвала Табе за дар, які для нас - Каложа!

ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНЯ

БОГАСЛУЖБОВЫЯ СЬПЕВЫ Ў БЕЛАРУСІ: ТРАДЫЦЫЯ І СУЧАСНАСЬЦЬ.

Адрыў культуры ад яе рэлігійнай асновы не можа застацца без цяжкіх вынікаў. Крызісныя і ўпадніцкія зьявы ў культуры звычайна бываюць зьвязаныя з аслабленьнем рэлігійнага імпульсу, якое вядзе творчасьць да дэградацыі і амярцьвеньня...

Сапраўдны ж культурны росквіт немагчымы без інтэнсіўнага духоўна-рэлігійнага жыцьця. Сваім паходжаньнем і этыка, і метафізіка, і мастацтва, і натуразнаўства, як і іншыя сьферы праяўленьня чалавечае асобы, абавязаны рэлігіі. Мастацтва зарадзілася як культавае; навука і філасофія ўзьніклі як спробы асэнсаваць рэлігійны погляд на сьвет; мараль, права, сям'я базаваліся на запаведзях веры. Гэта тычыцца і мінулага, і сучаснасьці. Вера ў Бога сёньня, як і ў старажытнасьці, зьяўляецца стрыжнем, які надае ўнутраную інтэнцыю для разьвіцьця любой культуры, адухаўляе яе.

Неад'емная частка нашае роднае культуры — богаслужбовая музыка і пеўчае мастацтва старажытнай Беларусі — застаецца амаль недаследаванаю і нявывучанаю галіной.

Хрысьціянства прыйшло на Беларусь з Візантыі задоўга да афіцыйнага царкоўнага ўсталяваньня яго ў 992 годзе. Першыя сьвятары былі з Грэцыі, першыя росьпісы ў храмах рабілі грэцкія майстры, першыя дэместыкі (г.зн. знаўцы сьпеваў, якія кіравалі царкоўнымі хорамі і былі выкладчыкамі царкоўных сьпеваў) былі з Грэцыі, пеўчых таксама прывозілі адтуль. Мінулі доўгія гады, перш чым на Беларусі склалася самастойная і адметная пеўчая традыцыя.

Хрысьціянскія богаслужбовыя сьпевы пачалі шырока культывавацца на Беларусі не раней пачатку XI ст., калі ўсюды ўзводзіліся храмы, манастыры,

стваралася арыгінальная і распаўсюджвалася перакладная богаслужбовая літаратура. У аснове праваслаўных царкоўных сьпеваў на Беларусі ляжыць візантыйская традыцыя, якая грунтуецца на выкарыстаньні кварта-квінтавых ладоў усходняй музыкі. З часам выпрацаваліся свае адметныя рысы беларускага царкоўнага пеўчага мастацтва пад уплывам народнай творчасьці.

Аснова богаслужбовай музыкі - сістэма васьмігалосся, кожны з васьмі галасоў якой мае асобную нескладаную мелодыю або пагласіцу. Пагласіцы ранейшага перыяду не захаваліся, яны перадаваліся з пакаленьня ў пакаленьне праз вусную традыцыю. На падставе пагласіцаў ствараліся знаменныя напевы - музычныя запісы раньняга пеўчага мастацтва, зробленыя сьпецыяльнымі знакамі: знамёнамі. Пры гэтым кожная інтанацыя альбо матыў абазначаўся асобным знакам, які не вызначаў дакладнай вышыні і працягласьці гука і меў вельмі ўмоўнае значэньне. Знаменныя запісы зьяўляліся сродкам для аднаўленьня ў памяці раней завучаных на слых напеваў і абмалёўвалі толькі контур мелодыі.

З-за ўмоўнасьці саміх старажытных сьпеўных знакаў у знаменнай натацыі майстры сьпеваў маглі адыходзіць ад асноўных напеваў, вольна і творча іх зьмяняць і перапрацоўваць. У старажытным сьпеўніцкім мастацтве, у высокай прафесійнасьці царкоўных пеўчых ужываліся інтанацыйна матывы народнай музычнай мовы; у сваіх кампазіцыях сьпевакі карысталіся прыёмамі голасавядзеньня, мадуляцыі, разьвіцьця кантылены і кадансаваньня, уласьцівымі народнай песьні. Ладавыя, рытмічныя асаблівасьці пагласіцаў сустракаюцца ў былінной сьпеўніцкай творчасьці. Напевы пагласіцаў, як і старажытных былінаў, выконваліся ў рэчытатыўнай манеры, агульнымі зьяўляліся таксама прыёмы расьпеву мелодыяў. Было падабенства і ў выканаўчай манеры сьпевакоў, выканаўцаў старажытных былінаў і дэместыкаў-расьпеўшчыкаў, што несьлі кліраснае паслушэнства. Трэба зазначыць, што дэместыкамі зьяўляліся пеўчыя-мужчыны, якія атрымалі на тое асаблівае пасьвячэньне і для якіх кліраснае паслушэнства было справаю ўсяго жыцьця.

У наш час такія сьпевы можна пачуць толькі ў нешматлікіх манастырах. У выкананьні хора Андронікаўскага мужчынскага манастыра, хора сьвятароў Маскоўскай Патрыярхіі старажытныя знаменныя, дэмественыя, "пуцявыя" расьпевы гучаць на дзіва ўзвышана, адухоўлена, замілавана і велічна, нібы адчыняючы акно ў іншы сьвет. Гэтая манера сьпеваў, пазбаўленая сьвецкіх прыёмаў, мудрагелістасьці, адносіць дух ад мільтусьні мірской, напаўняючы душу малітоўнымі сьлязамі і малітоўным захапленьнем. Пасьля стагодзьдзяў панаваньня спачатку партэсных сьпеваў, а пасля сінадальнага абыходнага сьпеву, знаменны расьпеў (як ніякія іншыя напевы) адлюстроўвае сутнасьць праваслаўя, нясе ў сабе дух праваслаўя...

Дзякуючы таму, што на Беларусі з 16-га ст. распаўсюдзілася пяцірадковая натацыя, нашыя старажытныя, перакладзеныя з неўм на квадратны знаменны запіс (тады ж, у 16 ст.) напевы, нескладана прачытваюцца. Захаваліся нешматлікія крыніцы, як напрыклад, Супрасьскі ірмалагіён (1598 г.), Жыровіцкі ірмалагіён (1547 г.). У апошнім сустракаюцца заўвагі: "беларускае". У гэтых старажытных напевах ёсьць агульныя заканамернасьці, уласьцівыя

знаменным і дэмественным расьпевам, у спалучэньні з меладычнымі і рытмічнымі асаблівасьцямі нацыянальнай старажытнай музыкі.

Хор Праваслаўнага Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў пры Сьв.Петра-Паўлаўскім саборы г.Менска паступова ўводзіць ва ўжытак сучаснага царкоўнага богаслужэньня апрацаваныя для чатырохгалоснага выкананьня напевы з Жыровіцкага і Супрасльскага ірмалагіёнаў. Такая спроба адраджэньня і аднаўленьня богаслужбовых расьпеваў старажытнай Беларусі бачыцца нам зарукаю пераемнасьці наступнымі пакаленьнямі духоўнай спадчыны беларускага народа з тым, каб, творча ўспрыняўшы гэтую спадчыну, зрабіць яе дзейсным здабыткам духоўнага патэнцыялу нашага народа.

Л.Густава



ПРЫХАДСКОЕ ЖЫЦЬЦЁ

35-Я ЎГОДКІ ПРЫХОДА.

9 лістапада адбылася ўрачыстасьць 35-годзьдзя існаваньня і дзейнасьці праваслаўнага беларускага прыхода Св. Юрыя ў Чыкага. Гэты прыход уваходзіць у склад парафіяў Беларускай Царкоўнай Рады ў Паўночнай Амерыцы, якую ўзначальвае вікарны сьвятар протапрасьвітар Сьвятаслаў Коўш. Ён зьяўляецца адказным за духоўную апеку прыходаў Беларускай Царкоўнай Рады перад Экзархам Усяленскага Канстанцінопальскага Патрыярха на Паўночную і Паўднёвую Амерыку Архіепіскапам Іакавасам. Лічба 35 можа і не надта вялікая, у параўнаньні з мінулымі тысячагодзьдзямі і стагодзьдзямі, але, калі ўгледзецца ў лёс, у жыцьцядзейнасьць шчырых сыноў і дачок Беларусі, сьвядомых і, хачу падкрэсьліць, адданых дзяцей Праваслаўнай Царквы, якія ўсе гэтыя гады ўтрымоўвалі і адстойвалі праўдзівыя каноны Праваслаўя, - гэта значны і слаўны юбілей.

І вось, мне давялося пазнаёміцца з быцьцём праваслаўных беларусаў у далёкай краіне. З ініцыятывы сп. Міхася Калейніка, бласлаўленьня настаяцеля прыхода айца Якуба Піруты і згоды абшчыны адбыўся гэты візіт і наша добрае знаёмства. З першых крокаў па амерыканскай зямлі я адчуў самыя шчырыя і чулыя адносіны. І адразу ж апынуўся ў сапраўдным беларускім асяродзьдзі. Вельмі ўразіла тое, з якой любоўю, ахвярнасьцю, а калі і прынцыповасьцю, нашыя землякі на чужыне захоўваюць Веру і беларушчыну. Давялося пазнаёміцца з многімі беларусамі — гэта сапраўды цудоўныя і сардэчныя людзі. Не магу не згадаць сп. Марыю Калейнік, бо з самага пачатку і да апошняй хвіліны яна з вялікай дабрынёй і клопатамі яўляла хрысьціянскую дабрадзейнасць гасьціннасьці. Са шчырай вераю, энергіяй і мудрасьцю сп. Марыя шмат часу і сіл укладае ў жыцьцё абшчыны. Трэба

яшчэ зазначыць, што нашыя беларусы здолелі знайсьці пэўнае месца ў амерыканскім грамадстве дзякуючы сваёй працавітасьці, сумленнасьці, памяркоўнасьці, але ж і ўпартасьці. Які цудоўны мікраклімат дабрыні і спакою здолелі зрабіць муж і жонка Даніла і Лідзія Швэфель на сваёй маленькай сядзібе! Згадваючы сясьцёр Ніну і Марыю і многіх іншых трэба падкрэсьліць, што працавітасьць вельмі характэрная якасьць нашых суайчыньнікаў, і нам у гэтым яны даюць вельмі добры і патрэбны прыклад.

Каб лепш уявіць сабе сэнс гэтага сьвята трэба прыгадаць гісторыю. Галоўныя факты гісторыі прыхода Св. Юрыя ў Чыкага даў у сваім выступленьні адзін з арганізатараў прыхода Сакратар Царкоўнай Управы сп. Мікалай Латушкін. Цытуем непасрэдна ягоныя словы:

«Сьвяткуючы сёньня 35-гадовы юбілей прыхода, я дазволю сабе прыпомніць некаторыя, цяпер ужо гістарычныя факты прыхода, перыяду яго ўзьнікненьня і развіцьця.

Пытаньне Беларускага арганізаванага жыцьця ў Чыкага яшчэ нікім не вывучана, але ўсім вядома, што эмігранты з Беларусі, тады акупаванай Расеяй, тут былі ў другой палове 19-га стагодзьдзя, а на пачатку 20 стагодзьдзя тут існавалі арганізаваныя Зямляцтвы Беларусаў: Гародзеншчыны, Берасьцейшчыны, Меншчыны і т.д.

Пасьля Першай сусьветнай вайны і пралетарскай рэвалюцыі ў Расеі ды захвату на Беларусі ўлады бальшавікамі паявілася колькасная хваля палітычнай эміграцыі з Беларусі. Гэта былі інтэлігенты — палітычныя і грамадскія дзеячы Беларускай Народнай Рэспублікі, якая ў 1918 годзе нарадзілася на развалінах Расейскай імперыі.

У Чыкага апынуліся: Язэп Варонка — Прэзідэнт Рады БНР, Янка Чарапук-Змагар — пасол БНР, сп.Чопка, а.Іван Тарасэвіч, Макар Аблажэй і інш., якія закладалі асновы Беларускага арганізаванага жыцьця. Выдавалі газету, запачаткавалі радыёперадачы, якая нажаль доўга не праіснавалі з прычыны матэрыяльнае нястачы. Радыёперадачы паступова пераключаліся на расейскую мову пакуль зусім не абруселі. Цяпер закладзеная Я.Варонкам радыёперадача працягвае існаваць у эфіры як руская перадача "Волга боцман".

Яны ж пазьней заклалі Беларускую грамадскую арганізацыю пад назвай Беларуска-Амерыканская Нацыянальная Рада ў Чыкага, пяцідзесяты юбілей якой беларусы Чыкага адсьвяткавалі ў 1991 годзе.

Эміграцыя пасьля Другой сусьветнай вайны значна папоўніла сяброўства ў БАНРадзе Чыкага.

Неўзабаве з ліку сяброў БАНРады вылучылася група ініцыятараў лікам 12 асобаў, каб арганізаваць Беларускі праваслаўны прыход, зразумеўшы незамяняльную заслугу царквы у стабільнай, амаль штодзённай, абслузе сваіх вернікаў.

Сёньня я дазволю сабе тут скласьці вялікую падзяку тым 12 асобам, якія ўклалі свае сродкі, хто колькі мог, каб набыць царкоўны будынак. Разьлічваючы на сёняшнюю вартасьць доляра ці аплату працы, кожны з 12-ці унес 3-4 тысячы долараў ахвяры. Да гэтага кожны заабавязаўся за

сплату пазычкі ў банку сумай у адну тысячу долараў.

Плён самаахвярных рэлігійна-народных патрыётаў мы бачым сёньня. Ахвяры былі прынятыя Богам, яны удзесяцярыліся, Беларусы у Чыкага маюць свой праваслаўны храм.

Першымі ініцыятарамі набыцьця царкоўнага будынка былі:

1. Шфэфэль Даніла
2. Латушкін Мікола
3. Панкевіч Іван
4. Калтаноўскі Глеб
5. Пунтус Васіль
6. Новік Анатоль
7. Шасткоўскі Міхась
8. Загонак Кастусь
9. Новік Кастусь
10. Говін Мікола
11. Агалец Павел /старэйшы/
12. Фешчанка Віктар

Пяць з вышэй пералічаных: Калтаноўскі Глеб, Пунтус Васіль, Новік Анатоль, Шасткоўскі Міхась і Новік Кастусь сёньня ўжо не прысутнічаюць у сваім фізічным целе сярод нас.

Я прашу усіх прысутных ушанаваць іх памяць і ўсіх раней ці пазней адышоўшых парафіянаў у вечнасць хвілінай маўчаньня і сканцэнтраваннем сваіх думак пра іхнія бессмяротныя душы, адышоўшыя ад нас па волі Божай.

Арганізаваная парафія пад назвай "Сьв. Юрыя" была зарэгістравана ў Штатавых і гарадскіх уладах 5-га лістапада 1958 года.

Чартар падпісалі грамадзяне ЗША: Валтэр Багдановіч, Канстанты Загонек, Софія Латушкін.

25 мая была афармлена купча царкоўнага будынку. Паколькі пры купчы за нерухомую маёмасьць царкоўнага майна адказвала 12 чалавек — нерухомая маёмасьць лічылася прыватнай ўласнасьцю 12-ці.

Але з ростам ліку сем'яў парафіянаў па згодзе 12-ці ўласнікаў наступілі юрыдычныя зьмены ў стане прыналежнасьці нерухомай маёмасьці.

25-га кастрычніка 1964 года адбыўся Агульны сход правамоцных парафіянаў, на якім Старшыня Царкоўнай Управы сп.Д.Шфэфэль паінфармаваў прысутных пра ход перапісу нерухомай маёмасьці з ініцыятыўнай групы у складзе 12-ці асобаў на парафію, як рэлігійную карпарацыю.

На сходзе было выбрана 18 асобаў т. зв. трасты (трустыіес) — давераных. Старшынёй давераных выбраны сп. Д.Шфэфэль, а Сакратаром М.Латушкін.

З гэтага часу парафія, як рэлігійная карпарацыя, належыць амерыканскім грамадзянам беларускага паходжаньня.

Царкоўным адвакатам ад пачатку заарганізаванасьці прыхода зьяўляецца Др. права Юліан Куляс.

Парафія ўваходзіць у склад парафіяў Беларускай Царкоўнай Рады ў Паўночнай Амерыцы, якую ўзначальвае вікарны сьвятар Протапрасьвітар Сьвятаслаў Коўш. Ён зьяўляецца адказным за духоўную апеку прыходаў Беларускай Царкоўнай Рады перад Экзархам Патрыярха Архіепіскапам Іакавасам Грэцкай Праваслаўнай Архідыяцэзіі на Паўночную і Паўднёвую Амерыку.

Царква Сьв.Юрыя ў Чыкага

Парафія за свой 35-гадовы век - не такі ўжо і кароткі - перажывала часы радасьці і хвіліны смутку так, як і душа кожнага жывога чалавека ў яго жыцьцёвай дарозе.

Тут у царкве маладыя людзі вянчаюцца з верай атрымаць Божую ласку у сваім непрадбачаным жыцьцёвым шляху, тут народжаныя дзеці прымаюць тайну хрышчэньня, тут адпяваюць адышоўшых у невядомую вечнасьць, тут вера ў Бога палягчае душэўныя людзкія пакуты, тут з Богам мы інтуітыўна абнаўляем нашую любоў да нашых продкаў, да роднай зямлі, дзе мы нарадзіліся. Тут наша Быцьцё.»

Сама сьвяточная падзея адбылася ўрачыста і з вялікім посьпехам. Божую Літургію ачаліў епіскап Іакавас, прадстаўнік Усяленскага Патрыярха. Сьпяваў вялікі хор, якім кіраваў айцец Мечыслаў. Людзей сабралася поўная царква. Прыйшло шмат вернікаў з іншых прыходаў, нават здалёк прыехалі сябры і знаёмыя. Тут трэба адзначыць адну сучасную акалічнасьць. Цяпер значную частку прыхода складаюць праваслаўныя, якія прыехалі ў Амерыку з Польшчы, дакладней з Беласточчыны - таксама беларусы. І яны атрымалі ад мясцовых беларусаў падтрымку і дапамогу з жыльлём, уладкаваньнем на працу і г. д. Некаторыя зрабілі з посьпехам кар'еру, ужо самі шчыра дапамагаюць і актыўна

ўдзельнічаюць ў царкоўным жыцьці. Аляксандр Шышка і Анатоль Тапалеўскі — выдатныя людзі, вельмі здольныя, імі праваслаўныя беларусы ў Чыкага справядліва ганарацца. А інж. А.Шышка быў абраны Старшынёй Царкоўнай Управы. Актыўна прымае ўдзел ў прыходскім жыцьці таксама і сп. Таісія Шышка, руплівa выконвае розныя паслушэнствы ў царкоўным сястрынстве.

Пасля Богаслужэньня, пропаведзі і словаў віншаваньня ўсе накіраваліся ў прыходскую залу Сербскага прыхода, дзе адбылася другая частка ўрачыстасьці: сьвяточны абед і канцэрт. Афіцыйныя словы, прывітаньні і віншаваньні зьмяніліся шчырымі сяброўскімі прамовамі. Нарэшце канцэрт далі "Сябры" - вядомы ансамбль з Менска.

Усё адбылося прыгожа і ўдала. Людзей было больш як дзьвесце. Гэтая падзея яскрава засьведчыла жыцьцёвасьць Праваслаўя ў беларускім асяродзьдзі ў ЗША. Скажу больш, беларусы могуць застацца беларусамі, калі ўтрымаюцца ў праваслаўнай тысячагадовай традыцыі нашай культуры. М.Бярдзяеў некалі слушна сказаў: "Без традыцыі ў гістарычным лёсе народа няма ні пераемнасьці, ні сэнсу".

Гэтыя высновы яшчэ больш падцьвердзілі далейшыя паездкі і знаёмствы. Па запрашэньні айца Мечыслава Брынкевіча і абшчыны Сьвята-Еўфрасіньнеўскай царквы ў Саўт-Рыверы (Нью Джэрсі) я апынуўся на ўзьбярэжжы Атлантычнага акіяна. Самалётам з Чыкага я прыляцеў у аэрапорт Ньюўарк, дзе мяне ветліва сустрэлі спадары Міхась Сенька і Лявонцій Высоцкі. Хачу адзначыць цікавае назіраньне. Усе сустрэчы і знаёмствы былі такімі шчырымі і беларускімі па духу, што мне трэба было зрабіць пэўнае намаганьне, каб усьвядоміць, што ўсё гэта адбываецца за 9 тысяч кіламетраў ад Бацькаўшчыны, у далёкай Амерыцы.

Дзякуючы нябожчыку айцу Мікалаю Лапіцкаму, духоўнаму кіраўніку, сьвядомаму і вельмі адказнаму чалавеку, сапраўднаму верніку і праваслаўнаму хрысьціяніну Саўт-Рыверскаму прыходу ўдалося адысьці ад палітычых страсьцяў і плыняў. Вакол яго сабраліся цудоўныя людзі, якія наладзілі актыўнае духоўнае і культурнае жыцьцё. Хрысьціянскае па мэтах і нацыянальнае па зьмесьце.

Як можна правільна і добра спалучыць праваслаўнае царкоўнае жыцьцё і нацыянальнае, я пабачыў на прыкладзе Чыкагскага і Саўт-Рыверскага прыходаў. Апошні прыход не толькі пабудаваў царкву, але агульнымі намаганьнямі прыхаджане пабудавалі цэлы комплекс, дзе ўтварылі прыходскую залу, Беларуска-Амерыканскі цэнтр, невялічкую друкарню. Тут рэгулярна выдаюцца царкоўна-грамадскі часапіс "Царкоўны Сьветач", царкоўныя календары, брашуры і шмат чаго іншага. Але самая вялікая каштоўнасьць Сьвята-Еўфрасіньнеўскага Саўт-Рыверскага прыхода — гэта архіў і бібліятэка. Я вельмі ўдзячны паважанаму спадару Міхасю Сеньку за магчымасьць наведаць гэты архіў, каб уявіць сабе яго значнасьць і каштоўнасьць для нашай гісторыі і культуры. Гэта вельмі каштоўная крыніца, якая плённа можа паслужыць цяпер, у часы беларускага адраджэньня. Спадзяюся, што Лабараторыя Царкоўнай Гісторыі, што пры Беларускім Праваслаўным Брацтве Трох Віленскіх Мучанікаў, нейкім чынам зможа далучыцца да гэтай крыніцы.

З вялікай духоўнай радасьцю мне давялося адправіць Сьвятую Літургію ў

Агульны здымак прыходжанаў і гасцей у 35 угоды прыхода св. Юрыя (у цэнтры - Архіепіскап Якавас - прадстаўнік Усяленскага Патрыярха).

Сьв. Еўфрасіньнеўскай царкве. Гэта цудоўная, прыгожая царква, уладкаваная з вялікай любоўю і густам, безумоўна, у добрай народнай традыцыі. Пасьля Літургіі адбыўся абед з добрымі размовамі і сьпевамі. За тыя некалькі дзён мне шмат чаго паказалі, шмат дзе ўдалося пабываць, дзякуючы майстэрству і цярплівасьці спадара Лявонція Высоцкага, нашага "драйвэра", як кажуць тутэйшыя, а спадар Міхась Сенька паказаў сябе цудоўным штурманам. З вялікай удзячнасьцю ўспамінаю сям'ю Касьцюкоў, паважаных спадара Мікалая і спадарыню Рэню, якія ветліва запрасілі да сябе, дзе я кватараваў і дзе зноў адчуў шчырасьць і сардэчнасьць беларусаў. Добрая сустрэча і размова адбылася ў сям'і Цярпіцкіх. Вельмі глыбокае ўражаньнне засталося ад вячэрняй сустрэчы з паважаным спадаром Барысам Данілюком. Гэта была шчырая размова па розных пытаньнях і розных праблемах. Вельмі важна і далей сустракацца, весьці размовы, падтрымліваць сувязь і кантакты. Моцнае ўражаньне засталося ад сустрэчы з паважанай спадарыняй Леанілай Каліноўскай. Гэта мужная жанчына, мэтанакіраваная і з моцнай воляй. Яе праца і дзейнасьць дзеля стварэньня магчымасьці інвалідам паўнацэнна ўдзельнічаць у жыцьці мае значэньне агульнадзяржаўнае і, нават, сусьветнае.

Шчыра скажу, вялікі вопыт я набыў і вялікую радасьць атрымаў ад гэтай паездкі за акіян.

Протаіерэй Георгій Латушка,
настаяцель Сьв. Петра-Паўлаўскага сабора г. Менска.

St. George Belarusan Orthodox Church
1500 NORTH MARLEWOOD AVENUE
CHICAGO, ILLINOIS 60622

25-га лістапада 93г.

Яго Высокапраасьвяшчшэнству
Патрыяршаму Экзарху Усяе Беларусі
Мітрапаліту Менскаму і Слуцкаму
ФІЛАРЭТУ:

ПАДЗЯКА

Настаяцель Беларускага Праваслаўнага Прыхода "Сьвятога Юрыя" ў Чыкага Архімандрыт Якаў, Царкоўная Управа Парафіі, як і ўсе, хто ў гэтай сьвятыні ўзносіць малітвы да Усемагутнага Бога, ветліва перасылаіць Вам, як Найвышэйшаму Пастару Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Рэспубліцы Беларусь - сардэчнае дзякуй, што із Вашага благаславенства наш Прыход у дыяспары духова аб"яднаўся із Беларускай Праваслаўнай Царквой у дзень сьвяткаваньня 35-ці гадовага юбілея 7-га лістапада 1993 г., малітвамі Сьвятой Літургіі, ў якіх із Вашага Благаславеньня разам маліўся а. Протоіерэй Юры Латушко — Настаяцель Сьвята Петра-Паўлаўскага Сабора г. Менска разам із Яго Праасьвяшчэнствам Япіскапам Іакавасам із Чыкагскай грэцкай дыяцэзыі і запрошаным кананічным духавенствам.

Старшыня Царкоўнай Управы — Сакратар Царкоўнай Управы

Александар Шышко — Мікалай Латушкін

/Александар Шышко/ — /Мікалай Латушкін/

ST. GEORGE BYELORUSSIAN ORTHODOX CHURCH OF CHICAGO

Епіскап Навагрудскі і Лідскі Канстанцін, рэктар Менскай Духоўнай Семінарыі (у міру Гаранаў Алег Аляксандравіч) нарадзіўся ў 1951 годзе ў Джамбульскай вобласці Казахстана. У 1974 годзе скончыў лячэбны факультэт Віньніцкага медыцынскага інстытута і на працягу 6 гадоў працаваў практыкуючым урачом. У 1981 годзе ў Смаленскім медыцынскім інстытуце абараніў кандыдатскую дысертацыю. Улетку 1983 года нёс паслушэнства ў Жыровіцкім манастыры і паступіў у Маскоўскую Духоўную Семінарыю, якую скончыў за 2 гады. На 1-м курсе МДА быў пастрыжаны ў манашаства і рукапакладзены ў іерадыякана, затым у іераманаха. Усе гады навучаньня ў Акадэміі быў патрыяршым стыпендыятам. Пасьля заканчэньня МДА у 1989 годзе прафесарскі стыпендыят і выкладчык. Абараніў кандыдацкую дысертацыю па багаслоўю на тэму: "Русская религиозно-философская антропология на рубеже XIX-XX ст. В. С. Соловьёв и В. И. Несмелов". З сакавіка 1990 года рэктар МінДС, выкладчык дагматычнага багаслоўя. 16 чэрвеня 1991 года ў дзень Беларускіх Сьвятых быў рукапакладзены ў епіскапа саборам архіерэеў на чале з Патрыярхам Алексіем II. З лютага 1992 года кіруе адроджанай Навагрудскай епархіяй.

Протаіерэй Георгій Латушка - нарадзіўся ў 1952 годзе ў г/п Лоеў Гомельскай вобласці ў сям'і святара. У 1969 годзе паступіў у Ленінградскі Тэхналагічны Інстытут. У 1973 годзе залічаны ў 2-і клас Ленінградскай Духоўнай Семінарыі, якую скончыў у 1975 годзе і паступіў у Ленінградскую Духоўную Акадэмію. Рукапакладзены ў сан дыякана ў 1974 годзе, у сан іерэя ў 1977 годзе. Па заканчэнні Духоўнай Акадэміі з 1979 года - святар Мінскага Св.-Духавага кафедральнага сабора; з 1985 года - настаяцель Св.-Анінскай царквы г. Стаўбцы; з 1989 года - святар Мінскага Св.-Духавага кафедральнага сабора; з 1991 года - настаяцель Мінскага Св.-Петра-Паўлаўскага сабора.

Алесь Анціпенка нарадзіўся ў 1953г. у г. Слаўгарадзе Магілёўскай вобл. Скончыў інстытут замежных моў, аспірантуру Інстытута філасофіі і права АН РБ. Кандыдат філасофскіх навук. Аўтар шэрагу навуковых артыкулаў па праблемах сацыяльнай экалогіі і нацыянальнай праблематыцы. Працуе каардынатарам праграмаў у Фондзе Сораса (Беларусь). Сябра Беларускага Праваслаўнага Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў.



Алесь Ляскоў нарадзіўся ў 1973 г. у г. Маладэчне. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Менску. У 1990 годзе паступіў на юрыдычны факультэт БДУ. Удзельнічае ў Беларускім Праваслаўным Брацтве Трох Віленскіх Мучанікаў з моманту заснаваньня. У паэзіі — выключна аматар.

Таццяна Процька нарадзілася ў 1951 годзе ў Мінску. Фізік па базавай адукацыі. Кандыдат філасофскіх навук, скончыла дактарантуру Інстытута гісторыі АНБ. Працуе старэйшым навук. супрацоўнікам Інстытута гісторыі АНБ, зьяўляецца вядучым рэдактарам Беларускай энцыклапедыі. Спецыяліст у галіне гісторыі савецкай Беларусі даваеннага часу, перыяду 1917-1941 гг.

Іван Чарота нарадзіўся ў 1952 годзе ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт БДУ, працаваў настаўнікам. З 1977 года - выкладчык БДУ. Спецыяліст у галіне русістыкі, славістыкі, міжславянскіх сувязяў. З 1975 года займаецца літаратурнай дзейнасцю як крытык і перакладчык. Укладальнік і перакладчык кніг "Анталогія беларускай паэзіі" (Белград, 1993 г.), "Анталогія сербскай паэзіі" (Мінск, 1987 г.). У перакладзе І. Чароты выйшлі кнігі пісьменнікаў Югаславіі Б. Нушыча, Й. Юрчыча, Б. Зупанчыча, Д. Янчара, Прэжыхава-Воранца, І. Андрыча.

На вялікі жаль наш часопіс не можа друкавацца з той перыядычнасьцю, як меркавала рэдакцыйная рада. Прычынай таму зьяўлялася адсутнасьць уласнай камп-утарнай выдавецкай тэхнікі. Але прыхільнікі і чытачы часопіса не пакінулі нас са сваёй бядою.

Дзякуючы ахвараваньням прыхаджанаў беларускага праваслаўнага прыхода Сьв. Юрыя з Чыкага мы ўжо набылі асобныя тэхнічна-выдавецкія сродкі і спадзяёмся прысьпешыць выпуск наступных нумароў.

Выказваем асаблівую ўдзячнасьць *за ахвяраваньні* шаноўным:

сп. Міхасю Каленіку (ЗША) — 70 $
сп. Алексу Сільвановічу (ЗША) — 50 $
сп. Мікалаю Латушкіну (ЗША) — 40 $
сп. Барысу Данілюку (ЗША) — 25 $
Кансісторыі БАПЦ
(юрысдыкцыя Мітрапаліта Мікалая) — 200 $
сп. Алегу Язьвіцкаму (Санкт-Пецярбург) — 40 тысяч расейскіх рублёў.

Вашыя сродкі не толькі павялічылі нашы выдавецкія магчымасьці, але і зьявіліся дзейсным унёскам у пашырэньне Слова Божага сярод праваслаўных вернікаў Баць-каўшчыны!

Ратуй Вас Гасподзь !

Дарагія суродзічы!

Па Волі Божай выйшаў чарговы нумар часопіса праваслаўных беларусаў.

Каб нашае выданьне стала трывалым і выканала сваю галоўную мэту: яднаньня беларусаў сьвету на грунъце нацыянальных каштоўнасьцяў і Сьвятой Праваслаўнай Царквы, нам неабходна дапамога.

Вашыя лісты, архіўныя матар'ялы і грашовыя ахвяраваньні складуць аснову і забясьпечаць будучыню часопіса.

Пішыце на адрас:

220050, Мінск-50, п/с 275 альбо:

220004, Мінск-4, Ракаўская 4, Сьв.Петра-Паўлаўскі сабор /Для Беларускага Праваслаўнага Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў/

Разьліковы рахунак для ахвяраў: рублёвы — 700403, валютны — 070845 у МА РКБ «Комплекс», код 734.

Гэты нумар часопіса надрукаваны за кошт фірмы ORTHDRUK з Беластока

Шчыра дзякуем і барані Госпадзе нашых фундатараў

У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ:

■ Епіскап Канстанцін (Гаранаў) "Лекцыі па дагматычным багаслоўі".

■ А. Брэскі (Расія). "Сьвяты прападобна-мучанік Афанасій Брэсцкі".

■ С. Куламзіна (ЗША). "Навука рэлігіі ў школе".

■ Небойша Мілуцінавіч Крсціч (Сербія). "Царква і дэмакратыя".

■ Я. Харкевіч (Польшча). "Рэлігійная думка Івана Кірыеўскага".

■ "Адозва да праваслаўных беларусаў 17 чэрвеня 1922 года".

Зьвяртаемся да ўсіх фінансава-камерцыйных арганізацый з прапановаю зьмясціць рэкламу вашай фірмы ў наступных нумарах часопіса.

Гэта будзе сьведчыць перадусім аб вашай прыхільнасьці далучыцца да ідэі адраджэньня духоўнай і гістарычнай сьвядомасьці нашага народа.

Беласток
ORTHDRUK